СТВАРАЛЬНАЯ СІЛА МАЛАДОСЦІ

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА павіншаваў юнакоў і дзяўчат краіны з Днём моладзі

«Сёння вы ўносіце прыкметны ўклад ва ўсе сферы жыцця грамадства, дабіваецеся поспехаў на вытворчасці і ў спорце, творчасці і навуцы. Таму невыпадкова гэты год аб'яўлены Годам моладзі, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Мы верым у стваральную сілу маладосці. Вашы энергія, працавітасць і талент — залог паспяховага развіцця нашай краіны».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што дзяржава са свайго боку дае магчымасць моладзі атрымаць адукацыю і асвоіць запатрабаваную прафесію, гарантуе рабочае месца кожнаму маладому спецыялісту, аказвае падтрымку адоранай моладзі.

«У роднай Беларусі вы можаце з упэўненасцю глядзець у будучыню, вашы здольнасці і веды абавязкова знойдуць прымяненне», — гаворыцца ў віншаванні.

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

27 ЧЭРВЕНЯ 2015 г. СУБОТА № 121 (27979) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

МЫ Ў ВАС ВЕРЫМ!

Дабрабыт, стабільнасць і мірнае існаванне нашай краіны знаходзяцца ў руках моладзі

Учора ў Мінску адбыўся Рэспубліканскі баль выпускнікоў вышэйшых навучальных устаноў, у якім прынялі ўдзел 253 выпускнікі з усіх рэгіёнаў краіны. Традыцыйна іх вітаў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы заклікаў маладых людзей звязваць сваю будучыню з Беларуссю. «Гэта я кажу, не таму што я Прэзідэнт. Гэта ваша зямля. Тут, на гэтай зямлі, вы заўсёды будзеце патрэбныя. Вы тут будзеце дома. Вы тут будзеце гаспадарамі. Вашы веды, навыкі і ініцыятыва абавязкова знойдуць прымяненне. Любіце сваю краіну, працуйце на яе карысць. Вы зможаце не толькі дасягнуць матэрыяльнага дастатку, але і заслужыць павагу сваіх землякоў — а гэта важней, чым грошы», — наказваў Прэзідэнт.

«Вы, маладыя, у адказе за нашу Беларусь. Яе дабрабыт, стабільнасць, мірнае існаванне — з сённяшняга дня ў вашых руках», — сказаў кіраўнік дзяржавы, звяртаючыся да выпускнікоў.

Прэзідэнт адзначыў, што для выпускнікоў вышэйшых навучальных устаноў наступіла адказная пара, калі ім трэба будзе на практыцы асвойваць выбраную прафесію, будаваць сям'ю, наладжваць самастойнае жыццё.

Маладыя людзі мелі магчымасць набыць самыя сучасныя веды і карысныя ўменні. Дзяржава паклапацілася аб тым, каб забяспечыць кожнага гарантаваным рабочым месцам, дадаў беларускі лідар. «Але атрыманне дыплома — толькі першы крок у станаўленні сапраўднага спецыяліста. Я спадзяюся, вы здолееце пранесці праз усё жыццё шчырую любоў да ведаў, цягу да самаадукацыі і павагу да сваіх настаўнікаў», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

На Рэспубліканскім балі выпускнікоў прысутнічалі лепшыя прадстаўнікі выкладчыцкага корпуса. «Педагог выконвае вельмі важную функцыю ў жыцці грамадства, ён фарміруе будучыню нацыі. І поспехі вашых вучняў сведчаць пра тое, што вы спраўляецеся з гэтай нялёгкай задачай», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што гэты год аб'яўлены Годам моладзі. «Гэта невыпадкова. Сёння ваша роля ва ўсіх сферах жыцця краіны значна ўзрастае. Вам ствараць будучыню», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да моладзі.

Хтосьці з выпускнікоў абярэ кар'еру на вытворчасці, хтосьці прысвеціць сябе навуцы, зоймецца бізнесам або ўнясе свой уклад у сістэму дзяржаўнага кіравання. «Мы зацікаўленыя ў вашым поспеху. Бо энергія і мэтанакіраванасць маладых — важны рэсурс у развіцці дзяржавы. Ваш поспех — гэта і наш поспех, — заўважыў Прэзідэнт.

Цяперашнія выпускнікі ўступаюць у дарослае жыццё ў няпросты для краіны перыяд. «Але гэта менавіта той час, калі асабліва запатрабаванымі становяцца высокі прафесіяналізм, маральныя прынцыпы і сур'ёзнае стаўленне да справы, — лічыць Аляксандр Лукашэнка. — Нідзе не паважаюць тых, хто працуе абы-як. Затое высока цэняцца працавітасць, адказнасць, здольнасць прапанаваць свежую ідэю, увасобіць яе ў жыццё».

Кіраўнік дзяржавы павіншаваў выпускнікоў з атрыманнем дыпломаў аб вышэйшай адукацыі. Затым Аляксандр Лукашэнка ўручыў лепшым выпускнікам і педагогам вышэйшых навучальных устаноў спецыяльныя лісты аб аб'яўленні Падзякі Прэзідэнта, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы.

Фота БЕЛТА.

ЦЫТАТА ДНЯ

Андрэй КАБЯКОЎ, прэм'ер-міністр Беларусі:

«Залогам поспеху любога прадпрыемства з'яўляецца калектыў аднадумцаў і спецыялістаў высокага ўзроўню, якія цудоўна валодаюць рынкам і з'яўляюцца патрыётамі сваёй арганізацыі, людзьмі, якія ўмеюць рабіць сваю справу. Можна ўкласці шмат грошай і пабудаваць самае сучаснае прадпрыемства, але калі там не складзецца калектыў і не будуць працаваць высакакласныя спецыялісты, нічога з гэтага не атрымаецца».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 27.06.2015 г.

Долар ЗША	15308,00	▼
Еўра	17165,00	▼
Рас. руб.	278,59	▼
Укр. грыўня	728,95	▲

■ Парламенцкі дзённік

БЮДЖЭТНЫ РАСКЛАД

Дэпутаты ўчора разгледзелі больш за 20 законапраектаў

Бюджэт дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва краіны за 2014 год выкананы з прафіцытам. Пра гэта паведаміла Марыяна ШЧОТКІНА, міністр працы і сацыяльнай абароны, прадстаўляючы праект закона «Аб зацвярджэнні справаздачы аб выкананні бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва». Падчас учарашняга пасяджэння Палаты прадстаўнікоў былі таксама заслуханы і зацверджаны справаздачы аб выкананні рэспубліканскага бюджэту за мінулы год, бюджэту Дэпартамента выканання пакаранняў і бюджэту грамадзянскай авіяцыі.

ПЕНСІІ З ПЛЮСАМ

Летась прафіцыт бюджэту фонду сацыяльнай абароны насельніцтва склаў звыш 220 мільярдаў рублёў. Па інфармацыі, агучанай Марыянай Шчоткінай, у мінулым годзе даходы бюджэту склалі 94,4 трыльёна рублёў, расходы — Br94,2 трлн. Згодна з раней зацверджаным бюджэтам гэтага фонду даходы разлічвалі атрымаць на суму ў 95 трыльёнаў рублёў, на расходы выдаткоўвалася 93,6 трыльёна.

У той жа час Марыяна Шчоткіна адзначыла, што Указам Прэзідэнта №611 былі ўдакладнены асобныя артыкулы бюджэту фонду. У выніку агульная сума даходаў не змянілася, а расходы павялічыліся на амаль 840 мільярдаў рублёў.

— Перш за ўсё — за кошт росту сум на выплаты пенсій, у сувязі з павышэннем іх памеру, — паведаміла міністр.

Марыяна Шчоткіна падкрэсліла, што фінансаванне ўсіх неабходных расходаў за кошт сродкаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання ў 2014 годзе забяспечана своечасова і ў поўным аб'ёме. Пры гэтым асноўная сума расходаў — гэта выдаткі на выплату пенсій, якія склалі фактычна 74 трыльёны рублёў — 78% ад усіх расходаў. Як нагадала міністр, летась пераразлікі пенсій у сувязі з ростам сярэдняй заработнай платы праводзіліся тройчы: з 1 лютага — на 5%, з 1 жніўня — на 7,5%, з 1 лістапада — на 5,5%.

ПРАФІЦЫТ СКЛАЎ BR5,4 ТРЛН

— За 2014 год у рэспубліканскі бюджэт паступіла 128,2 трыльёна рублёў даходаў, або 104,3% ад удакладненага гадавога плана, — паведаміў падчас прадстаўлення законапраекта «Аб зацвярджэнні справаздачы аб выкананні рэспубліканскага бюджэту за 2014 год» **міністр фінансаў Уладзімір АМАРЫН**. Расходы за мінулы год склалі амаль 123 трыльёны рублёў, або 97,9% ад запланаваных у гадавым плане. Прафіцыт склаў 5,4 трыльёна — 0,7% ВУП.

— Гэта перавышэнне даходаў над расходамі было накіравана на выкананне гарантый урада перад банкамі і пагашэнне часткі дзяржаўнага доўгу, — праінфармаваў Уладзімір Амарын.

Па словах міністра, бюджэт мінулага года фарміраваўся на падставе прагнозных параметраў сацыяльна-эканамічнага развіцця нашай краіны. Выкананне бюджэту здзяйснялася ў складаных знешнеэканамічных умовах, «якія аказалі негатыўны ўплыў на дасягненне асноўных паказчыкаў прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны».

— Больш нізкія ў параўнанні з закладзенымі пры фарміраванні бюджэту тэмпы росту ВУП, а таксама памяншэнне экспартнай цаны рэалізацыі калійных угнаенняў, аб'ёмаў і цэн імпарту тавараў у краіны Мытнага саюза, зніжэнне дзелавой актыўнасці ў краінах — гандлёвых партнёрах, дэвальвацыя расійскага рубля — усё гэта пацягнула за сабой скарачэнне даходаў і рост асобных расходаў бюджэту.

ЕАЭС СТАЎ «ПЯЦЁРКАЙ»

Учора дэпутаты ратыфікавалі Дагавор аб далучэнні Кыргызстана да Еўразійскага эканамічнага саюза. Як заўважыў у размове з журналістамі **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Віталь БУСЬКО**, значнасць і важнасць гэтага дакумента будзе ацэнена пазней гісторыкамі.

Па словах міністра, бюджэт мінулага года фарміраваўся на падставе прагнозных параметраў сацыяльна-эканамічнага развіцця нашай краіны. Выкананне бюджэту здзяйснялася ў складаных знешнеэканамічных умовах, «якія аказалі негатыўны ўплыў на дасягненне асноўных паказчыкаў прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны».

— Сёння можна сказаць, што гэты дакумент сапраўды мае вялікую значнасць, — заявіў дэпутат. — Дагавор аб Еўразійскім эканамічным саюзе быў падпісаны больш за год таму. Мы пачыналі ўтраіх, а сёння нас ужо пяцёра. Гэта сведчыць пра тое, што саюз жыццяздольны і сапраўды прыцягвае да сябе краіны былога Савецкага Саюза і цяперашняй Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Аднак я не думаю, што наша мэта — павелічэнне колькасці ўдзельнікаў. Варта пераходзіць да якасці. Першае, чаго чакаем мы ўсе, — гэта каб голас Еўразійскага саюза загучаў як голас суб'екта палітычнага і міжнароднага жыцця. Другое, не менш важнае, — хутка мы павінны атрымаць гандлёвую марку «Зроблена ў Еўразійскім эканамічным саюзе». Трэцяе, пра што пытаюць звычайныя выбаршчыкі ў дэпутатаў: што чалавек будзе мець ад гэтага саюза? Скажу, што саюз забяспечвае поўную свабоду перамяшчэння працоўнай сілы, паслуг, тавараў і капіталу. Ніякіх праблем не будзе з перамяшчэннем студэнтаў, навукоўцаў, спецыялістаў.

Надзея ЮШКЕВІЧ.
yushkevich@zviazda.by

■ Круглы стол

ВЫЙСЦЕ АДНО — ЦВЯРОЗАСЦЬ

У хранічнага алкагалізму ёсць дзве важныя прыкметы: хворы не можа кантраляваць колькасць выпітага, а напіўшыся, губляе кантроль над сабой. Хацеў выпіць «як усе», але спроба зноў правалілася, да таго ж, было зроблена шмат такога, чаго рабіць не варта... Як і любое захворванне, алкагалізм мае свае асаблівасці, але што тут пакутуе ў найбольшай ступені? Калі, на якім этапе алкаголік пачынае шукаць дапамогі? Як рэагаваць на такога хворага членам сям'і? Пра ўсё гэта разважаюць удзельнікі круглага стала — галоўны ўрач Мінскага гарадскога клінічнага наркалагічнага дыспансера Сяргей МАЛОЧКА, загадчык 21-га рэабілітацыйнага наркалагічнага аддзялення Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра псіхічнага здароўя, урач-псіхіятр Уладзімір ІВАНОЎ, доктар псіхалагічных навук, прафесар Уладзімір ЯНЧУК, прадстаўнік садружнасці «Ананімныя Алкаголікі Беларусі» АЛЯКСЕЙ, а таксама прадстаўніцы аб'яднання Ал-Анон — ВІКТОРЫЯ і ВОЛЬГА, якія пажадалі захаваць у тайне прозвішчы і твары.

СТАР. 5

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Памёр Яўген Прымакоў

Былы прэм'ер-міністр і кіраўнік МЗС Расіі Яўген Прымакоў памёр 26 чэрвеня ў Маскве на 86-м годзе жыцця пасля «працяглай хваробы». Прымакоў з 1991 па 1996 год узначальваў Службу знешняй разведкі Расіі, затым на працягу двух гадоў займаў пасаду міністра замежных спраў. У 1998—1999 гадах Прымакоў быў старшынёй урада, а з 2001 па 2011 год узначальваў Гандлёва-прамысловую палату. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста выказаў спачуванні ў сувязі са смерцю Яўгена Прымакова яго родным і блізкім, паведамілі ў прэс-службе кіраўніка беларускай дзяржавы.

Грэчаскі прэм'ер абвінаваціў крэдытораў у шантажы

Прэм'ер-міністр Грэцыі Алексіс Цыпрас накінуўся з крытыкай на крэдытораў краіны, заявіўшы, што «еўрапейскія прынцыпы не былі заснаваныя на шантажы і ўльтыматумах». Пра гэта паведамляе Reuters. Паводле яго слоў, грэчаскі ўрад будзе змагацца за ўзаемапавагу. Цыпрас і яго дэлегацыя адхілілі прапанову аб пяцімесячным прадаўжэнні цяперашняга пагаднення аб дапамозе. Прадстаўнікі дэлегацыі, якіх цытуе The Guardian, кажуць, што прапанаваны ім тэкст апынуўся менш спрыяльным, чым апублікаваны раней мемарандум. Акрамя таго, адзначаецца, што сродкі, якія маглі выдзеліць Афінам, былі недастатковымі для пакрыцця ўсіх патрэб краіны.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Тэракт каля Грэнобля

Французскія СМІ апублікавалі падрабязнасці тэракта на хімічным заводзе непадалёк ад Грэнобля, падчас якога загінуў адзін чалавек і некалькі атрымалі раненні. Нападзенне адбылося ў пятніцу, 26 чэрвеня, а 10-й гадзіне раніцы па мясцовым часе. Вядома пра аднаго загінулага, яшчэ некалькі чалавек атрымалі раненні. Па звестках паліцыі, усяго ў нападзе ўдзельнічалі мінімум два чалавекі, адзін з якіх трымаў сцяг «Ісламскай дзяржавы», — яны накіравалі аўтамабіль прама ў кантэйнер з газам. Пасля тэракта каля заводскіх варот была знойдзена адсечаная галава, пакрытая арабскімі надпісамі, і цела — таксама спісанае арабскімі пісьмёнамі. Пакуль невядома, адсеклі загінуламу галаву загадзя або яе адарвала выбухам. На дадзены момант вядома пра двух затрыманых падазраваных. Пажар, які пачаўся на хімзаводзе, лакалізаваны, пагрозы выкіду атрутных газаў няма.

КАРОТКА

Урад Рэспублікі Хакасія выказаў Беларусі ўдзячнасць за дапамогу пацярпелым ад пажараў рэгіёнам. Гуманітарны груз з Беларусі прыбыў у Хакасію ў чэрвені. Больш як 30 тон мэблі, прадуктаў харчавання, адзення, былі дастаўлены чыгуначным транспартам.

Сярэдняя зарплата ў сферы IT-тэхналогій у Мінску ў студзені—маі гэтага года склала Br26 млн 852,5 тыс., у тым ліку ў маі — Br26 млн 135,1 тыс.

Першая ў Мінску бальніца сястрынскага догляду, разлічаная на 60 месцаў, адкрыецца 2 ліпеня непадалёку ад 3-й гарадской клінічнай бальніцы імя Я.У. Клумава. Шпіталізаваць сюды будуць пацыентаў, маючых патрэбу ў пастаяннным сацыяльным і медыцынскім доглядзе.

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

«І ТРАДЫЦЫІ ЗАХОЎВАЕЦЕ, І АД ЧАСУ НЕ АДСТАЯЦЕ!»

Наталля СЕЎРУКОВА, старшы памочнік пракурора Віцебскай вобласці:

За што я люблю «Звязду»? Па-першае, за тое, што яна выходзіць на роднай мове. Мы, беларусы, абавязаны з павагай ставіцца да роднай мовы, да гісторыі краіны. У «Звяздзе», дарэчы, шмат мовазнаўчых, краязнаўчых артыкулаў, рэпартажаў з розных фестываляў з удзелам самадзейных калектываў, талентаў, як кажуць, ад «зямлі».

Нарадзілася я ў Віцебску, але ўсё дзяцінства і юнацтва правяла ў Глыбоцкім раёне. Таму з асаблівым задавальненнем чытаю матэрыялы пра заходнія раёны Віцебшчыны: Глыбоцкі, Пастаўскі і іншыя, якіх няхай і не ведаю асабіста, але чула пра іх. Ёсць магчымасць па-новаму ацаніць прыгажосць беларускай глыбінкі, з'яўляецца нагода для гонару за сваіх землякоў. І бацькі мае, якія жывуць у Глыбокім, — прыхільнікі вашай газеты...

Зразумела, пра іншыя таксама прачытаць цікава: пра тое, як адраджаюць помнікі архітэктуры, пра рамеснікаў, кухараў, якія ўмеюць гатаваць традыцыйныя беларускія стравы.

«Звязда» дазваляе мне быць у курсе галоўных падзей, што адбываюцца ў Беларусі і за яе межамі. З задавальненнем супрацоўнічаю з журналістамі «Звязды», якія стараюцца падаць інфармацыю так, каб яна была зразумелай нават людзям, далёкім ад тэмы аховы права. Разам такім чынам займаемся прафілактычнай справай.

«Звязда» 5 разоў на тыдзень інфармуе, часам здзіўляючы нестандартным поглядам на тое, пра што ўжо пісалі іншыя газеты. Ведаю, што і некаторыя мае калегі таксама выпісваюць «Звязду». Упэўнена, што і далей найстарэйшая рэспубліканская беларускамоўная газета будзе захоўваць свае традыцыі і паралельна не адставаць ад часу. Шчыра раю выпісваць «Звязду» іншым.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
pukshanski@zviazda.by

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

5 разоў на тыдзень!

Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.

Падпісацца на «Звязду» можна заўсёды!

■ Парламенцкі дзённік

ТУРКМЕНСКАЯ СОЛЬ З БЕЛАРУСКІМ «ПРЫСМАКАМ»

Першая прадукцыя Гарлыкскага горна-абагачальнага камбіната выйдзе ў верасні

Нашы дэпутаты вельмі цэняць стасункі, што склаліся з Туркменістанам. Пра гэта заявіў старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА падчас сустрэчы з новым паслом Туркменістана ў нашай краіне Назаркулы ШАКУЛЫЕВЫМ.

— Безумоўна, мы збіраемся і далей развіваць гэтае супрацоўніцтва, — запэўніў спікер ніжняй палаты. — Думаю, што ў нашых адносін — вялікая будучыня.

Як адзначыў Уладзімір Андрэйчанка, Туркменістан — важны партнёр нашай краіны ў Цэнтральнай Азіі.

— У нас дастаткова прадукцыйна працуе рабочая група па супрацоўніцтве з парламентарыямі Туркменістана. Узначальвае яе Аляксандр Сягоднік, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры, навуцы. Ён правёў ужо некалькі пасяджэнняў, а члены рабочай групы пастаянна прымаюць удзел у працы міжурадавай камісіі па эканамічным супрацоўніцтве Беларусі і Туркменістана.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў заўважыў, што ў гандлёва-эканамічным вымярэнні вельмі важным з'яўляецца праект па будаўніцтве Гарлыкскага горна-абагачальнага камбіната па вытворчасці калійных угнаенняў. Першая яго прадукцыя, і пасол Туркменістана пацвердзіў гэту інфармацыю, будзе выпушчана ўжо праз пару месяцаў — у верасні.

Нагадаем, што ў студзені 2010 года адкрытае акцыянернае таварыства «Белгархімпрам» падпісала з дзяржаўным канцэрнам «Туркменхімія» кантракт на будаўніцтва беларускімі спецыялістамі Гарлыкскага горна-абагачальнага камбіната па выпуску калійных угнаенняў. Магутнасць яго — 1,4 млн тон у год на базе. Гэта самы маштабны наш праект у Туркменістане. Камбінат будуецца на базе Гарлыкскага радовішча калійных соляў у Лебапскім велаяце (вобласці). Асноўныя работы былі пачаты ў 2012 годзе.

— Гэта прыклад нашай кааперацыі ў прамысловасці, — падкрэсліў Уладзімір Андрэйчанка. — Натуральна, ёсць шмат шляхоў, па якіх бы хацелася пачынаць узаемадзеянне ў гандлі. Ведаю, што сёння перамовы вядзе канцэрн «Беллегпрам» па стварэнні сумеснай вытворчасці баваўнянай пражы.

Надзея ЮШКЕВІЧ. *yushkevich@zviazda.by*

■

У МІНСКУ — МОШЧЫ СВЯТОГА УЛАДЗІМІРА

Жыхары беларускай сталіцы змогуць пакланіцца мошчам святога роўнаапостальнага вялікага князя Уладзіміра з 27 чэрвеня па 1 ліпеня. Святыню, якая дагэтуль была ў Гродне, прывязуць у Мінскі Свята-Духаў кафедральны сабор.

Арганізатары звяртаюць увагу на час наведвання. У суботу, 27 чэрвеня, гэта можна зрабіць у 20.00, адразу пасля ўсяночнага трывання, і да 23.00. У нядзелю — з 6 да 9 раніцы і пасля перапынку на Божую літургію — з 12 гадзін дня і да 11 вечара. У панядзелак ды аўторак 29 і 30 чэрвеня пакланіцца мошчам можна з 7.00 да 23.00. У сераду — з 7.00 да 14.00. Пасля гэтага каўчэг адправіцца ў Магілёў, дзе прабудзе да 4 ліпеня, затым у Віцебск — па 7 ліпеня.

Святы Уладзімір — князь, які звярнуў Русь у праваслаўную веру. Ён жыў і правіў на мяжы X-XI стагоддзяў. З 978 года і да смерці ў 1015-м княжыў у Кіеве, сталіцы Кіеўскай Русі. У 988 годзе па ініцыятыве князя Уладзіміра хрысціянства стала ў Кіеўскай Русі дзяржаўнай рэлігіяй. Хрышчэнне Русі стала паваротнай падзеяй гісторыі ўсходняга славянства. Так, разам з хрысціянізацыяй на Русі шырока распаўсюдзілася пісьменнасць, сталі імкліва развівацца мастацтва, архітэктура і літаратура. Праз шматлікія дынастычныя шлюбы нашчадкаў святога Уладзіміра Русь увайшла ў агульнаеўрапейскую прастору.

У беларускай гісторыі, у адрозненне ад рускай, гэтая асоба ўспрымаецца неадназначна. Беларус, пачуўшы імя князя Уладзіміра, адразу ўзгадае вядомую са школьных часоў гісторыю яго і Рагнеды, полацкай князёўны, закаханай у Яраполка, што было недаспадобы князю Наўгародскаму. Уладзімір напаў на Полацк, забіў саперніка і ўсю сям'ю Рагнеды, прымусова зрабіўшы яе сваёй жонкай. Аляксандр Гронскі, сакратар вучонага савета Мінскай духоўнай акадэміі імя святога Кірылы Тураўскага, лічыць, што весткі да нашага часу дайшлі не зусім дакладныя, бо гісторыя ператварылася ў легенду:

— Трэба ўлічваць, што ў гэту гісторыю прыўнесена даволі шмат мастацкага вымыслу і эмоцый. Дакладна вядомыя факты з яе — тое, што Уладзімір узяў Полацк і ажаніўся з Рагнедай. Размежаваць першае і другое даволі складана. Па вялікім рахунку, князёўна хацела стаць жонкай вялікага князя Кіеўскага. Так і атрымалася. Толькі замест Яраполка пабралася шлюбам з Уладзімірам.

— А як растлумачыць тое, што чалавек, які не заўжды па-хрысціянску сябе паводзіў, стаў кананізаваным святым?

— Паняцце гуманнасці сённяшняе і тагачаснае паганскае моцна адрозніваюцца. Акрамя таго, гісторыя з Рагнедай адбылася яшчэ да прыняцця хрышчэння Уладзімірам. А калі ён стаў хрысціянінам, яго ўчынкі сапраўды сталі больш міласэрнымі і маральнымі. Напрыклад, ён адмовіўся ад некалькіх жонак, пакінуў толькі адну, а астатніх адправіў у манастыр. Рагнеда, якая хацела забіць правіцеля Русі, не была пакарана смерцю, хоць такое злачынства лічылца дзяржаўнай здрадай і вартае самых жорсткіх мер. Для таго язычніцкага часу гэта ўжо нямала.

Вераніка ПУСТАВІТ. *pustavit@zviazda.by*

ПРЫРОДА ПАТРАБУЕ КОМПЛЕКСНАГА ПАДЫХОДУ

Павелічэнне прыбытковасці і эфектыўнасці выкарыстання прыродных рэсурсаў павінна стаць адным з галоўных напрамкаў дзейнасці Мінпрыроды

Як адзначыў намеснік прэм'ер-міністра Анатоль Калінін падчас прадстаўлення калектыву Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя новага кіраўніка ведамства Андрэя Каўхуты, устойлівае развіццё эканомікі Беларусі немагчымае без збалансаванага выкарыстання і ўзнаўлення мінеральна-сыравінных рэсурсаў, якія з'яўляюцца асновай матэрыяльнай вытворчасці і нацыянальнай бяспекі.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

— Ад міністэрства, яго новага кіраўніка ўрад чакае больш эфектыўнай работы ў вобласці забеспячэння экалагічнай бяспекі, аховы навакольнага асяроддзя і рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў, у тым ліку і нетраў, прарыўных тэхналогій у пошуках новых радовішчаў і карысных выкапняў у мэтах забеспячэння ўстойлівага развіцця краіны і павышэння дабрабыту насельніцтва, — адзначыў Анатоль Калінін.

Па словах новага міністра, галоўнай мэтай дзейнасці Мінпрыроды была і застаецца ахова навакольнага асяроддзя, жывёльнага і расліннага свету. Але разам з тым трэба рабіць упор і на рацыянальнае і комплекснае выкарыстанне прыродных рэсурсаў, уключаючы мінеральна-сыравінныя, што прыносіла б не толькі экалагічны эфект, але і эканамічную выгаду.

— Эканамічны падыход, вывучэнне і аналіз эканамічных фактараў, эканоміка мінеральнай сыравіны і эканоміка прыродакарыстання павінны быць у аснове дзейнасці міністэрства, — упэўнены Андрэй Каўхута. — На гэта накіраваны і новыя задачы — павелічэнне прыбытковасці выкарыстання прыродных рэсурсаў, уключаючы мінеральна-сыравінныя, рост валютнай выручкі за кошт экспарту геалагічных паслуг і прыцягненне ў Беларусь замежных інвестыцый, у тым ліку і ў засваенне радовішчаў карысных выкапняў.

Для вырашэння задач, пастаўленых перад міністэрствам урадам, у краіне неабходна стварыць геалагічную службу. Яна дасць магчымасць зрабіць аналіз наяўнай мінеральна-сыравіннай базы, ацаніць існуючыя запасы і прафесійна, на высокім узроўні праводзіць геолага-разведачныя работы, атрымліваючы новую інфармацыю і адкрываючы новыя радовішчы карысных выкапняў.

Сярод асноўных кірункаў дзейнасці Андрэя Каўхута таксама назваў упарадкаванне структуры прыродаахоўнага ведамства, кардынацыя дзейнасці Мінпрыроды з іншымі міністэрствамі і ведамствамі, удасканаленне заканадаўства ў вобласці вывучэння, выкарыстання і аховы нетраў, развіццё міжнароднага супрацоўніцтва, удасканаленне сістэмы маніторынгу стану навакольнага асяроддзя шляхам аўтаматызацыі збору, апрацоўкі інфармацыі, развіццё гідраметэаралагічнай службы.

Асобна спыніўся міністр на пытанні мадэрнізацыі сістэмы збору адходаў. Па яго словах, другасная сыравіна таксама з'яўляецца важным рэсурсам, які можна і трэба выкарыстоўваць з эканамічнай выгадай для дзяржавы.

— Задач шмат, але, думаю, усе праблемы, якія стаяць перад ведамствам, мы зможам вырашыць, — падкрэсліў Андрэй Каўхута.

Вераніка КОЛАСАВА. *kolasava@zviazda.by*

«Дукорскі маёнтак» з перавернутым домам

Прыватныя інвестыцыі ў аднаўленне гістарычнай спадчыны і адраджэнне вёскі сёння з'яўляюцца вельмі важнымі. Аб гэтым заявіў першы віцэ-прэзідэнт НАК, памочнік Прэзідэнта Беларусі па пытаннях фізкультуры, спорту і развіцця турызму Максім РЫЖАНКОЎ на адкрыцці новага гістарычнага сядзібна-паркавага комплексу «Дукорскі маёнтак» у вёсцы Дукора Пухавіцкага раёна.

Фота БЕЛТА.

Максім Рыжанкоў падкрэсліў, што Беларусь багатая на гістарычныя і культурныя падзеі, але, на жаль, наша краіна вельмі шмат страціла ў гады войнаў і ліхалецця. Таму надзвычай важны кожны крок па аднаўленні гістарычнай спадчыны. «Мы павінны ведаць сваю гісторыю і тых, хто яе ствараў, — адзначыў ён. — Менавіта таму патрэбны такія ініцыятывы, калі прыватны бізнес укладвае сродкі ў беларускую гісторыю, у такія праекты, як «Дукорскі маёнтак».

Ён лічыць вельмі важнай ініцыятыву генеральнага дырэктара ЗАТ «Пухавіцкі аграпрадукт» Івана Гумоўскага, які і стварыў комплекс «Дукорскі маёнтак». «Калі б кожны бізнесмен зрабіў нешта падобнае і прысвяціў новы аб'ект пэўнай старонцы нашай гісторыі, гэта дапамагала б будучым пакаленням у пазнанні гісторыі краіны. Стварэнне такіх аб'ектаў — адказ на пытанне тым еўрапейцам і тым замежным прадстаўнікам, якія пытаюцца — адкуль мы, адкуль наша беларуская гісторыя і самабытнасць. І стаіць задача садзейнічаць папулярызацыі беларускай культуры і гісторыі», — сказаў Максім Рыжанкоў.

У сваю чаргу старшыня Пухавіцкага райвыканкама Фёдар Караленя адзначыў, што «Дукорскі маёнтак» — гэта ўзор умелага гаспадарання на зямлі і адраджэнне гісторыі беларускіх вёсак.

Аліна ГРЫШКЕВІЧ, БелТА.

■ Тры пытанні да ўлады

ЕЎРАПЕЙСКІЯ ПАЧАСТУНКІ НА МЁРСКІМ ПАЎВОСТРАВЕ

У Мёрах упершыню пройдзе кулінарны фестываль «Еўрапейскія прысмакі». З гэтай нагоды нашы пытанні намесніку старшыні Мёрскага райвыканкама Таццяне СТАЛЬМАЧОНАК.

— Калі чакаеце гасцей і ўдзельнікаў фэсту і дзе пройдуць яго асноўныя падзеі?

— Свята «Еўрапейскія прысмакі» праходзіць спачатку ў Мёрскім раёне — 27 чэрвеня, а потым — 3 ліпеня ў Рагачове Гомельскай вобласці. Ён праводзіцца па ініцыятыве Прадстаўніцтва Еўрапейскага саюза ў Беларусі. Мёрскі райвыканкам — адзін з арганізатараў мерапрыемства. У нашым райцэнтры пляцоўкай правядзення фестывалю стане маляўнічы паўвостраў Мёрскага возера.

— Што цікавае абяцаюць арганізатары?

— У праграме запланаваны кулінарныя майстар-класы ад вядомага эксперта па еўрапейскай кухні Аляксандра Чыкілеўскага. У яго павучыцца кухарыць змогуць усе ахвотныя. Выказалі жаданне прадэманстраваць майстэрства прыгатавання страў супрацоўнікі французскага пасольства ў Беларусі, удзельнікі Еўрапейскай сеткі рэгіянальнай кулінарнай спадчыны з Латгаліі (Усходняя Латвія)... Дарэчы, латышы не толькі пачастуюць удзельнікаў свята сваімі нацыянальнымі пачастункамі, але і навучаць рабіць сапраўдны латгальскі сыр. А гаспадары аграсядзіб — удзельнікі праекта Bella Cuisine — прадставяць свае фірменныя стравы... На фестывалі таксама пройдуць дэгустацыі прадукцыі прадпрыемстваў харчовай прамысловасці. Будзе працаваць «Горад майстроў». Па папярэдняй інфармацыі, фэст збярэ больш як 300 удзельнікаў.

— Таццяна Алегаўна, наколькі мне вядома, сапраўдным турыстычным брэндам Мёршчыны стаў знакаміты фэст «Жураўлі і журавіны Мёрскага краю».

— Так, гэта свята праводзіцца, пачынаючы з 2012 года, у верасні. Месца і час правядзення насамрэч незвычайнага фестывалю выбраны нездарма. Менавіта ў пачатку восені пачынаецца сезон збору журавін, а па запасах гэтых ягад мясцовае балота Ельня займае першае месца ў Беларусі. Акрамя гэтага, менавіта на Мёршчыне штогод можна назіраць больш за 4000 шэрых жураўлёў і дзясяткі тысяч гусей розных відаў. Птушкі спыняюцца на адпачынак на балоце Ельня падчас восеньскай міграцыі. Для турыстаў арганізуецца бясплатная дастаўка на аўтобусе з райцэнтра на навакольныя палі, дзе птушкі сілкуюцца ў светлы час сутак. За гады правядзення фестывалю ахвотныя змаглі пабачыць за вялікай колькасцю шэрых жураўлёў і зрабіць незабыўныя здымкі. Экскурсіі праводзілі прафесійныя арнітолагі.

Госці фестывалю таксама ўдзельнічаюць у экалагічных гульнях. Па добрай традыцыі вызначаюць найлепшую сядзібу Мёрскага раёна ў намінацыі «Багацце Ельні на нашым падворы». Ёсць магчымасць купіць на памяць аб святе сувеніры, зробленыя рукамі мясцовых майстроў. Многія турысты ахвотна набываюць журавінавы морс, розныя прысмакі з журавін, а яшчэ купляюць гэтыя ягады ў запас на зіму.

Аляксандр ПУКШАНСКІ. *pukshanski@zviazda.by*

■

У МАСКВУ — СЕМ РАЗОЎ НА ДЗЕНЬ

Авіякампанія «Белавія» павялічвае частату палётаў паміж Мінскам і Масквой.

З 24 жніўня яна будзе ажыццяўляць палёты па маршруце Мінск — Масква (Дамадзедава) — Мінск сем разоў на дзень. Выкананне палётаў запланавана ў дзённы час на самалётах Boeing 737-500 у двухкласнай кампаноўцы, паведамілі ў прэс-службе авіякампаніі.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

ПРАФСАЮЗ ДЛЯ МОЛАДЗІ

У штаб-кватэры Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі адбылося першае пасяджэнне Маладзёжнага савета ФПБ.

Маладзёжны савет быў створаны па ініцыятыве Федэрацыі прафсаюзаў 15 мая 2015 года. У яго склад увайшлі 43 прадстаўнікі пярвічных прафсаюзных арганізацый найбуйнейшых прадпрыемстваў, вышэйшых, сярэдніх спецыяльных і прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў краіны.

Як адзначыў **старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Міхаіл ОРДА**, неабходнасць у яго стварэнні наспела даўно. «Давайце будзем сумленнымі: калі ў пакаленні 40+ прафсаюз — у большасці сваёй абавязковы атрыбут прафесійнай дзейнасці, то для маладых людзей наша праца не зусім зразумелая, а значыць, і не зусім блізкая», — сказаў ён, адкрываючы першае пасяджэнне Маладзёжнага савета ФПБ.

Старшыня ФПБ адзначыў, што для прафсаюзаў ініцыятыўнасць і энтузіязм маладых людзей — неацэнныя, і галоўнае — не растраціць марна іх каласальную энергію, засяродзіць яе ў правільным кірунку.

Маладзёжны савет ФПБ будзе прадстаўляць інтарэсы каля 2 мільёнаў чалавек. Яго старшынёй абраны Арцём Ігнаценка.

Святлана БУСЬКО. *busko@zviazda.by*

ЛЯСЫ «ЎЗДЫХАЮЦЬ» З ПАЛЁГКАЙ

Забарона на наведванне лясоў знята ў Мядзельскім, Валожынскім, Веткаўскім, Свіслацкім, Бераставіцкім, Смаргонскім і Ашмянскім раёнах.

Як растлумачылі ў прэс-службе Міністэрства лясной гаспадаркі, парадак зняцця забароны, у адпаведнасці з Правіламі пажарнай бяспекі ў лясах, юрыдычныя асобы, што вядуць лясную гаспадарку, маюць права «пры неабходнасці ўносіць прадстаўленні мясцовым выканаўчым і распарадчым органам аб прыняцці абмежаванняў ці забароны на знаходжанне ў лясах». Гэта значыць, пры ўстанаўленні высокай і надзвычайнай рызыкі гарэння лясоў па ўмовах надвор'я лясгасамі ўносяцца ў раённыя выканаўчыя камітэты прапановы аб увядзенні забароны на наведванне ўгоддзяў. У адказ райвыканкамы прымаюць адпаведныя рашэнні або распараджэнні аб увядзенні забароны на знаходжанне ў лясах на тэрыторыі адміністрацыйнай адзінкі (раёна).

Забарона ўводзіцца толькі на час, пакуль устанавілася высокая або надзвычайная пажарная небяспека ў лясах. Як толькі пачынаюць ісці дажджы, спадае анамальная высокая тэмпература, забароны здымаюцца. Працэдура зняцця забароны на наведванне лясоў аналагічная прыняццю забароны: рашэнне раённага выканаўчага камітэта.

Для атрымання інфармацыі адносна наведвання лясоў у канкрэтным раёне неабходна звяртацца ў адпаведны лясгас ці раённы выканаўчы камітэт.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

СВЯТА ДЛЯ ДУШЫ

Сёння ў Магілёве прагучаць апошнія акорды XXI Міжнароднага фестывалю духоўнай музыкі «Магутны Божа».

Амаль тыдзень Магілёў жыў падзеямі гэтага форуму. Тысячы жыхароў горада і яго гасцей пабывалі на канцэртах хрысціянскіх груп, вакальных і харавых калектываў з розных краін свету, наведалі выставы, кірмашы, семінары. Сёлета гасцямі форуму сталі 20 краін, удзел у яго мерапрыемствах прымалі звыш 500 чалавек. Апафеозам свята стаў вялікі гала-канцэрт на стадыёне «Спартак». Падчас яго ўдзельнікі выпусцілі ў вячэрняе неба белых галубоў — як сімвал міру і дабра.

— У Беларусі шмат фестываляў, але гэты не падобны да іншых тым, што праходзіць у атмасферы асаблівай дабрыні і сардэчнасці, — адзначыў **намеснік міністра культуры Беларусі Васіль ЧЭРНІК**. — Гэты фестываль вельмі значны ў плане выхавання падрастаючага пакалення і своеасаблівы па праграме правядзення. Тут няма пампезнага адкрыцця, нейкага залішняга афіцыёзу, ён вельмі душэўны. Калі я працаваў саветнікам пасла Беларусі ў Польшчы, штогод ездзіў у Гайнаўку, дзе праходзіць фестываль царкоўнай музыкі. Добра, што ў нас таксама ёсць такі вельмі патрэбны кожнаму чалавеку форум, на які ахвотна едуць прафесійныя калектывы.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

ТРАЙНАЯ СТРАТА

У Сенненскім раёне патанулі сёстры і іх стрыечны брат.

— А сёмай гадзіне вечара 25 чэрвеня мама сясцёр адправілася іх шукаць. Жанчына, падышоўшы да вадаёма, убачыла літаральна за метр ад берага цела старэйшай дачкі. Пачала клікаць на дапамогу. Тутэйшы чалавек падбег і выцягнуў цела на бераг, выклікаў «хуткую дапамогу», выратавальную службу, — паведаміла «Звяздзе» **прэс-сакратар Віцебскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях Марына ФАНДО**.

Высветлілася, што ўдзень сёстры, 2004 і 2006 гадоў нараджэння, мясцовыя жыхаркі, і іх стрыечны брат, 2003 года нараджэння, вучань Лужаснянскай базавай школы Віцебскага раёна, гулялі каля вадаёма. Людзі іх бачылі падчас катання на самаробным плыце.

Работнікі МНС, якія прыбылі на месца здарэння, і мясцовыя жыхары, узяўшыся за рукі, шукалі патанулых, абследуючы нагамі дно вадаёма. На адлегласці каля 7 метраў ад берага знайшлі целы.

У службе выратавання нагадалі, што адказнасць дарослых за дзяцей летам узрастае шматкроць. Бацькі павінны ведаць, чым займаецца дзіця, дзе і з кім гуляе. Дзецям пастаянна трэба расказваць пра тое, як не трапіць у бяду.

Аляксандр ПУКШАНСКІ. *pukshanski@zviazda.by*

ДЗІЦЯ ПАМЕРЛА Ў РЭАНІМАЦЫІ

У рэанімацыі Брэсцкай абласной дзіцячай бальніцы памерла дзяўчынка, якая два тыдні таму пацярпела ў Кобрынскім аквапарку.

Няшчасце здарылася 12 чэрвеня. У аквапарку адпачывалі вучні адной з сельскіх школ Драгічынскага раёна. Вучаніца другога класа пайшла пад ваду ў басейне. Побач нікога з дарослых не аказалася. І дзяўчынку дастаў наведвальнік парка, які адпачываў са сваімі дзецьмі. «Хуткая дапамога» даставіла пацярпелую ў Брэст. Медыкі абласной бальніцы змагаліся за жыццё дзіцяці, якое ўвесь гэты час было ў крайне цяжкім стане. У пятніцу ў бальніцы паведамілі, што дзяўчынка памерла.

У дачыненні да дзвюх настаўніц, якія суправаджалі групу, заведзена крымінальная справа.

Святлана ЯСКЕВІЧ. *yackevich@zviazda.by*

■ У дарослае жыццё

«ЗОРКІ» ФАКУЛЬТЭТАЎ

БДУ павіншаваў сваіх найлепшых выпускнікоў

Пакуль абітурыенты праводзяць дні ў нервовым чаканні вынікаў цэнтралізаванага тэсціравання, студэнты апошніх курсаў ВНУ ладзяць развітальныя балі. Паспяховае заканчэнне альма-матар ужо адзначылі выпускнікі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. На імпрэзу ў Ліцэй БДУ запрасілі каля 600 чалавек — толькі самых лепшых прадстаўнікоў факультэтаў, актывістаў спартыўнага, навуковага, культурнага і грамадскага жыцця.

І разумныя, і прыгожыя.

Ганаровае званне «Найлепшы выпускнік БДУ» атрымалі дваццаць юнакоў і дзяўчат. Заслугі кожнага з іх можна пералічваць доўга. Напрыклад, **Аляксандра ШКОДА з факультэта міжнародных адносін** з'яўляецца лаўрэатам прэміі Спецыяльнага фонду Прэзідэнта па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў, прэміі Мінгарвыканкама, была старшынёй Савета старастаў факультэта і членам Навуковага савета.

— Некалькі гадоў я працавала на міжнародным праекце ў якасці перакладчыцы і арганізатара, праходзіла практыку ў Міністэрстве замежных спраў, — расказвае Аляксандра. — Увогуле на ФМА вельмі цікавае і насычанае студэнцкае жыццё. Часта адбываюцца сустрэчы з прадстаўнікамі палітычнага істэблішменту як нашай дзяржавы, так і іншых краін. Пакуль я хачу працягнуць навучанне ва ўніверсітэце, застаюся ў магістратуры.

Уступныя іспыты ў магістратуру праз два тыдні чакаюць і сёлетняга найлепшага **выпускніка фізічнага факультэта Паўла ЛАБАЦЭВІЧА**. Хлопец сціпла адзначае, што сярод яго сакурснікаў шмат годных, але і свае асабістыя студэнцкія дасягненні не прымяншае. Выдатнік Павел (яго сярэдні бал ва ўніверсітэце — 9,7) узначальваў студэнцкі савет па якасці адукацыі БДУ, удзельнічаў у розных навуковых праектах і канферэнцыях. Апошні свой даклад юнак прадставіў на 10-м беларуска-расійскім семінары «Паўправадніковыя лазеры і сістэмы на іх аснове». Пасля магістратуры малады фізік збіраецца ў аспірантуру: хоча займацца навукай і распрацоўваць інавацыйныя лазерныя сістэмы, якія потым можна было б выкарыстоўваць, напрыклад, у медыцыне, для барацьбы з ракам.

«Студэнцкімі лідарамі» сталі 23 выпускнікі. Адну з універсітэцкіх «зорак», **Юлію ПАГОСАВУ (філалагічны факультэт)**, мы заспелі адразу пасля выступу на сцэне. У студэнцкім асяроддзі дзяўчына вядомая як арганізатарка Каляднага дабрачыннага балю на філфаку, пераможца Фестывалю эстрады БДУ ў 2013 годзе, удзельніца тэлепраекта «Акадэмія талентаў». «Буду, вядома, сумаваць па такім насычаным творчым жыцці, — прызнаецца Юлія. — Спадзяюся, што паралельна з асноўнай працай змагу працягваць спяваць».

Усіх, хто прыйшоў на выпускны баль, чакаў парад дэканаў у мантыях і канфедэратках (потым у калідорах ліцэя шустрыя студэнты паспелі прымераць святочны ўбор кіраўніцтва і зрабіць фота на памяць) і творчы канцэрт (павіншаваць моладзь, дарэчы, прыехаў спявак Юзары).

— На ўніверсітэцкі выпускны запрашаюцца толькі самыя лепшыя, каля 20 чалавек з факультэта, — не шкадуе кампліментаў **рэктар БДУ Сяргей АБЛАМЕЙКА**. — Узнагароджваем студэнтаў, якія адпрацавалі гэтыя пяць гадоў з поўнай аддачай. Мы іх вучылі, выхоўвалі, перадавалі вопыт. Стараемся сачыць за далейшым лёсам нашых «дзяцей», запрашаем іх і праз пяць, і праз дзесяць гадоў пасля заканчэння ўніверсітэта. Заўсёды жадаю выпускнікам поспехаў. І на працы, і ў сям'і».

Каманда найлепшых з Дзяржаўнага інстытута кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ. *lubneuskaya@zviazda.by*
Фота аўтара і Надзеі БУЖАН

■

УНП 100005688

Учреждение образования
«Белорусская государственная академия авиации»
ОБЪЯВЛЯЕТ КОНКУРС
НА ЗАМЕЩЕНИЕ ВАКАНТНЫХ ДОЛЖНОСТЕЙ ПО КАФЕДРАМ:

Кафедра «Естественнонаучные дисциплины»:
заведующий кафедрой – 1, доцент – 5,
старший преподаватель – 7, преподаватель – 5.

Кафедра «Общетехнические дисциплины»:
заведующий кафедрой – 1, профессор – 1, доцент – 1,
старший преподаватель – 1, преподаватель – 1.

Кафедра «Техническая эксплуатация воздушных судов и двигателей»:
заведующий кафедрой – 1, профессор – 1, доцент – 1,
старший преподаватель – 1, преподаватель – 1.

Кафедра «Организация движения на воздушном транспорте»:
заведующий кафедрой – 1, доцент – 2,
старший преподаватель – 3, преподаватель – 2.

Кафедра «Английский язык»:
заведующий кафедрой – 1, старший преподаватель – 3,
преподаватель – 1.

Кафедра «Техническая эксплуатация авиационного оборудования»:
заведующий кафедрой – 1, профессор – 1, доцент – 2,
старший преподаватель – 2, преподаватель – 2.

Кафедра «Техническая эксплуатация радиоэлектронного оборудования»:
заведующий кафедрой – 1, профессор – 2, доцент – 3,
старший преподаватель – 4, преподаватель – 2.

Кафедра «Социально-гуманитарные дисциплины»:
заведующий кафедрой – 1, профессор – 1, доцент – 2,
старший преподаватель – 3.

Кафедра «Безопасность на воздушном транспорте»:
заведующий кафедрой – 1, профессор – 1, доцент – 1,
старший преподаватель – 2, преподаватель – 1.

Кафедра «Физическое воспитание и спорт»:
заведующий кафедрой – 1, старший преподаватель – 4,
преподаватель – 3.

Контактный телефон: 8017 3414655.

Сумесны праект газеты «Звязда» і Міністэрства ўнутраных спраў

ФАРПОСТ СПАКОЮ

№ 6 (14)

«КОЖНЫ ДЗЕНЬ НА ПРАЦУ ІДУ З УСМЕШКАЙ»

...прызнаецца маёр міліцыі Вячаслаў САЙКО, пераможца рэспубліканскага конкурсу сярод інспектараў па справах непаўналетніх.

— Я вельмі ўсцешаны тым, што перамог, — прызнаецца Вячаслаў, які працуе ў інспекцыі няпоўнагадовых Маскоўскага раёна сталіцы. — Удзельнічаў у падобных спаборніцтвах ужо ў чацвёрты раз. Раней першым не быў, а таму вельмі хацелася перамагчы. Адчуваў вялікую адказнасць. Але сабраўся, сканцэнтраўся і зрабіў усё, як трэба.

Дзеля таго, каб стаць першым, спадару Вячаславу давялося станоўча здаць іспыты па медыцынскай, агнявой падрыхтоўцы, адказаць на тэарэтычныя пытанні аб прававых актах, што рэгламентуюць практычную дзейнасць інспектараў. У выніку пераўзысці нашага суразмоўцу нікому не ўдалося.

— Інспектарам я працую роўна 21 год. Многія калегі на працягу службы спрабуюць сябе праявіць у міліцыі на розных спецыяльнасцях, але я вырашыў прысвяціць сябе выключна інспекцыі. Чаму? Бо праца падабаецца. Ад яе атрымліваю задавальненне. Кожным ранкам збіраюся на працу з добрым настроем. Стараюся сумленна выконваць свае абавязкі. Знайшоў сябе на гэтым месцы і пачуваюся на ім камфортна.

— Пытанне ад тых, хто не ведае. Якую асноўную функцыю выконваюць інспектары па справах няпоўнагадовых?

— Найперш папярэджанне супрацьпраўных дзеянняў і іх наступстваў сярод няпоўнагадовых, прафілактыка ў навучальных установах. Акрамя таго, нават на асабістым прыкладзе стараешся паказаць правільнасць сваіх доказаў. Я вельмі люблю спорт: наведваю трэнажорную залу, займаюся боксам. Сам жыву на сваім рабочым участку, а таму хлопцы бачаць, як бегаю крос вакол Цнянскага вадасховішча. Спадзяюся, хтосьці зверне на мяне ўвагу, возьме з мяне прыклад. Тэрыторыя ў мяне вялікая, а таму часта ў службовай дзейнасці з напарнікам выкарыстоўваем веласіпед...

— Ну, а цяпер вам дапаможа новы службовы аўтамабіль, які выйгралі ў прафесійным конкурсе.

— Так, для нас гэта вялікае дапамога. Раней ужо была службовая машына. Цяпер вось і новая з'явілася.

* * *

— Калі толькі пачыналі працаваць, якія праблемы былі галоўнымі ў маладзёжным асяродку?

— Яны былі іншымі, чым зараз. Калі я толькі прыйшоў у міліцыю, працаваў у сельгаспасёлку, сярод

Фота Надзеі БУЖАН.

злачынстваў пераважалі крадзяжы. У той час быў крызіс, не вельмі добрая эканамічная сітуацыя, а таму гэта, верагодна, падштурхоўвала моладзь да падобных дзеянняў.

— А што цяпер уяўляе з сябе ваш раён у крымінальным плане?

— Хаваць няма чаго. Ужыванне і распаўсюджанне наркатычных вырабаў — вялікая для нас праблема. Я працую ў мікрараёне Зялёны Луг (вуліца Мірашнічэнкі, тэрыторыя, якая прымыкае да Цнянскага вадасховішча), і гэтая бяда не абмінула мой адміністрацыйны ўчастак. Ёсць сем'і, дзеці, з якімі трэба працаваць не толькі мне, але і ўрачам-нарколагам, педагогам. Рознабаковая дапамога патрэбна не толькі падлеткам, але і іх бацькам. Бо сутыкнуцца з такой праблемай і выйсці з яе вельмі складана. Што тычыцца школ, у іх гэтае пытанне мы кантралюем, а вось з ліцэямі, каледжамі ўсё, на жаль, складана. І сярод навучэнцаў падобных установ сустракаюцца тыя, чые паводзіны вельмі цяжка скарэктаваць. Іх наогул даводзіцца ізаляваць. Нядаўна закон даў магчымасць за сістэматычнае правапарушэнне змяшчаць у спецустанову закрытага тыпу. І часам мы вымушаны такім правам карыстацца. Пры гэтым многім профілактыка дапамагае спыніцца і зрабіць правільны выбар.

— Ці ёсць сярод вашых былых «падапечных» тыя, хто здолеў пераарыентавацца і дасягнуць у нармальных жыцці пэўных поспехаў?

— Такіх большасць. Любое правапарушэнне не абмінае нас, кожнае абмяркоўваецца на пасяджэнні камісіі. Здавалася б, што такога, калі чалавек перайшоў дарогу на чырвонае святло? А ў выніку мы можам сутыкнуцца з дзіцячым траўматызмам. Дарэчы, на маю думку, трэба змяніць закон у дачыненні да дзяцей, якія паляць. Ім наогул нельга курыць, а мы толькі фіксуем факты, калі робяць гэта ў неналежным месцы. Хто ведае, можа, для кагосьці з іх курэнне — гэта першы крок да ўжывання наркатычных рэчываў.

Пры гэтым арганізаваць цяжкіх падлеткаў складана. Вучыцца яны не хочуць, займацца ў вольны час — таксама. Даводзіцца нават за руку іх вадзіць і пераконваць, што гэта для іх неабходна.

— У вашай практыцы былі правапарушэнні, якія шакіравалі нават вас, вопытнага праваахоўніка?

— Паўсюль расставіць міліцыянераў, папярэдзіць кожнае злачынства не атрымаецца. І, зразумела, такія выпадкі ёсць. Аднойчы ў Мінску знайшлі цела дзяўчынкі і не маглі яе апазнаць. А пасля высначылі, што злачынства з прычыны псіхічных ускладненняў здзейсніла... родная маці, якая не стаяла на ўліку, не выклікала падазрэнняў.

— Ці атрымліваецца не прапускаць праз сябе ўсё тое, з чым сутыкаецеся?

— З аднаго боку, гэта складана. Усё каштуе нерваў. Аднак, калі выконваць сваю працу непераканаўча, не ўкладваць эмоцыі ў свае словы, казаць завучаныя, банальныя рэчы, верагоднасць таго, што яны паўплываюць на чалавека, будзе меншай.

— Бацькі ахвотна ідуць з вамі на кантакт?

— Многія ставяцца з паразуменнем. Праўда, калі правапарушэнне, на іх погляд, нязначнае, пачынаюць казаць: «А чаму вы не затрымліваеце злачынцаў? Чаму не звярнулі ўвагу?» Падобная бацькоўская гіперапека заканчваецца для многіх дзяцей сумна. Некаторыя падлеткі пачынаюць адчуваць беспакаранасць і здзяйсняць больш сур'ёзныя правапарушэнні.

— Калі б ваша дачка пайшла працаваць у інспекцыю па справах няпоўнагадовых, што б вы ёй параілі?

— Цяжка сказаць. Яна вучыцца на эканаміста ў БДУ, а таму магла б пайсці працаваць толькі ва ўпраўленне па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі. Дарэчы, я сам па адукацыі географ, а апынуўся ў міліцыі. І ніколі аб гэтым не шкадаваў.

Тарас ШЧЫРЫ.
taras@zviazda.by

ВОЗЕРА — ЗОНА БЯСПЕЧНАГА АДПАЧЫНКУ?

Карэспандэнт «Звязды» даведаўся, як праваахоўнікі забяспечваюць парадак на самых буйных вадаёмых сталіцы

Калі б пра Мінск пісалі незвычайны даведнік, Камсамольскае возера туды б уключылі як самы папулярны прыродны басейн сталіцы. Цэнтр горада, інфраструктура, краявіды — літаральна ўсё працуе на яго паспяховасць. А таму і людзей у спякотныя летнія дні тут процьма. Аднак не ўсе сюды прыязджаюць пакупацца і паляжаць на сонцы. Ахвотных на пляжы прыбраць чужое майно, як аказваецца, таксама хапае.

КРАДУЦЬ НАВАТ КРАСОЎКІ

— У гарачае надвор'е сюды прыязджаюць адпачываць з усіх куткоў сталіцы, — кажа **Дзмітрый Шумілін, намеснік начальніка аддзела правапарадку і прафілактыкі Цэнтральнага РУУС сталіцы.** — Людзі вельмі розныя. І часам здараюцца сапраўдныя казусы. Нядаўна ў аднаго з адпачывальнікаў скралі... красоўкі. На месцы, дзе ляжаў абутак, злачынца пакінуў свае старыя кеды. Ім аказаўся 19-гадовы беспрацоўны мінчанін, які каля возера пазнаёміўся з кампаніяй, і пакуль новыя знаёмыя плавалі, той «сцярог» іх рэчы. А год таму адзін з мінакоў вырашыў скрасці партфель у мужчыны, які пасля выпітага заснуў у траве. Але дзякуючы пільным мінчанам, атрымалася раскрыць злачынства па гарачых слядах. У партфелі, дарэчы, знаходзіліся сур'ёзныя дакументы, якія было б складана аднавіць.

Міліцыя дзяжурыць тут штодня. Нарады працуюць пазменна. Праўда, як дадае Дзмітрый, большасць злачынстваў фіксуюць менавіта ў гарачыя дні. А пакуль колькасць адпачывальнікаў з улікам не самага спякотнага надвор'я невялікая. У параўнанні з леташнім перыядам знізілася колькасць крадзяжоў у зонах адпачынку. Нягледзячы на гэта, людзі, на жаль, гінуць у вадзе. На днях фізкультурнікі знайшлі ў возеры цела сталага чалавека, які, хутчэй за ўсё, памёр ад пераахаладжэння.

Я прашу суразмоўцу скласці рэйтынг правапарушэнняў, злачынстваў, што найчасцей здараюцца ля возера, і ён на першае месца ставіць распіванне спіртных напояў у зонах адпачынку і, што лагічна, знаходжанне ў грамадскім месцы ў нецвярозым стане. З 12 мая за алкагольны адпачынак на свежым паветры ля вадаёмаў у Цэнтральным раёне да адказнасці прыцягнулі звыш за 140 грамадзян. Далей па спісе — дробнае хуліганства, крадзяжы.

— На канфлікты, якія ўзнікаюць у зоне адпачынку, уплывае сумеснае распіванне спіртных напояў. Таму ў прыазёрных кавярнях забаронены продаж алкаголю. Што да крадзяжоў, злачынцы прысвойваюць пераважна мабільныя тэлефоны, планшэты, якія гаспадары пакідаюць на пляжы без нагляду. Калі ёсць магчымасць, пакідайце каштоўныя рэчы дома, у машыне, купайцеся з сябрамі па чарзе. І не давайце рэчы «павартаваць» незнаёмым людзям, якія могуць скарыстацца імі.

ГАЗОН — НЕ СТАЯНКА

Яшчэ адна праблема, з якой сутыкаецца большасць адпачывальнікаў, жаданне аўтаўладальнікаў прыпаркаваць сваё аўто на газоне. За падобнае парушэнне правілаў паркоўкі ў Цэнтральным ужо аштрафавалі больш 70 за аўтаўладальнікаў.

Вадзім ПЕТЫШ, намеснік начальніка арганізацыйна-аналітычнага ўпраўлення міліцыі грамадскай бяспекі МУС:

— Сёлета супрацоўнікі праваахоўных органаў забяспечваюць ахову правапарадку ў 750 месцах масавага адпачынку, з якіх 503 знаходзяцца ў непасрэднай блізкасці ад вадаёмаў. З пачатку купальнага сезона ўжо зафіксавана звыш за 3,6 тысячы адміністрацыйных правапарушэнняў. З іх большасць складаюць выпадкі распівання спіртных напояў у грамадскіх месцах і парушэнні правілаў дарожнага руху. У параўнанні з адпаведным перыядам 2014 года на 13% скараціласа колькасць злачынстваў у зонах адпачынку. Большую частку з іх складаюць крадзяжы і рабаўніцтва. Акрамя таго, падчас адпрацовак гэтых тэрыторый супрацоўнікі міліцыі выявілі 2 факты незаконнага абарачэння наркотыкаў.

— Калі летам дазваляе надвор'е, людзі прыязджаюць адпачываць на вадаёмы і многія з іх кідаюць аўтатранспарт на зялёнай зоне, — распавядае **Віктар Суруда, часовы выканаўца абавязкаў намесніка начальніка аддзела ДАІ Цэнтральнага РУУС сталіцы.** — Асабліва гэта тычыцца вадасховішча Дразды, якое знаходзіцца непадалёк ад «Мінск-Арэны». Там хапае парковачных месцаў. Людзі лянуюцца прайсці дзве сотні метраў і пад'язджаюць на аўто ледзь не да самай вады.

За парушэнне паркоўкі пагражае штраф у памеры адной базавай велічыні (180 тысяч рублёў), пры паўторным парушэнні ён павялічваецца ў два разы. А калі ты пакінуў на газоне грузавы транспарт, штраф ужо складзе 5 базавых. Караюць супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі і за невыкананне патрабаванняў дарожных знакаў.

— Зразумела, цалкам падобныя парушэнні не выкараніш, абсалютна да кожнага не дастукаешся, аднак хочацца, каб нашы грамадзяне хоць адно аднаго паважалі, — дапаўняе словы Віктара Суруды Настасся Радзько, старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе аддзела ДАІ Цэнтральнага РУУС. — Часта атрымліваецца, што яны не толькі парушаюць, але і блакуюць іншыя машыны, а пасля ідуць адпачываць. І нават пад лабавым шклом не пакідаюць нумароў тэлефонаў, каб з імі можна было аператыўна звязацца. А што, калі з кімсьці нешта здарыцца? Як выехаць? Таму, калі ласка, пакідайце нумары, давайце на элементарную культуру таксама не будзем забывацца.

Непадалёк ад вуліцы Ціхай, на ўзбярэжжы вадасховішча Дразды, знаходзіцца вельмі папулярны сярод мінакоў пляж. Праўда, зараз, у будны дзень, тут усё цалкам адпавядае назве вулачкі. Невялічкая кампанія гуляе ў валейбол, некалькі чалавек сядзяць на беразе. І ўсё.

— Калісьці сюды было шмат заездаў і многія машыны прарываліся, — узгадвае Руслан Федаровіч, інспектар ДПС АДАІ Цэнтральнага РУУС. — Некаторыя кідалі машыны пад знакамі, дрэвамі, ехалі нават у невялічкі лясок, смажылі мяса і хавалі там свой транспарт. Заязджалі на бардзюр, а пасля казалі, што не хапае парковачных месцаў.

— Аднак і сітуацыі бываюць розныя. З прычыны наплыву людзей камусьці проста не хапіла месца на паркоўцы. Што параіце рабіць кіроўцу у такім выпадку?

— Калі сам ездзіў адпачываць, высаджваў пасажыраў з рэчамі, а ўжо пасля ехаў шукаць вольнае месца адпаведна з правіламі. Лепш зрабіць усё ж такі так, пасля прайсціся пешшу, але не парушаць закон і не плаціць пасля штраф.

Раней, калі гэтую тэрыторыю яшчэ не добраўпарадкавалі, не зрабілі паркоўку, аўто тут кідалі дзе заўгодна. Ледзь не пад самым носам у аматараў пазагараць. А гэта ж не толькі правапарушэнне, але і экалогія. Мяркую, зараз наўрад ці нехта хоча ляжаць на пляжы побач з машынай. Чаму б і сапраўды не паважаць адно аднаго?

Тарас ШЧЫРЫ.
taras@zviazda.by
Фота аўтара

■ Ёсць пытанне!

У ТАКСІ БЕЗ АЎТАКРЭСЛА

— Скажыце, калі ласка, у якім выпадку дазваляецца перавозіць дзіця без спецыяльнага аўтакрэсла? **(Лідзія Б., Кобрынскі раён)**

Адказвае Сяргей БАГАЕЎ, начальнік аддзела ДАІ Кастрычніцкага РУУС г. Мінска:

— Паводле ўказа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь №483, перавозка дзяцей да 12-гадовага ўзросту без выкарыстання ўтрымальных прылад дазваляецца ў двух выпадках: пры выкарыстанні паслуг таксі, і тады, калі рост дзіцяці перавышае 150 сантыметраў. Аўтакрэслы абавязкова павінны адпавядаць росту і вазе пасажыра. Трэба памятаць, што перавозка дзяцей без аўтакрэсла ці так званага бустэра караецца штрафам да чатырох базавых велічынь. У выпадку паўторнага парушэння перавозкі пасажыраў на працягу года штраф складзе ад 2 да 8 базавых. Калі дзіця ў аўто не прышпілена да аўтакрэсла рэменем бяспекі, кіроўца прыцягваецца да адміністрацыйнай адказнасці ў адпаведнасці з часткай 4 артыкула 18.12 КаАП Рэспублікі Беларусь і з яго спаганяецца штраф у памеры да 1 базавай велічыні. За паўторнае падобнае парушэнне атрымае ад 2 да 5 базавых велічынь. Трэба памятаць, перавозка дзяцей ў аўтакрэсле на пярэднім сядзенні аўтамабіля забараняецца ў тым выпадку, калі спінка павёрнута да лабавога шкла пры наяўнасці падушкі бяспекі.

Нагадаем, што да ўтрымальных прылад адносяцца аўталюлька (крэсла для перавозкі малых ва ўзросце да года, яно мае ручку для пераноскі, рамяні бяспекі, важыць каля 5 кг), аўтакрэсла (прызначана для тых, чый рост не дасягнуў 150, вага — 36 кг) і бустэр (аўтакрэсла для тых дзяцей, якія яшчэ па росце не могуць карыстацца дарослымі рамянямі бяспекі). Падобнае прыстасаванне прыўздымае малога да неабходнага ўзроўню знаходжання рамянёў бяспекі).

Якаў ЖУРБІН

■ Навіны-102

СКРАЎ ЖЭТОН, КАБ ЗАБРАЦЬ ЧУЖУЮ СУМКУ

Мінскі аддзел унутраных спраў на транспарце па падазрэнні ў крадзяжы вышуквае мужчыну. Той спачатку выкраў у візаві жэтон ад камеры захоўвання, а ўжо адтуль — сумку з асабістымі рэчамі пацярпелага.

Два мужчыны пазнаёміліся каля сталічнага чыгуначнага вакзала з прычыны сваёй любові да Бахуса. Скінуліся, набылі бутэльку. «Банкет» з гэтай нагоды вырашылі правесці ў найбліжэйшым утульным дворыку. Там адзін з мужчын пасля першых жа глыткоў неспадзявана задрамаў. Яго сабутэльнік, не губляючы часу, «прайшоўся» па кішэнях новага знаёмага, адкуль здабыў жэтон ад камеры захоўвання. А потым нецвярозай паходкай накіраваўся да вакзальных камер захоўвання, адкуль забраў чужую сумку. Праўда, пры гэтым трапіў пад увагу камер відэаназірання, дзякуючы чаму партрэт зламысніка вядомы.

ЗА МАК «БІЗНЕСМЕН» БРАЎ НЕ ТОЛЬКІ ГРОШЫ

Супрацоўнікі наркакантролю ГУУС Мінгарвыканкама і Першамайскага РУУС пры падтрымцы спецпадраздзялення «Алмаз» затрымалі 26-гадовага беспрацоўнага мінчаніна, які займаўся збытам насення маку.

На тэрыторыі Партызанскага раёна хлопец арганізаваў цэлую сетку па распаўсюджванні «тавару». Яго дзейнасць была нядоўгай, але паспела прынесці неблагі даход. Пры правядзенні вобыску ў фігуранта канфіскавалі больш за 13 мільёнаў рублёў і 370 долараў. Гэта быў даход толькі за адзін дзень. Агульная маса канфіскаванага маку склала больш за 20 кілаграмаў. Былі ўжо нават расфасаваныя і падрыхтаваныя для продажу дозы. За адзін кілаграм кліенты плацілі 850 тысяч рублёў, пра гэта паведамілі ў ГУУС Мінгарвыканкама. У якасці аплаты «бізнесмен» браў не толькі грошы. Чарговую дозу нарказалежныя набывалі ў яго і за відэарэгістратар, і за відэакамеру, планшэт, аўтамагнітолы, антырадар, мабільныя тэлефоны... Усё гэта было знойдзена пры вобыску. У адносінах да затрыманага праводзіцца праверка. Дарэчы, раней ён быў судзімы, у тым ліку за крадзяжы і згвалтаванне.

НА ЗАЎВАГУ — ЭЛЕКТРАШОКЕРАМ

Каля дзвюх гадзін ночы на спецлінію «102» паступіла паведамленне, што на сталічнай Кастрычніцкай плошчы мужчына з электрашокерам чапляецца да грамадзян. Па прыкметах падазроны быў аператыўна затрыманы супрацоўнікамі АМАПа.

Высветлілася, што 22-гадовы малады чалавек чакаў сяброў. Тое, як ён сядзеў (дакладней, амаль ляжаў), не спадабалася выпадковаму мінаку, які зрабіў заўвагу. У адказ затрыманы ўдарыў незнаёмца ў грудзі электрашокерам і збег. На шчасце, як расказалі ў прэс-службе ГУУС Мінгарвыканкама, удар прыйшоўся ў раён нагруднай кішэні, дзе ляжаў мабільны тэлефон і мужчына пазбегнуў электрычнага ўдару. Затрыманы — не мясцовы, ён каля месяца таму прыехаў у сталіцу з вёскі.

Сяргей РАСОЛЬКА.
rs@zviazda.by

АРКЕСТР ГУЧЫЦЬ

Сёлета ўзорна-паказальнаму аркестру ўнутраных войскаў МУС споўнілася 20 гадоў

«ДЫРЫЖОРУ ТРЭБА БЫЦЬ КРЫШАЧКУ ДЫКТАТАРАМ»

На двары лета, ледзь не кожны плануе свой адпачынак, а ў музыкантаў аркестра ідуць рэпетыцыі. Вось і зараз са студыі, што на другім паверсе клуба вайсковай часці 5448, гучыць музыка, у перапынках нешта абмяркоўваецца.

— А калісьці музыканты тут мелі даволі сціплыя ўмовы, — прыгадвае **Аляксандр Лагун, начальнік аркестра.** — Але з часам усё добраўпарадкавалі. Пра тыя інструменты, якія мы маем зараз, калісьці можна было толькі марыць. Што тычыцца працы, насамрэч яе ў нас і летам хапае. Удзельнічаем у парадзе, прысязе, сустракаем дэлегацыі, забяспечваем мерапрыемствамі гарнізон. А адносна нядаўна адыгралі канцэрт, прысвечаны нашаму юбілею.

Аляксандр Лагун праводзіць нас у прасторную гасцінную, сцены якой упрыгожаны сувенірамі і фотаздымкамі з міжнародных фестываляў. Калектыў быў створаны ў 1995 годзе і за гэты час з гастролямі паспеў наведаць Германію, Іспанію, Ірландыю, Вялікабрытанію, Італію...

— Мы ўдзельнічалі ў буйных шоу ваенных і паліцэйскіх аркестраў. Неяк нават выступалі на парадзе Святога Патрыка, — з захапленнем распавядае дырыжор. — Літаральна ўсе дублінцы панадзявалі каўпакі. Па вуліцах рушылі гімнасты, шматлікія аркестры. Гэта было каласальнае відовішча! Еўрапейская публіка, дарэчы, любіць жывую музыку, з асалодай яе прымае. І класіку, і джаз.

— Як вас сустракаюць?

— Добра. За мяжой мы выконваем і беларускія, і рускія народныя творы. «Лявоніху», «Карабейнікаў», «Бульбу», «Калінку». Папуры з беларускіх песень і танцаў тамтэйшая аўдыторыя прымае пазітыўна. Мы і самі стараемся працаваць у розных жанрах і пашыраць свой рэпертуар. Але такая класіка, як вальс, марш, у чым духавы аркестр заўжды быў каралём, застаюцца для нас непахіснымі.

— Ваш аркестр даволі часта дае плац-канцэрты. Ці неабходна музыкантам добрая фізічная падрыхтоўка?

— Безумоўна. Калі ты іграеш на духавым інструменце, трэба мець добрае здароўе. Адпрацаваць 4 гадзіны рэпетыцыі складана. Людзям, якія гэтага не разумеюць, мы заўжды кажам: «Надзьміце па чарзе 15 шарыкаў, і мы паглядзім, што будзе. Найхутчэй закруціцца галава». А ў нас на рэпетыцыях капітальныя нагрузкі. Духавы інструмент патрабуе шмат высілкаў. І нават медыкі даказалі, што іграць на іх даволі складана.

«КАЛЕКТЫЎ МОЦНЫ НАЙПЕРШ МУЗЫКАНТАМІ»

У аркестры працуе больш за 50 музыкантаў. Сярод іх ёсць і цывільныя супрацоўнікі, і ваеннаслужачыя тэрміновай службы, і тыя, хто пасля войска вырашыў застацца ў ансамблі на кантракце.

— Кіраваць падобным калектывам няпроста, — прызнаецца Аляксандр Лагун. — У нас людзі з розным жыццёвым вопытам. У іх разнастайныя музычныя густы. А мне трэба часам навязаць сваю волю, пераканаць іх, каб выконвалі пэўныя творы. А дзеля гэтага трэба быць псіхолагам, і, напэўна, нават крышачку дыктатарам.

22-гадовы барабаншчык Аляксей Воднеў — адзін з прадстаўнікоў маладога пакалення. Прыйшоў у войскі на тэрміновую службу і пасля яе завяршэння застаўся ў аркестры.

— Калектыў у нас вельмі добры, — кажа Аляксей. — Кіраўнікі з павагай ставяцца да музыкантаў. Што мне найбольш падабаецца выконваць? Здаецца, у нас атрымліваецца якасна іграць эстрадныя мелодыі, джаз. З вакалістамі ўсё гэта гучыць вельмі прыгожа.

— А чым, акрамя музыкі, захапляюцца вашы аркестранты?

— Людзі часам жартуюць, пытаюцца: « Ці праўда, што ў вашым аркестры працуюць культурысты?» У нас і сапраўды шмат аматараў спорту. Нехта займаецца муай-тай, нехта класічным боксам. Многія прайшлі тэрміновую службу.

Калі Аляксей плануе працягнуць завочнае навучанне ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў, яго калега — трубач Кацярына Дабравольская — скончыла Акадэмію музыкі і аспірантуру Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі імя Пятра Чайкоўскага.

—Як разумею, далёка не ўсе дзяўчаты, якія займаюцца музыкай, вырашаюць іграць на трубе.

— Так, бо гэта не вельмі прынята ў нашай краіне. А ў Еўропе жанчыны іграюць на медных і духавых інструмен. Там гэта лічыцца звычайным. У Беларусі такіх дзяўчат няшмат.

— І чым вас прывабіў гэты інструмент?

— А ў мяне бацька трубач. Вось і зацікавілася, і вырашыла звязаць сваё жыццё з трубой. Мужчыны да гэтага ставіліся па-рознаму. Былі пэўныя непаразуменні, што мяне яшчэ больш падбухторвала. Мне мая справа падабаецца. І я стараюся займацца тым, ад чаго атрымліваю асалоду. Акрамя таго, працягваю справу свайго бацькі, што таксама матывуе мяне для новых здзяйсненняў.

— Вы працуеце ў гэтым калектыве адносна нядаўна. Ці паспелі адчуць галоўныя асаблівасці?

— З творчасцю аркестра знаёма здаўна. Яшчэ падчас вучобы ў вучылішчы ён неаднаразова прыязджаў выступаць да нас. Мне заўжды падабаўся яго разнастайны рэпертуар. Тым больш духавіку хочацца іграць менавіта ў духавым аркестры. У сімфанічнай музыцы асноўную нагрузку на сябе бярэ скрыпічная група. А тут больш ігры, больш магчымасцей праявіць сябе. Я вельмі задаволена, што трапіла сюды. На маю думку, наш калектыў вылучаецца найперш моцнымі музыкантамі. І я лічу яго не проста адметным сярод ваенных духавых аркестраў, але і найлепшым у межах усёй краіны.

Тарас ШЧЫРЫ.
taras@zviazda.by

Фота Надзеі БУЖАН.

■ Асабістае

МЫ ЗВАЛІ ЯЕ НАЙМУДРЭЙШАЙ

...Некалі — помніце? — мы стаялі ў даўжэзных чэргах. І зноў жа некалі, дастаяўшыся, набіралі ўсяго, як казаў гумарыст, «па два, па чатыры, па шэсць, па восем».
Тыя часы, дзякаваць Богу, мінулі, а вось звычка — засталася. Убачыўшы ў краме цікавую кніжку, я (калі пры грашах) бяру яе і сабе, і іншым...
Аднак пры гэтым, прычытаўшы, толькі аднойчы тэлефаную аўтарцы, каб выказаць захапленне.
Што яна? Ды, можна сказаць, нічога — перапыняе кароткім: «Вам спадабалася?.. То прыходзьце, я падпішу».
З таго першага прыходу (балазе ад рэдакцыі гэта блізка) прайшло амаль дзевяць гадоў, было мноства сустрэч... І сёння, у дзень нараджэння пісьменніцы Лідзіі Арабей (ёй споўнілася б 90!), трэба, лічу, хоць трохі расказаць пра яе...

Дзявочае прозвішча Лідзіі Львоўны — Качкоўская. Арабей яна стала ў гады вайны, калі з галоднага Мінска з'ехала ў Шчучын («Заходнікі лепей жылі»), калі там выйшла замуж, хоць каханя, казала, і не было («Проста пошук яго, адзінота...!»).

А ў хуткім часе мужа не стала — загінуў у фашысцкіх засценках.

І сама яна тройчы была пад дулам пісталета.

* * *

Са Шчучына ў разбураны Мінск Лідзія Львоўна вярнулася пасля яго вызвалення. Кандрат Крапіва (зямляк жанаты на стрыечнай сястры яе маці) дапамог дзяўчыне ўладкавацца на працу.

Так яна апынулася ў доме Міхася Лынькова, тагачаснага старшыні Саюза пісьменнікаў: парадкуе паперы, адказвае на тэлефонныя званкі...

Потым — і з той жа місіяй — трапляе ў дом Коласа.

На адным са здымкаў, што ўсё жыццё правісеў над ложкам Лідзіі Львоўны, яны з класікам удваіх. Міхась Лынькоў, расказвала, захапляўся фатаграфіяй і неяк прапанаваў Якубу Коласу: «А давайце я вас здыму!» — «Ну, тады з гэтай дзяўчынай», — пагадзіўся Колас.

А Лідзія Львоўна ўсё жыццё потым шкадавала, што ў кола гэтых людзей (была яшчэ праца ў «Вожыку» з Крапівой, Танкам, Брылём, Лужаніным...) трапіла вялікай дурніцай — нічога, можна сказаць, не разумеючы і нічога не запісваючы. Хіба...

Неяк да Лужаніна завітала цётка Уладзя, жонка Янкі Купалы, пахвалілася скарбам — двума брусочкамі мыла, адзін з якіх — убачыўшы вочы — падарыла будучай пісьменніцы.

...Усё жыццё тая помніла гэты падарунак і сама з ахвотай купляла розную драбязу, кшталту мыла, шампуняў, крэмаў.

* * *

Кнігу абразкоў «Пошукі ісціны», з якой пачалося наша знаёмства, падпісчыца «Звязды» Лідзія Львоўна (прабачце за таўталогію) падпісала Ніне Мацвееўне Бурко з Бярэзіншчыны, Соф'і Парфір'еўне Кусянковай і Антаніне Мікалаеўне Ерамеевай з Рагачоўшчыны, Ліліі Радзівонаўне Зарэцкай з Пастаўшчыны, Іне Іосіфаўне Казлоўскай з Мінска...

«Калі пачынаецца вайна, першай ахвярай становіцца ісціна».

Водгукі былі самыя нечаканыя. Лілія Радзівонаўна, прынамсі, напісала Лідзіі Львоўне, што, захапіўшыся чытвом, забывалася карміць парсючка. А потым вышыла ёй падушачку.

Ніна Мацвееўна «моду ўзяла» прысылаць «гуманітарку» ў выглядзе розных вясковых прысмакаў. «З яе мядком і цвік праглынеш», — казала Лідзія Львоўна і ў халадзільніку заўсёды трымала кавалачак сала.

Антаніна Мікалаеўна (дарэчы, інвалід I групы) звязала пісьменніцы прыгожыя прыхваткі для гарачага. А кухонныя дошачкі ад Соф'і Парфір'еўны гаспадыня павесіла на сцяну і, прызнаўшы іх за творы мастацтва, карыстацца не стала.

...Трэба сказаць, што гэтыя жанчыны прыйшлі ў жыццё пісьменніцы на гады — з лістамі, віншаваннямі, размовамі па тэлефоне і нават сустрэчамі.

* * *

...Ніна Мацвееўна запрашае нас з Лідзіяй Львоўнай у госці і сустракае нібы «ў кіне». Гэта значыць, што ад брамкі, насустрач нам, выходзяць трое: гаспадыня і меншая ўнучка з кветкамі, а большая — з хлебам-соллю.

Потым мы частуемся рознымі прысмакамі (у тым ліку з печы), спяваем пад гармонік (гаспадыня грае), разам з вясковымі кабетамі сядзім на лаўцы, ідзём да рэчкі. Лідзія Львоўна па дарозе разуваецца, заходзіць у ваду...

І потым яшчэ доўга ўспамінае, як мы ездзілі ў вёску і як яна — босая — хадзіла па траве.

* * *

Крыж адзіноты: другі муж Лідзіі Львоўны, вядомы мастак Яўген Ганкін, памёр амаль дваццаць гадоў таму, дзяцей у іх не было. «Як цяжка жыць, калі няма каго любіць, калі няма каго чакаць, калі няма каго абняць», — пісала пісьменніца ў адным з абразкоў.

Але ж пры гэтым катэгарычным «не трэба» адмятала ўсе спробы «падкінуць» ёй сабачку ці катка, узяць харошую кватарантку.

* * *

Пісьменніца вельмі не любіла (цяжка гаварыць пра яе ў прошлым часе) некага аб нечым прасіць, вельмі не хацела быць абавязанай. Адзінае — заўсёды пыталася: «А новую кніжку вы мне прынеслі?»

Будучая пісьменніца з маці Марыяй Антонаўнай МАХНАЧ. 1926 г.

Чытала шмат: Талстой, Пушкін, Быкаў (без купюр), Алексіевіч, за адну зіму — ці не ўвесь Колас, Алена Брава, Наталка Бабіна, Уладзімір Сцяпан, успаміны Карпюка, Тараса, Шаранговіча... І ўсё — пасля аперацыі на вачах, у акулярах, праз лупу, што, вядома ж, нязручна!

Прыношу планшэт. Паказваю, як на ім выбраць кнігу, як павялічыць шрыфт, як «перагортваць» старонкі.

Потым ён пазваніў зноў: маўляў, у мінулыя разы я не мог...

— А зараз, — Лідзія Львоўна была катэгарычнай, — не магу я... Выбачайце.

...Шкада, цікавай магла быць размова.

* * *

Завядзёнкі хадзіць у госці з пустымі рукамі ў нашай сям'і не было. Таму кожная сустрэча з пісьменніцай ператваралася ў маленькі «пір душ» (гэта калі блізкія душы збіраюцца разам і пачынаюць баляваць). Зрэдку, па святах, мы дазвалялі сабе нават на кроплі нейкай смакаты, кшталту Арабейкі (гаспадыня настойвала ягады з цукрам, сок разводзіла гарэлкай), на стол выстаўлялі розныя прысмакі — я свае, Лідзія Львоўна — свае.

Мы хораша сядзелі! Як у «рэстаране»! Нават тры зорачкі яму «прысвоілі», бо гэта ў гасцініц зорачак пяць, а ў рэстаранаў — максімум тры.

* * *

Лідзія Львоўна любіла кветкі, кветкі любілі яе.

Вады ім гаспадыня не шкадавала: палівала ўсё досыць шчодра.

— Фіялкам, як людзям, лепш недапіць, чым перапіць, — заўважала я.

Лідзія Львоўна слухала, але рабіла па-свойму.

З мужам Яўгенам ГАНКІНЫМ.

Лідзія Львоўна трымае гэтую навамодную цацку ў руках, здзіўляецца і прамаўляе катэгарычнае «не», бо кніга ёсць кніга — навобмацак, на пах, на шоргат старонак...

Хто б спрачаўся...

* * *

Ёй жа пазваніў калега — папрасіў аб інтэрв'ю. Яна згадзілася, аднак напярэдадні той павыбачаўся, сказаў, што прыйсці не зможа: давайце, маўляў, у наступны чацвер. «Добра», — адказала Лідзія Львоўна, але і ў чацвер таму нешта не выпала...

Што здзіўляла, ніводзін вазон не крыўдаваў: усе яны хораша цвілі, клопатам гаспадыні — размнажаліся і разыходзіліся па руках.

* * *

У пісьменніцы была дача. Не ў памяці, калі яна яе купіла (можа, як палітончык, як сервіз, самавар, ляльку на чайнік, пральную машыну ды многае іншае, гадоў трыццаць, сорак ці пяцьдзясят таму), не ў памяці ў каго, але ж — да бабкі не хадзі — і прадавец, і пакупнік мелі розум! Дамок (такія нехта з расійскіх гумарыстаў назваў «зборнашчылінными») адным бокам туліўся да лесу. У ім быў ганак з лаўкай, дзе, відаць, так хораша сядзелася, прасторная веранда (справа — маленькая кухня, злева — канапка і круглы стол). А з яе — два на дзіва ўтульныя пакойчыкі: акенца, ложак, стол...

Мы ездзілі туды толькі раз. І ўжо тады, калі рашэнне аб продажы гэтага райскага куточка было прынята (працаваць там гаспадыня не магла, памочнікаў не мела)... Як яно далося Лідзіі Львоўне, уявіць няцяжка. Яна вельмі любіла зямлю, што трохі дзіўна, бо ў вёсцы, у слынным Нізку яна пражыла толькі два гады.

* * *

З паліцы на дачы мы забралі кнігі («А то новыя гаспадары яшчэ спаляць»), выкапалі некалькі шматгадовых кветак.

Лідзія Львоўна прыязджала потым на наша лецішча, радавалася, што ўсё расце. А мы ёй казалі, што кветнік носіць яе імя, што на доме, калі давядзём да ладу, з'явіцца дошка: маўляў, тут гасціла слынная беларуская пісьменніца...

«Самая вялікая і цяжкая навука жыцця — цярпенне».

Яна, вядома ж, разумела, што па сённяшнім часе глядзець на той дом турысты не паедуць, але сама размова была ёй прыемнай.

* * *

На снеданне ў пісьменніцы кава з бутэрбродамі. Цытую знаёмага «травазнаўцу»: «Нашча для страўніка кубачак распушчальнай кавы — тое ж што жменька пяску». Лідзія Львоўна смяецца: «А ў мяне нераспушчальная!»

Разам мы «перабіраем» усё — аўсянку, розныя тваражкі, мюслі, ёгурты і застаёмся пры сваім: на снеданне ў Лідзіі Львоўны кава і бутэрброды: «Усё астатняе мне нясмачна».

* * *

Вялікія малайцы ўздзенцы! Час ад часу Лідзія Львоўна паведамляе, што хтосьці адтуль званіў, што прыязджаў, што яе запрашалі прыехаць, што ездзіла, што па дарозе назад «хлопцы» (выдавец Віктар Хурсік, мастак Уладзімір Ткачоў, вялікі краязнаўца Уладзімір Кісялёў, журналіст Мікалай Кароль — светлай памяці!) заязджалі да яе.

...Часам яны заседжваліся (і, вядома ж, не за гарбатай), часам — спрачаліся ды стамлялі. Аднак... былі.

У апошнія гады гэты «хлапечы» гурт ад пісьменніцы неяк аддаліўся: хіба што, развітацца прыйшоў.

* * *

Лідзія Львоўна была добрай гаспадыняй. Да апошняга сама мыла і прасавала (нават пасцельную бялізну, чаго многія ўжо не робяць), толькі напрыканцы — стала дазваляць пачысціць вокны і прыбраць у кватэры (гэта рабіла спадчынніца, зводная сястра, двойчы на месяц — 4 і 20 чысла), умела шыць, па маладосці — вышывала крыжыкам (на кухні вісела карціна), умела гатаваць, але займацца гэтым не любіла.

Валянціна ДОЎНАР.
dounar@zviazda.by

■ Будзе свята!

КІРМАШЫ ЗАКЛІКАЮЦЬ, НАСТРОЙ СТВАРАЮЦЬ

Ва ўсіх раёнах сталіцы 3 ліпеня пройдуць кірмашы, пра што паведамілі ў галоўным упраўленні спажывецкага рынку Мінгарвыканкама.

У Дзень Незалежнасці маштабныя народныя гулянні пройдуць на пляцоўцы каля Палаца спорту. Кірмаш будзе працаваць тут 3 ліпеня з 10 да 0.30, а 4 ліпеня — з 10 да 23 гадзін. Кірмашы пройдуць і ва ўсіх адміністрацыйных раёнах Мінска. Так, 3 ліпеня гулянні адбудуцца ў парку імя 50-годдзя Вялікага Кастрычніка, Лошыцкім парку, у гарналыжным цэнтры «Сонечная даліна», парку імя М. Горкага, на пляцоўцы па вуліцы Сталетава, у парку імя Чалюскінцаў, імя Дружбы народаў, імя 60-годдзя Кастрычніка. 3-4 ліпеня кірмашы адбудуцца ў парках імя Паўлава і Перамогі, з 3 па 6 ліпеня — у парку імя 900-годдзя Мінска, 4 ліпеня — каля цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі «Ветразь», на пляцоўцы каля Камароўскага рынку, 5 ліпеня — у парку Цівалі. 6 ліпеня ў парку імя Я. Купалы з 12 да 22 гадзін будзе праходзіць фестываль «Купальскі лён» з рэалізацыяй тавараў канцэрна «Беллегпрам». Тут жа прапануюць набыць харчовыя тавары і прадукцыю грамадскага харчавання.

Сяргей РАСОЛЬКА.
rs@zviazda.by

■

Результаты рекламной игры

IdeaBank Отличная идея!

«Отличная идея – выиграть!»

Организатором Рекламной игры является Закрытое акционерное общество «Идея Банк» (далее – организатор), зарегистрированное 24.04.2004 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 807000122. Лицензия на осуществление банковской деятельности №25 от 03.06.2013 г. выдана Национальным банком Республики Беларусь. Местонахождение Заинтересованного лица: 220034, г. Минск, ул. З. Бядули, 11. УНП 80700012.

Рекламная игра носит название «Отличная идея – выиграть!» (далее – Игра) и проводится с 12 мая 2015 года по 29 июня 2015 года включительно (включая сроки выдачи призов и опубликования результатов проведения рекламной игры). Свидетельство о регистрации рекламной игры №2546 от 6.05.2015 г. выдано Министерством торговли Республики Беларусь.

Всего к участию в игре было допущено 12 417 участников, полностью соответствующих требованиям Правил Рекламной игры. Призовой фонд разыгран не полностью. В соответствии с Правилами Игры победителями стали 5 участников:

Победитель	Фамилия, инициалы победителя	Выигрыш
Победитель №1	Саринова Людмила Борисовна	446 985 (четыреста сорок шесть тысяч девятьсот восемьдесят пять) белорусских рублей
Победитель №2	Козловский Евгений Геннадьевич	24 490 008 (двадцать четыре миллиона четыреста девяносто тысяч восемь) белорусских рублей
Победитель №3	Скрипко Ольга Владимировна	3 181 840 (три миллиона сто восемьдесят одна тысяча восемьсот сорок) белорусских рублей
Победитель №4	Гуминский Андрей Александрович	10 190 897 (десять миллионов сто девяносто тысяч восемьсот девяносто семь) белорусских рублей
Победитель №5	Акульская Елена Валерьяновна	3 535 900 (три миллиона пятьсот тридцать пять тысяч девятьсот) белорусских рублей

Победители могут получить приз по адресу: г. Минск, З. Бядули, 11 в период с 17 по 29 июня 2015 года включительно.

Члены комиссии подтвердили, что розыгрыш проводился с соблюдением всех юридических норм и правил игры. Нарушений не было выявлено, жалоб организатору и комиссии не поступало.

Правила проведения рекламной игры, а так же ее результаты, были опубликованы в газете «Звязда» № 87 от 12.05.2015 и № 121 от 27.06.2015 соответственно.

Паритетбанк
www.paritetbank.by

Открытое акционерное общество «Паритетбанк»,
(Республика Беларусь, 220002, г. Минск, ул. Киселёва, 61а)
сообщает, что 8 июля 2015 года в соответствии с решением Наблюдательного совета ОАО «Паритетбанк» от 26 июня 2015 года, протокол № 19,
ПРОВОДИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ С ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:

1. О внесении изменений и дополнений в Устав ОАО «Паритетбанк».
2. Об утверждении изменений в Положение о Наблюдательном совете ОАО «Паритетбанк».
3. О признании утратившим силу Положения о порядке использования прибыли ОАО «Паритетбанк».
4. О рекомендуемом размере дивидендов по акциям ОАО «Паритетбанк».

Собрание проводится по адресу: г. Минск, ул. Киселёва, 61а, комн. 205.

Список лиц, имеющих право на участие во внеочередном Общем собрании акционеров, составляется на основании реестра владельцев ценных бумаг, сформированного по состоянию на 29 июня 2015 года.

Регистрация лиц, имеющих право на участие во внеочередном Общем собрании акционеров, будет проводиться при получении бюллетеней при предъявлении документов, удостоверяющих личность (подтверждающих их полномочия).

Получить бюллетени для заочного голосования и ознакомиться с материалами к собранию участники собрания могут по адресу: г. Минск, ул. Киселёва, 61а, комн. 205 – 30 июня 2015 года и 1 июля 2015 года с 9.00 до 13.00 по месту проведения внеочередного Общего собрания акционеров.

Заполненные бюллетени для заочного голосования должны быть возвращены не позднее 2 июля 2015 года по месту проведения внеочередного Общего собрания акционеров, дата подсчета голосов – 6 июля 2015 года.

Принявшими участие во внеочередном Общем собрании акционеров считаются лица, заполненные бюллетени которых получены ОАО «Паритетбанк» в указанном порядке, которые включаются в одноименный список.

Телефон для справок: 288 63 31.

Наблюдательный совет ОАО «Паритетбанк».

Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь от 08.05.2013 г. № 5. УНП 100233809.

АНГЛАМОЎНАЯ АСПІРАНТУРА ЗАПРАШАЕ...

Першая абарона магістарскіх дысертацый на англійскай мове адбылася на факультэце міжнародных адносін БДУ. Аўтары навуковых прац — грамадзяне Германіі, Кітая, Ірака, Лівіі і Казахстана. На працягу двух гадоў яны навучаліся ў англамоўнай магістратуры па спецыяльнасці «гісторыя міжнародных адносін і знешняй палітыкі».

Тэматыка дысертацый ахоплівала шэраг актуальных праблем сучасных міжнародных адносін і знешняй палітыкі розных дзяржаў. У прыватнасці, магістранты даследавалі ўплыў падзей «Арабскай вясны» на міжнародныя адносіны на Блізкім Усходзе і ў Паўночнай Афрыцы, перспектывы расійска-кітайскага збліжэння, міжнароднае супрацоўніцтва ў забеспячэнні бяспекі ядзерных матэрыялаў і інш.

Факультэт міжнародных адносін БДУ плануе ў найбліжэйшы час пашырыць спіс спецыяльнасцяў англамоўнай магістратуры і распрацаваць шэраг новых магістарскіх праграм для беларускіх і замежных студэнтаў.

Надзея НІКАЛАЕВА.
nikalaeva@zviazda.by

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении 28 июля 2015 года открытых аукционных торгов с условиями по продаже единым предметом торгов имущества детского оздоровительного лагеря «Юный Коммунар»

Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)
«Спальный корпус» с инвентарным номером 600/С-98138 общей площадью 536,7 кв. м; «Здание дома отдыха (корпус)» с инвентарным номером 600/С-100723 общей площадью 182,0 кв. м; «Здание административного корпуса» с инвентарным номером 600/С-100602 общей площадью 100,3 кв. м; «Здание склада спортинвентаря» с инвентарным номером 600/С-100626 общей площадью 53,9 кв. м; «Здание медпункта» с инвентарным номером 600/С-100718 общей площадью 80,3 кв. м; «Здание котельной, прачечной» с инвентарным номером 600/С-100720 общей площадью 250,3 кв. м; «Здание дома отдыха» с инвентарным номером 600/С-100722 общей площадью 103,8 кв. м; «Здание подстанции» с инвентарным номером 600/С-100619 общей площадью 19 кв. м; «Здание склада» с инвентарным номером 600/С-100616 общей площадью 35,6 кв. м; «Здание спального корпуса» с инвентарным номером 600/С-100613 общей площадью 177,7 кв. м; «Здание спального корпуса» с инвентарным номером 600/С-100609 общей площадью 174,4 кв. м; «Здание спального корпуса» с инвентарным номером 600/С-100612 общей площадью 175,8 кв. м; «Здание насосной станции» с инвентарным номером 600/С-100621 общей площадью 13,2 кв. м; «Здание спального корпуса» с инвентарным номером 600/С-100624 общей площадью 174,8 кв. м; «Здание картофелечистки» с инвентарным номером 600/С-100726 общей площадью 29,7 кв. м; «Здание овощехранилища» с инвентарным номером 600/С-100729 общей площадью 125,8 кв. м; «Клуб» с инвентарным номером 600/С-149082 общей площадью 260,3 кв. м; «Спальный корпус» с инвентарным номером 600/С-149077 общей площадью 278,4 кв. м; «Дом сторожа» с инвентарным номером 600/С-149083 общей площадью 34,5 кв. м.
Сведения о земельном участке: площадь – 6,3240 га, кадастровый номер 623681700001000204, целевое назначение – Земельный участок для обслуживания зданий и сооружений оздоровительного лагеря «Юный Коммунар»
Местонахождение: Минская область, Минский район, район деревни Крыжовка
Продавец имущества: СОАО «КОММУНАРКА», Республика Беларусь, 220033, г. Минск, ул. Аранская, 18
Организатор торгов: УП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10
Начальная цена предмета торгов (с учетом НДС): 6 278 397 600 белорусских рублей
Сумма задатка: 600 000 000 белорусских рублей
Условия торгов (условия продажи): 1. Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере одного процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов; 2. Сохранение функционального назначения продаваемого имущества – оздоровительно-туристический комплекс.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего СОАО «КОММУНАРКА», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) по согласованию с продавцом в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся **28 июля 2015 года в 14.30** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 29.06.2015 по 24.07.2015 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону: (029)13-11-302 (СОАО «КОММУНАРКА»).

Телефоны для справок:
(017)327-48-36 (УП «Минский городской центр недвижимости»);
(029)13-11-302 (СОАО «КОММУНАРКА»).

УЗДЕНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
4 августа 2015 года по адресу: г. Узда, ул. Советская, 22, кабинет 418 (4-й этаж) в 10.00 проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам для коллективного садоводства в садоводческом товариществе «Сымончицы-2»

НА АУКЦИОННЫЕ ТОРГИ ВЫСТАВЛЯЮТСЯ УЧАСТКИ:

№ лота	Продавец	Местонахождение участка	S (га)	Кадастровый номер	Нач. цена (бел. руб.)	Расх. по подгот-ке (кроме расх. на публ-цию извещ.)
Лот №1	Узденский райисполком	Узденский р-н, СТ «Сымончицы-2», уч. №59	0,0610	625684200003000059	5 500 000	450 000
Лот №2	Узденский райисполком	Узденский р-н, СТ «Сымончицы-2», уч. №84	0,0599	625684200003000082	4 500 000	8 680 210
Лот №3	Узденский райисполком	Узденский р-н, СТ «Сымончицы-2», уч. №85	0,0660	625684200003000035	4 500 000	-
Лот №4	Узденский райисполком	Узденский р-н, СТ «Сымончицы-2», уч. №97	0,0611	625684200003000083	5 500 000	8 680 210

Целевое назначение участков – для ведения коллективного садоводства в садоводческом товариществе «Сымончицы-2».

Задаток в размере 10 процентов от начальной цены земельного участка перечисляется путем безналичных расчетов платежным поручением (квитанцией) на счет № 3600631002518 Главного управления Министерства финансов Республики Беларусь по Минской области в ЦБУ №625 филиала №500 Минского управления ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Узда, МФО 153001601, УНП 600537220, код платежа – 04901.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: **г. Узда, ул. Советская, 22, кабинет 206, с 8[00] до 17[00] по рабочим дням по 29 июля 2015 года включительно.**

Участники аукциона должны представить следующие документы:

- заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;
- документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка;
- копию документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);
- представителем гражданина – нотариально заверенную доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан представляют документ, удостоверяющий личность.

Заключительная регистрация – с 8[30] до 9[45] в день проведения аукциона.

Аукцион состоится по каждому лоту при наличии не менее двух участников.

Оплата победителем за предмет аукциона производится разовым платежом путем безналичных расчетов.

Победителю за предмет аукциона необходимо произвести возмещение фактических расходов по организации и проведению аукциона и подготовке документации для его проведения.

Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельными участками, которые предлагаются для продажи на аукционе, путем выезда к месту нахождения этих участков.

НА АУКЦИОННЫЕ ТОРГИ НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ПОВТОРНО ВЫСТАВЛЯЮТСЯ УЧАСТКИ:

№ лота	Арендодатель	Местонахождение участка	S (га)	Кадастровый номер	Начальная цена (бел. руб.)	Расх. по подгот-ке (кроме расх. на публ-цию извещ.)
Лот №5	Узденский райисполком	г. Узда, ул. Новицкого (№73 по ПДП)	0,1985	625650100001000581	125 617 152	11 982 771
Лот №6	Узденский райисполком	г. Узда, ул. Новицкого (№68 по ПДП)	0,1996	625650100001000582	126 313 267	11 661 815

Целевое назначение участков – для строительства и обслуживания многоквартирного жилого дома (для размещения объектов многоквартирной жилой застройки). Инженерно-техническое обеспечение земельного участка отсутствует. Срок аренды участка – 99 лет.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона возмещает расходы, связанные с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка, и публикацией объявлений об аукционе в средствах массовой информации. Оплата в размере цены продажи объекта (за вычетом задатка) производится в течение 10-ти рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: **г.Узда, ул. Советская, 22, кабинет 206, с 8[00] до 17[00] по рабочим дням по 29 июля 2015 года включительно.**

Участники аукциона должны представить следующие документы:

- заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;
- документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц представляют документ, удостоверяющий личность, а также копии документов о государственной регистрации ИП, юридического лица, копии учредительных документов, представителем или уполномоченным должностным лицом – нотариально удостоверенная доверенность (для уточнения правильности оформления необходимого пакета документов обращаться по телефону 8 (01718) 65338).

Задаток в размере 10 процентов от начальной цены земельного участка перечисляется путем безналичных расчетов платежным поручением (квитанцией) на счет 3600631002518 Главного управления Министерства финансов Республики Беларусь по Минской области в ЦБУ №625 филиала №500 Минского управления ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Узда, МФО 153001601, УНП 600537220, код платежа на право заключения договора аренды земельного участка – 04002. Граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Аукцион состоится по каждому лоту при наличии не менее двух участников.

Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельными участками, которые предлагаются для аренды на аукционе путем выезда к месту нахождения этих участков.

Более подробная информация об аукционах, условиях участия размещена на официальном сайте Узденского районного исполнительного комитета: **www.uzda.minsk-region.by**, либо по телефонам **(801718) 65404, 54705, 65338.**

ВЫЙСЦЕ АДНО — ЦВЯРОЗАСЦЬ

ФІЗІКА І ПСІХІКА

— Якім чынам залежнасць ад алкаголю ўплывае на здароўе хворага? Што пачынае пакутаваць у першую чаргу — фізіялогія ці псіхіка?

Сяргей МАЛОЧКА:

— Хранічны алкагалізм — у першую чаргу душэўнае захворванне, пры якім уся псіхіка пачынае арыентавацца толькі на адзін інтарэс, а менавіта здабыванне і ўжыванне алкаголю. Але не бывае так, каб у чалавека з такой псіхічнай залежнасцю не было яшчэ і саматычных паталогій.

— Чаму так складана заклікаць алкаголіка да лячэння? Дый ці трэба заклікаць, дапамагаць?

Сяргей МАЛОЧКА:

— Дапамагаць такому чалавеку неабходна як мага раней — гэта актуальна для любога захворвання. У выпадку з алкагалізмам усё ўскладняецца тым, што ніхто з алкаголікаў не лічыць сябе хворым, а значыць, рана выявіць і пачаць лячэнне амаль нерэальна. Але «працаваць» з алкаголікам трэба. Нельга чакаць той стадыі, калі медыцына акажацца бяссільнай ці пакуль алкаголік раптоўна загіне.

Уладзімір ІВАНОЎ:

— Пры алкагалізме спрацоўвае мноства псіхалагічных абарон, захворванню ўласціва аназагназія — адмаўленне самой праблемы. Дарэчы, і з наркатычнай залежнасцю тое ж. Вось свежы прыклад: ужо сем месяцаў я курырую хлопца, які ўжываў спайс. Увесь гэты час мой пацыент знаходзіцца ў рэмісіі, аднак нядаўна прызнаўся: перыядычна ў яго ўзнікае думка, што ён не наркаман і мог бы пакурыць спайс. Вось вам адмаўленне ў чыстым выглядзе! Залежнаму заўсёды патрабуецца нейкае асаблівае намаганне для прызнання сваёй залежнасці. Прычым з алкаголем усё яшчэ складаней, чым, напрыклад, з наркотыкамі. Усё ж такі наркотыкі знаходзяцца пад забаронай, гэта, можна сказаць, крымінальная залежнасць, а алкаголь у нашым грамадстве — абсалютны «сябар» у кожным доме! Ён — на кожным кроку, налівай ды выпівай! І гэта вельмі добра замацавана ў нашай свядомасці: калі ў прынцыпе можна, то чаму мне нельга?

«Алкаголіку сапраўды трэба стварыць самыя невыносныя ўмовы, каб ён хоць бы задумаўся аб сваім ратаванні. З такім чалавекам можна размаўляць толькі ў самай катэгарычнай форме».

ДАМОЎ НЕ ПРЫХОДЗЬ!

— Атрымліваецца, залежны не здольны самастойна прыняць рашэнне аб неабходнасці лячэння?

Уладзімір ІВАНОЎ:

— Здольны пры адной умове — з'яўленні неверагоднага душэўнага болю... Фізічнага болю, як і смерці, алкаголік не баіцца. Я кажу пра спецыфічны псіхалагічны боль, звязаны з канфрантацыяй унутры асобы. Такі боль можа быць звязаны са стратай чагосьці важнага канкрэтна для гэтага чалавека, напрыклад, зменай сацыяльнага становішча... Паталагічнае жаданне выпіць настолькі магутнае, што перад ім адступае ўсё. Таму мы і кажам сваякам: дайце алкаголіку як мага хутчэй перажыць гэты боль! Адзін чалавек з рэмісіяй каля сарака гадоў прыгадвае, як яго жонка аднойчы не адчыніла яму дзверы. Яна гэтым дала зразумець, што п'яным ён ёй не патрэбны, і толькі так уратавала яго.

У нашай краіне на наркалагічным уліку — каля 200 тысяч хворых на алкагалізм, і гэта лічба не мяняецца, па меншай меры, гадоў трыццаць. Галоўным чынам пад увагу нарколагаў трапляюць людзі з 2-й стадыяй алкагалізму, з абстынентным сіндромам. А дзе ж 1-я стадыя? Алкагалізм — не грып, ён не развіваецца за адну ноч. Каб стаць алкаголікам, трэба яшчэ пастарацца... А мы, медыкі, бачым ужо тых, хто дасягнуў дна. Калі чалавек толькі ўваходзіць у залежнасць, яго становішча можа нават палепшыцца, усё ж такі алкаголь — выдатная «сацыяльная змазка». На пачатку і будучаму хвораму, і яго блізкім сітуацыя не падаецца страшнай, так што як мага раней наўрад ці нехта будзе звяртацца па дапамогу.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Уладзімір ЯНЧУК:

— У сучаснай псіхалогіі погляд на праблему неадназначны. Мне падаецца, што вялікае значэнне мае менавіта сацыяльная дэградацыя чалавека. Мы вельмі залежым ад тых, хто побач. Той, хто толькі пачынае ўцягвацца, або той, хто ўжо ў рэмісіі, азіраецца навокал і задае сабе пытанні: чым я адрозніваюся ад іншых, чаму мне нельга? Вельмі важна стварыць такі асяродак, у якім можна будзе прыняць рашэнне не выпіваць. Праблема залежнага чалавека часта звязана менавіта з яго сацыяльным акружэннем, якое правакуе і ўсяляк спрыяе «зрыву». Грамадства абавязана стварыць умовы, у якіх будзе, па меншай меры, цяжка выпіваць. А пакуль што наша бытавая культура цесным чынам звязана з ужываннем алкагольных напояў. Насельніцтва па-ранейшаму мала ведае аб праблеме і нават угаворвае напіцца, прымушае зрабіць гэта...

«Я думала, што вось мой бацька — той дакладна алкаголік, бо піў моцна, да «адключкі», быў агрэсіўным. Але муж не такі... Спецыялісты дапамаглі асэнсаваць, што «такі».

АЛЯКСЕЙ:

— У нашу садружнасць алкаголік трапляе фактычна ў апошнюю чаргу. Да гэтага ён шукаў выйсце ў аддзяленні наркалогіі, звяртаўся да псіхолагаў, псіхатэрапеўтаў для «кадзіравання»...

Гэта чыстая праўда, што алкаголік заўсёды шукае свабоду для таго, каб працягваць ужываць. Пакуль у яго ёсць такая свабода — дазваляе праца, сям'я і сябры, ён будзе шукаць бутэльку і абавязкова яе знойдзе. Праўда і тое, што алкаголіку сапраўды трэба стварыць самыя невыносныя ўмовы, каб ён хоць бы задумаўся аб сваім ратаванні. З такім чалавекам можна размаўляць толькі ў самай катэгарычнай форме: «Пі, але больш да мяне не прыходзь!». Нават калі вашага блізкага збіраюцца накіраваць у лячэбна-працоўны прафілакторый або яму пагражае суд, ён павінен прайсці праз гэта, бо гэта і будзе пачаткам яго лячэння. Калі блізкія пачынаюць «абараняць» алкаголіка, спачуваць, прыкрываць, верыць яго падманным абяцанням — нічога добрага не будзе. Алкаголік жыве ў поўным самападмане і адмаўленні праблемы, і ён абавязкова адшукае ў сваёй свядомасці зачэпкі для патурання залежнасці: я ж яшчэ не такі, як сусед, што пад заборам ляжыць... Калі свабода заканчваецца, вось тады алкаголік можа пачаць пошук ратавання.

ПРОСТА... БІЗНЕС

— Што неадкладна павінна зрабіць грамадства ў барацьбе з алкагольнай праблемай?

Сяргей МАЛОЧКА:

— У глабальным сэнсе дзяржава павінна дапамагаць сваім грамадзянам. На жаль, дэкларуецца сёння адно, што здароўе з'яўляецца найвялікшай каштоўнасцю беларускага грамадства, а на практыцы маем 11 працэнтаў таваразвароту, звязанага з вытворчасцю і рэалізацыяй алкагольных напояў. У нас ёсць наркадыспансеры, грамадскія аб'яднанні, урачы-псіхолагі, псіхатэрапеўты, нарколагі, нават лячэбна-працоўныя прафілакторыі, аднак многае ў нас непаслядоўнае, не ўзаемазвязана паміж сабой. Хто, напрыклад, аналізаваў, колькі чалавек пасля так званага лячэбна-працоўнага прафілакторыя прыйшло да цвярозага жыцця? Які гэта наогул прафілактарый, тым больш лячэбны? Гэта проста ізаляцыя ад грамадства, і ўсё.

Уладзімір ІВАНОЎ:

— Чалавек ужываў і будзе ўжываць тое, што яму цалкам даступна. Алкаголь даступны. Захацеў — выпіў. Менавіта таму за рэдкім выключэннем у нас ужывае алкаголь фактычна ўсё насельніцтва. На шчасце, не ўсе становяцца алкаголікамі, паводле розных падлікаў, ад 5 да 12 працэнтаў дарослага насельніцтва, але і гэта пагражае велізарнымі стратамі — людскімі, матэрыяльнымі... Задача дзяржавы — праводзіць прафілактыку сярод тых, хто падрастае, і трымацца пазіцыі сацыяльнай справядлівасці. **Будзе цалкам справядліва, калі вытворцы і прадаўцы алкаголю пачнуць дзяліцца сваім прыбыткам, дапамагаючы дзяржаве вырашаць праблему наступстваў алкагольнай залежнасці.** Прыватны капітал трэба таксама абавязваць плаціць за гэтыя наступствы. Прыкладна 1 млрд долараў у год асядае ў кішэні вытворцаў і прадаўцоў алкаголю... Вось пакуль у продажы не было такой колькасці піва, у нас не было і хворых на піўны алкагалізм, пакуль не было такой колькасці гульнявых клубаў, то і залежных ад такога баўлення часу не было... Прыходзіць прыватны капітал — і з'яўляецца праблема. Між тым, у краінах Скандынавіі вытворцы і прадаўцы алкаголю плацяць за аказанне дапамогі тым, хто стаў ахвярай іх паспяховага бізнесу.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ТАКСАМА ЧАЛАВЕК

— Што рабіць ці не рабіць сваякам алкаголіка?

ВІКТОРЫЯ:

— Неяк я трапіла на семінар, прысвечаны тэме залежнасцей, паслухала нарколага, псіхолага і прыйшла да высновы, што жыву з алкаголікам. Доўгія гады мне здавалася, што ў майго мужа няма праблемы з алкаголем. Бо ён не ляжаў пад агароджай, не лаяўся, не абражаў... Я думала, што вось мой бацька — той дакладна алкаголік, бо піў моцна, да «адключкі», быў агрэсіўным. Але муж не такі... Спецыялісты дапамаглі асэнсаваць, што «такі», і расказалі пра садружнасць Ал-Анон.

Я пачала наведваць сходы садружнасці. Так паступова прыйшло асэнсаванне новай важнай тэмы: мая роля ў залежнасці мужа. Сёння я выдатна разумею, што мне трэба навучыцца жыць так, каб не правакаваць блізкага чалавека, не ўмешвацца ў яго жыццё, жыць не яго, а ўласным жыццём! Аказваецца, сваякі здольныя «падсаджваць» сваіх пітушчых блізкіх «на шклянку» — жонка злуецца, крытыкуе, абражае, прыніжае, а хворы п'е ад гэтага яшчэ больш, нібы назло.

Дзякуючы праграме «Дванаццаць крокаў», таму, што я ўжо ведаю пра гэтае захворванне, зразумела, якая я ёсць, што магу, навошта жыву... У сузалежнага (дарэчы, у Ал-Анон не прынята карыстацца такім словам) псіхалагічная праблема, можа, яшчэ большая, чым у самога залежнага: апошняму дастаткова «ўсяго» адставіць шклянку, а таму, хто побач, трэба нешта рабіць з адмоўнымі эмоцыямі, якія ніяк не адставіш.

ВОЛЬГА:

— Я дачка, жонка і сястра алкаголікаў. Выраслa ў сям'і, дзе быў вельмі агрэсіўны, жорсткі бацька. Таму рана выйшла замуж, каб уцячы ад гэтага. Муж прыгожы, разумны... І раптам я заўважаю, што ён выпівае не так, як усе... Вядома, пачала жыць толькі адной ідэяй — ратаваць, хоць ніякіх станоўчых эмоцый у дачыненні да п'яных людзей у мяне не было. Пакуль я не стала наведваць сходы груп садружнасці Ал-Анон, я наогул не бачыла ў алкаголіках людзей, для мяне гэта былі бязвольныя істоты, не вартыя ні жалю, ні спачування. Я нават пераходзіла на іншы бок вуліцы, калі бачыла чалавека нападпітку.

Толькі наведваючы адкрытыя сходы Ананімных Алкаголікаў, я ўбачыла, што алкаголік — таксама чалавек... Бацька, брат і муж раптам перасталі здавацца мне пачварамі. Раней я спадзявалася, што паміж сям'ёй і выпіўкай муж павінен выбраць сям'ю, і паставіла ўмову: каб ён не прыходзіў дадому, калі напіваецца. Ён і не прыходзіў. Проста недзе піў і жыў, пакуль быў у запоі. Дома не піў ніколі. Так цягам дванаццаці гадоў сын нават не здагадваўся, якія праблемы ў яго бацькі...

АЛ-АНОН — ГЭТА...

...садружнасць сваякоў і сяброў алкаголікаў, якія лічаць, што на іх паўплывала п'янства блізкіх. Мэта такога аб'яднання — дапамагчы людзям з падобнай праблемай. Членства бясплатнае і ананімнае.

ТЭЛЕФОН ДЛЯ ЗВАРОТУ: +375 29 550 54 24 (з 20.00 да 22.00)

Гадамі ўва мне назапашвалася нянавісць, злосць. Нават не ведаю, што было б са мной, калі б не размовы ў маёй групе. Вось ужо дзесяць гадоў я вучуся быць з алкаголікам і перамагаць свае «дрэнныя» пачуцці.

— Можа быць, варта проста ўвогуле разыходзіцца з ім у такой сітуацыі?

АЛЯКСЕЙ:

— Гэта не заўсёды магчыма. Некага трымае каханне, іншага — кроўнае сваяцтва. У любым выпадку трэба вучыцца жыць побач з алкаголікам. Сузалежны абавязкова знойдзе сабе новага залежнага, а залежны — новага сузалежнага. Уцякаць ад праблемы няправільна. Лепш разумець, што алкаголіка заўсёды суправаджаюць раздражняльнасць, незадаволенасць і неспакой. Чалавек адчувае сябе непаўнацэнным і адзінокім. Гэта асноўнае, і гэта незалежна ад узросту, полу і г.д. ставіцца адзін да аднаго. Каб як мага раней дапамагчы чалавеку. Гэта ж з нашай маўклівай згоды ў некага развіваецца 2-я стадыя алкагалізму. А куды мы глядзелі, калі гэта была толькі 1-я?

ЗАШМАТ ІНФАНТЫЛІЗМУ

— Што можна параіць усім нам у перамаганні ўласцівай нашаму грамадству алкагольнай залежнасці?

Сяргей МАЛОЧКА:

— Некаторыя алкаголікі не ідуць па дапамогу не таму, што яшчэ не дасягнулі свайго дна. Яны проста абсалютна не самастойныя. І, дарэчы, гэта магло паўплываць на развіццё іх згубнай залежнасці — яны глядзелі на нейкага «лідара» і рабіліся падобнымі да яго. Пасля такіх прыводзіць у дыспансер мама і гоголь, што гэта шкодна. Пэўная частка маладых людзей прыслухоўвацца да іх.

Прафілактыку наогул немагчыма ўявіць без прапаганды — трэба паказваць, колькі цікавых рэчаў ёсць у свеце. Ёсць жа сярод нас такія, хто здольны будаваць стасункі, размаўляць без чаркі на стале. Дык давайце паказваць такія прыклады! І давайце з большай зацікаўленасцю будзем

«Алкаголь у нашым грамадстве — абсалютны «сябар» у кожным доме! Ён — на кожным кроку, налівай ды выпівай! І гэта вельмі добра замацавана ў нашай свядомасці: калі ў прынцыпе можна, то чаму мне нельга?

Для некаторых алкаголікаў біялагічны момант з'яўляецца вырашальным. Заўважана, што дзеці з прыроджанай псіхапатыяй — сур'ёзным пашкоджаннем цэнтральнай нервовай сістэмы — схільныя ўжываць алкаголь, каб «лячыць» гэтае сваё псіхічнае захворванне. Тое ж можна сказаць адносна дэпрэсіі. Людзі выпіваюць, каб пазбавіцца ўнутранага дыскамфорту, абумоўленага іншым псіхічным захворваннем. Гэта адносіцца прыкладна да кожнага дзясятага залежнага ад алкаголю. У такіх сітуацыях важна своечасова выяўляць і лячыць прыроджаныя паталогіі.

ВОЛЬГА:

— У Ал-Аноне я пачула гісторыю жанчыны, якой удавалася карміць траіх дзяцей і рабіць так, каб мужу-алкаголіку, які не прыносіў грошай, не даставалася абсалютна нічога. На яго пытанне, ці ёсць дома ежа, яна адказвала: «Ёсць чай, няма заваркі». Яна выганяла яго з дому, і гэта ўрэшце прывяло да таго, што вось ужо 20 гадоў ён выбірае цвярозасць...

Аднойчы дадому пазваніў начальнік майго мужа, каб спытаць, у якой бальніцы ён ляжыць, ці можна яго наведаць. І я тады ўпершыню адкрыта сказала: ён не ў бальніцы, у яго запой — перастала хаваць праблему... У Ал-Аноне цябе ніхто не прымушае нічога расказваць, ты можаш называць сябе любым імем. Аднак нехта іншы абавязкова будзе штосьці расказваць пра сябе, і аднойчы ў цябе таксама можа ўзнікнуць патрэба падзяліцца з прысутнымі сваёй гісторыяй. Гэта вельмі карысна. Чужыя гісторыі рашучасці дапамагаюць і табе стаць больш рашучым. Вопыт іншых людзей надае сіл і ўпэўненасці, навучае не перацягваць на сябе адказнасць іншага чалавека. Нельга стварацьалкаголіку ўмовы для таго, каб ён спакойна працягваў піць, гэта добра, калі ў яго не будзе працы, грошай, сяброў — садружнасць дапамагае табе гэта ўсвядоміць, трымацца, а не тануць разам з залежным.

ВІКТОРЫЯ:

— Калі вы бачыце перад сабой алкаголіка, то павінны разгледзець у ім не слабую волю, а чалавека. Хворага чалавека. Для гэтага я працую па праграме «Дванаццаць крокаў», якая цалкам падыходзіць і сваякам алкаголіка, наведваю сходы Ал-Анон, вучуся там праўдзівасці, а заадно сваім вопытам дапамагаю іншым сваякам алкаголікаў.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

АЛЯКСЕЙ:

— Ананімныя Алкаголікі дапамагаюць не толькі тым, што выступаюць у СМІ, расказваюць пра сябе, але мы наведваем непасрэдна наркалагічныя аддзяленні, дзе расказваем пацыентам аб сваім вопыце цвярозага жыцця, кажам, што існуе рашэнне праблемы. Мы дагэтуль сутыкаемся з тым, што людзі мала ведаюць аб праблеме. Нехта прыходзіць адразу, як толькі пачуў пра нас, іншыя — праз некалькі гадоў... Адзін з самых важных момантаў у руху Ананімных Алкаголікаў — перадача вопыту іншым, падтрымка адзін аднаго, што магчыма якраз дзякуючы духоўнай праграме «Дванаццаць крокаў». Гэта ёсць штодзённая работа над самім сабой, работа, у якой самае важнае — застацца цвярозым сёння.

«Дэкларуецца сёння адно: здароўе з'яўляецца найвялікшай каштоўнасцю беларускага грамадства, а на практыцы маем 11 працэнтаў таваразвароту, звязанага з вытворчасцю і рэалізацыяй алкагольных напояў».

Уладзімір ЯНЧУК:

— Мне даводзіцца шмат ездзіць па свеце, і ў розных краінах Захаду і Усходу я бачу дастаткова прыкладаў таго, наколькі адказна людзі ставяцца да ўласнага жыцця, захавання здароўя, наколькі старанна працуюць, разлічваючы ў першую чаргу на свае сілы. Той жа японец працуе па 10 гадзін у суткі 6 дзён на тыдні. А ў нас па-ранейшаму многа ўпэўненых у тым, што нехта павінен даць, забяспечыць, вылечыць... Але гэта мы самі павінны сабе — працаваць над уласнай самастойнасцю, над пачуццём уласнай годнасці. Адно нядаўняе цікавае даследаванне-назіранне паказала, што адчуванне болю прымушае беларусаў спадзявацца на лекі і Бога, а вось іранцы, напрыклад, спадзяюцца выключна на сябе.

Уладзімір ІВАНОЎ:

— Свет вельмі разнастайны, і я талерантна стаўлюся да ўсяго, што дапамагае адным і не шкодзіць іншым... Спрацаваць у лячэнні залежнага можа і «падшыўка», і «кадзіраванне». Асабіста я такімі метадамі не карыстаюся, бо гэта, хутчэй, парамедыцына, але галоўнае, каб працавала. Добра, што працягвае развівацца рух Ананімных Алкаголікаў. 25 гадоў таму я асабіста запрашаў у нашу краіну амерыканскіх калег — роданачальнікі таварыства Ананімных Алкаголікаў менавіта амерыканцы... Працэс укаранення такога кшталту дапамогі залежным людзям ішоў вельмі цяжка, але гэта варта было зрабіць, як мы бачым сёння.

Сяргей МАЛОЧКА:

— Назва захворвання — хранічны алкагалізм — кажа сама за сябе. **Захворванне нельга вылечыць у тым сэнсе, што такі хворы ніколі не зможа піць, як няхворы, яму нельга ўжываць ні келіха віна, ні лыжкі гарэлкі. Адзінае выйсце — усё далейшае жыццё захоўваць абсалютную цвярозасць.** А вось гэта цалкам магчыма. Можна звяртацца дзеля гэтага ў наркадыспансер, цэнтр псіхічнага здароўя, наведваць групы ў садружнасці Ананімных Алкаголікаў і г.д. Можна і самастойна спрабаваць «завязаць». Галоўнае — ісці па шляху цвярозасці штодня.

Дзяржава са свайго боку не павінна трымацца фармальнага падыходу. Кожны пакрысе ў нас робіць сваю справу, аднак пакуль яшчэ няма комплекснай працы. Грамадства не бачыць у хворым той рэсурс, на аснове якога цалкам магчыма пачаць новае жыццё. На Захадзе ў кожным работніку бачаць «рэсурс». Там вялікую ўвагу надаюць захаванню здароўя кожнага работніка, таму што гэта падрыхтаваны спецыяліст, а падрыхтоўка каштуе дорага. Падлячыць, падтрымаць здароўе гатовага спецыяліста значна танней, чым падрыхтаваць новага чалавека яму на замену. А таму дзейнічае пэўная сістэма стымулявання і заахвочвання. Больш за тое, на сумесных карпаратывах з ужываннем алкагольных напояў асобныя работнікі назіраюць за тымі, хто можа быць аднесены да «групы рызыкі», каб своечасова зрабіць высновы і пачаць працаваць з такімі людзьмі. Акрамя таго, сама страхавая медыцына вельмі добра стымулюе людзей клапаціцца пра сябе, а ў нас размовы зводзяцца, галоўным чынам, да таго, што ўрачы абавязкова дапамогуць і ўратуюць. Яно, вядома, так, але без жадання саміх пацыентаў нічога не адбываецца.

Святлана БАРЫСЕНКА.

protas@zviazda.by

АНАНІМНЫЯ АЛКАГОЛІКІ — ГЭТА...

...садружнасць, што аб'ядноўвае мужчын і жанчын, якія дзеляцца паміж сабой сваім вопытам, сіламі і надзеямі з мэтай дапамагчы сабе і іншым пазбавіцца ад алкагалізму.

Адзіная ўмова для членства — жаданне кінуць піць. Члены АА не плацяць узносаў, яны самі падтрымліваюць сябе добраахвотнымі ахвяраваннямі. АА не звязаны з сектамі, веравызнаннем, палітычнымі арганізацыямі і ўстановамі, не ўступаюць у палеміку, не падтрымліваюць і не выступаюць супраць каго-небудзь. Галоўная мэта АА — заставацца цвярозымі і дапамагаць іншым алкаголікам захоўваць цвярозасць.

Пункт першы з дванаццаці крокаў АА гучыць так: «Мы прызналі сваё бяссілле перад алкаголем, прызналі, што страцілі кантроль над сабой».

ТЭЛЕФОНЫ ДЛЯ ЗВАРОТУ: +375 17 206 79 14, +375 29 276 83 17, +375 44 780 73 29. *aabelarus.org*

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ЧУП «МАВ-Недвижимость» (продавец) проводит открытый аукцион

ПО ПРОДАЖЕ ТОРГОВОГО ПОМЕЩЕНИЯ, наименование – изолированное помещение № 2

общей площадью 457,4 кв.м (инв. № 630/D-41119). Имущество расположено по адресу: Минская область, г. Молодечно, ул. Язэпа Дроздовича, 1-98. Объект находится в залоге (ипотеке). После реализации имущества продавец обязуется исполнить обязательства перед банком для снятия обременения.

Начальная цена с НДС – 2 472 000 000 бел. руб.

Задаток 10% от начальной цены (247 200 000 бел. руб.), перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015 государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня проведения, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в размере 1 (один) процент от окончательной цены продажи предмета аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **28.07.2015 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **27.07.2015** до **16.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224-61-34, (8029) 102-21-17.

РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки»

извещает о проведении открытого аукциона по продаже объектов недвижимости –

ЗДАНИЯ СКЛАДА И АСФАЛЬТОВОЙ ПЛОЩАДКИ,

расположенных по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Советская, 157А, принадлежащих Открытому акционерному обществу «Электроаппаратура» на праве собственности

В состав лота входит: **здание склада,** инв. №350/С-163380. Одноэтажное кирпичное строение, 1938 года постройки, реконструкция 1990 г. Общая площадь 349,3 м.кв.; **асфальтовая площадка** – часть основного средства «Асфальтовое покрытие тракт 180а/двор 270», площадь 195,0 м.кв.

Земельный участок *для эксплуатации и обслуживания здания на праве аренды площадью* ***0,0667 га.*** *с кадастровым номером 340100000002005475.* ***Договор аренды земельного участка*** *сроком по 28.02.2048 г. с ГУ Администрация СЭЗ «Гомель-Ратон». Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.*

Начальная цена – 630 000 000 бел. руб. (в т.ч. НДС 20%). **Задаток – 50 000 000 бел. руб.** (в т.ч. НДС 20%)

Аукцион состоится 28 июля 2015 г. по адресу: г. Гомель, ул. Артема, 23. Начало в 11^{00}. Шаг аукциона – 5%.

Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов.

Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2-6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 27 июля 2015 г. включительно.** Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать лица, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявленному лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 09.00 до 11.00 **28 июля 2015 г**. Допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников.

Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с 3012230570008 в ЗАО «Альфа-Банк», код 153001270. Получатель платежа – РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки». УНП 490318588. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 27 июня 2015 г.

Победителем торгов признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить объекты.

Победитель торгов (лицо, приравненное к победителю) обязан: в течение 3-х рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона в размере два процента от цены продажи лота, сформированной в установленном порядке; в течение 15-ти рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи объектов; в сроки согласно заключенному договору купли-продажи выплатить Продавцу стоимость объектов, сформированную в установленном порядке. Если между Продавцом и Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи Объектов, не достигнута договоренность по срокам и порядке оплаты за Объекты, такая оплата должна быть произведена в течение 30-ти календарных дней с даты проведения аукциона. Подробную информацию можно узнать у Организатора торгов по нижеуказанным телефонам и на сайте **www.gino.by**.

Организатор: РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артема, 23. ☎ 8 (0232) 70-46-47; 74-99-76 • Продавец: ОАО «Электроаппаратура», 6. ☎ 8 (0232) 57-91-13; 8 (029) 657-01-42 •

Наш культурны асяродак

ЖЫРАНДОЛЯ

Выпуск № 22 (279)

■ Імпрэза

Нясвіжскі палац як найлепшая дэкарацыя

Вялікі тэатр закрывае сезон на адкрытым паветры

Чаму эліта аддае перавагу такім жанрам, як опера і балет? Так склалася гістарычна, можна сказаць. У тым ліку і ў Беларусі, дзе сапраўды заможныя магнаты мелі пры двары свае тэатры. Быў тэатр і ў Радзівілаў, дзе ставіліся і оперы, і балеты. Таму калі Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Беларусі ладзіць закрыццё сезона ў сценах палаца ды ў яго ўнутраным двары — гэта насамрэч цудоўная даніна беларускай гісторыі. Але і прарыў для сучаснасці: фактычна першы open-air класічнага мастацтва ў Беларусі, а ў свеце гэты напрамак ужо даволі папулярны. У тым ліку і з-за таго, што жанры оперы і балета ў наш час запатрабаваныя публікай не аднаго сацыяльнага статусу і фінансавага дастатку, яны для ўсіх, хто любіць прыгожую музыку, спевы і харэаграфічнае мастацтва. І ў Беларусі ёсць людзі, якія гатовыя ехаць у Нясвіж, каб на адкрытым паветры, у гістарычным антуражы далучацца да высокага. Між іншым, «Вечары Вялікага тэатра ў замку Радзівілаў» даказваюць гэта не першы раз. І палацава-замкаваму комплексу ў Нясвіжы добра: ёсць магчымасць стварыць вакол помніка гісторыі сапраўднае жывое культурнае асяроддзе.

З гэтага сёлета ўсё і пачалося ў пятніцу днём: з вяртання ў мінулае праз музыку, якая калісьці гучала на нашых землях. У Нясвіжскім касцёле Божага Цела ў пятніцу адбыўся канцэрт харавой музыкі. Месца зусім не выпадковае: насамрэч у праграму хору тэатра пад кіраўніцтвам народнай артысткі Беларусі Ніны Ламановіч трапілі творы, якія маюць дачыненне менавіта да Нясвіжа і яго касцёла. І тут варта ўзгадаць два імені. Першае — Антоній Радзівіл, прадстаўнік славутага магнацкага роду, які пісаў музыку, нават быў аўтарам оперы «Фауст» паводле лібрэта самога Гётэ. Другое — Эдвард Гірдо. Таямніцу гэтага імя адкрыў нотны архіў Нясвіжскага касцёла, частка якога была перададзена ў Нацыянальную бібліятэку Беларусі. У архіве былі рукапісы твораў Гірдо, які быў у касцёле арганістам і кіраўніком хору ў XX стагоддзі (паміж дзвюма сусветнымі войнамі). Канцэрт у касцёле вяртае якраз да той музыкі, якая гучала менавіта ў гэтым месцы.

Пятніца, вечар. Чараўніцтва балета. Два спектаклі славутай трупы Дзягілева «Рускія сезоны» ў харэаграфіі Міхаіла Фокіна, створаныя на пачатку XX стагоддзя, ідуць у нашым тэатры. У Нясвіж прывезлі прэм'еру сезона «Жар-птушку» Ігара Стравінскага. Але ў пары з ім балет Рымскага-Корсакава «Шахеразада». На тэатральнай сцэне і ў Нясвіжы гэта ўсё ж розныя спектаклі — перш за ўсё таму, што на адкрытым паветры ў дворыку палаца яны ўспрымаюцца як казкі, блізкія да рэальнасці.

Але што цалкам рэальнае, дык гэта спевы ў самім палацы, як гэта было калісьці. У тэатральнай зале Таццяна Трацяк будзе спяваць пра каханне. Дапаможа струнны квінтэт «Серанада». Субота, дзень.

Доўга сядзець у чаканні пасля не прыйдзецца, палац жа вялікі. А ў кошт квіткоў уваходзяць «бонусы» ад музея-запаведніка. Напрыклад, можна наведаць выставу, прысвечаную 175-годдзю Марыі Дароты дэ Кастэлян Радзівіл, цудоўнай жанчыны, якая мела дачыненне да арганізацыі цудоўнага парку. А калі патрэбна яшчэ больш рамантыкі, то варта завітаць на выставу ліхтароў, лямпаў, падсвечнікаў. Наогул у Нясвіжы ёсць што паглядзець, перш чым настроіцца на оперу. «Паяцы» Леанкавала — той твор, які дае магчымасць адчуць жыццё людзей тэатра, страсці, якіх яны не пазбаўленыя, як і звычайныя людзі. Гэтую пастаноўку Міхаіла Панджавідзе (дарэчы, таксама прэм'ера сезона!) можна назваць адной з самых удалых, канцэптуальных і стылёва вытрыманых у нашым оперным тэатры. Да таго ж гэтая опера якраз з тых, калі разумееш: опера — мастацтва для ўсіх. І запрошана «зорка» спецыяльна для Нясвіжа: дырыжор, народны артыст Азербайджана Ялчын Адзігезалаў.

А вось у нядзелю ўдзень — фактычна гістарычная сенсацыя. У тэатральнай зале Радзівілаў упершыню (у наш час) будуць паказаны дзве камічныя оперы XVIII стагоддзя «Служанка-пані» (Д. Пергалезі) і «Капельмайстар» (Д. Чыморозa). Лёгкія, з гумарам. Як жа пашчасціць тым, хто гэтыя прэм'еры ўбачыць у гэтай зале, дзе XVIII стагоддзе не трэба стварaць штучна!

І самае неверагоднае, што пакажа Вялікі тэатр: гала-канцэрт вечарам нядзелі. Дзіўны не сам па сабе гала-канцэрт, у якім прымаюць удзел найлепшыя артысты оперы і балета: такіх праграм тэатр складае шмат. Але цяпер оперныя артысты будуць спяваць песні. Любімыя песні ваенных гадоў, якія ўвайшлі ў праграму «Лісты з фронту». Яе ўпрыгожаць нумары артыстаў балета, удзел хору. Гэта прысвячэнне тэатра 70-годдзю Перамогі. У гонар яе звычайна бывае салют.

Хто яшчэ не зразумеў, чаму ў гэтыя дні варта наведаць Нясвіж?



■ Дзеля памяці

70 гадоў 1945-2015 Вялікай Перамогі

КНІГІ, ЯКІЯ ВЫМЯРАЮЦЦА ЛЁСАМІ

У сумны памятны дзень пачатку Вялікай Айчыннай вайны, праз 70 гадоў пасля Перамогі, нагоду для сустрэчы даюць кнігі. Тых, хто пісаў і піша пра вайну, хто яе перажыў і гатовы расказаць пра тое, які гэта быў час і за кошт чаго нашым суайчыннікам ўдалося яго перажыць і выжыць. У гэты дзень у сталічнай бібліятэцы імя Францішка Багушэвіча звычайным наведвальнікам пра вайну распавядалі пісьменнікі і кнігі.

Пісьменнікі і аўтары, якія памятаюць вайну, працягваюць летапіс тых падзей ужо з пазіцыі цяперашняга часу. Напрыклад, была прадстаўлена кніга літаратуразнаўца і пісьменніка Міхася Тычыны «Народ і вайна». Выдавецтва «Чатыры чвэрці» адзначылася некалькімі кнігамі з серыі «Дзеці вайны»: «Хлеб для партызанаў» Міхася Пазнякова і «Няма даравання вайне» Ніны Галіноўскай.

Але самыя неацэнныя сведчанні — тых, хто быў у віры падзей, на перадавой, асабіста набліжаў перамогу. «Я раскажу вам пра вайну», — уцягвае ў дыялог пакаленняў дакументальны фільм (рэжысёр Сяргей Ісакаў), у якім сваімі ўспамінамі дзеліцца Васіль Быкаў. Той пісьменнік, без звароту да якога наогул гэтую тэму абмяркоўваць у Беларусі немагчыма. Але, каб пазнаёміцца з яго творчасцю бліжэй, трэба пачытаць яго творы. Каб іх глыбей зразумець, варта адчуць Васіля Быкава як асобу. Дзеля гэтага ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры працуе літаратурна-дакументальная выстава паводле апошняй кнігі, якая выйшла пры жыцці пісьменніка: «Васіль Быкаў. Доўгая дарога дадому...» Гэта была дарога, даўжынёй у цэлы лёс

■ Ведай нашых!

МОДА СЕЗОНА — ПАД АГІНСКАГА

Беларускі тыдзень у Парыжы пад знакам 250-гадовага юбілею кампазітара

Сёлета менавіта ён — галоўнае імя беларускай культуры ў свеце. Прынамсі, 250-годдзе кампазітара, дыпламата, мецэната, важнай асобы для культуры такіх дзяржаў, як Беларусь, Польшча і Літва, уключана ў спіс памятных дат ЮНЕСКА. У штаб-кватэры ЮНЕСКА 24 чэрвеня адбылася тэатралізаваная вечарына, прысвечаная Міхалу Клеафасу Агінскаму.

Пастаяннае прадстаўніцтва Беларусі пры ЮНЕСКА пастаралася стварыць атмасферу таго часу, калі жыў Агінскі. Госці вечарыны — прадстаўнікі дыпламатычнага корпуса, супрацоўнікі пастаянных прадстаўніцтваў пры ЮНЕСКА, прадстаўнікі французскай грамадскасці — пастараліся адпавядаць яе духу, апрануўшыся ў французскія і беларускія касцюмы XVIII—XIX стагоддзяў ці нацыянальныя строі.

Атмасферу часу дапамаглі стварыць супрацоўнікі музея «Замкавы комплекс «Мір»; выставу, прысвечаную герою мерапрыемства, падрыхтаваў Музей гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Рэспублікі Беларусь. Тэатралізаваны паказ танцавальнага калектыву «Феерыя» ў пастаноўцы беларускага рэжысёра Веранікі Янушэўскай-Алтушац. Як жа без твораў самога юбіляра? Іх прадставіла «Гродзенская капэла».

Пад знакам асобы Міхала Клеафаса Агінскага пачаўся Беларускі тыдзень у Парыжы, у рамках якога — шэраг мерапрыемстваў, якія знаёмяць з гісторыяй і культурай Беларусі, у тым ліку драматычнага XX стагоддзя.

Ларыса ЦІМОШЫК.
tsimoshyk@zviazda.by

■ У рытме сэрца

ПА ВЯСЁЛЦЫ ДА СОНЦА ІШОЎ...

Як адгукаюцца вершы Петруся Броўкі сёння



Пра Петруся Броўку ў мяне з дзяцінства ўражанне як пра паэта, які складае вельмі рытмічныя вершы. Такімі былі тыя творы, што мы чыталі ў школе. Таму вучыць яго вершы на памяць было даволі проста — яны неяк самі ўзнаўляліся, варта было толькі задаць рытм. Прычым гэта тычылася і вершаў, і буйных паэтычных твораў. Чытаў ты верш «Пахне чабор» ці паэму «Голас сэрца» — усё было зразумела, усё на месцы, неяк вельмі проста клаліся словы, а галоўнае, з дакладным сэнсам. Вершы Броўкі дапамагалі атрымліваць добрыя адзнакі па беларускай літаратуры не толькі тым, хто асабліва любіў чытаць. І між іншым, праз іх прыходзіла адчуванне беларускай мовы, у якой так арганічна гучаць рыфмы, дзякуючы якім падкрэсліваецца мілагучнасць слоў. Прынамсі, дзякуючы ў тым ліку гэтаму паэту я зразумела: беларуская мова — гэта так натуральна...

Сапраўды, тады нам абсалютна дакладна было зразумела, чаму Пятрусь Броўка — народны паэт Беларусі, чалавек, узнагароджаны шэрагам прэстыжных (на той час) літаратурных прэмій: Сталінскіх, Ленінскай, таксама беларускіх — імя Я. Коласа, Я. Купалы. Тады мы гэта прымалі як факт асаблівай адзнакі творчасці і імкнуліся зразумець: за што? Адказы зноў-такі знаходзіліся проста. Яны былі растворanыя ў тэматыцы вершаў, дзе ўсё было абумоўлена гістарычна (у залежнасці ад таго, якія часы натхнялі паэта на той ці іншы твор), усё было выверана адпаведна з яго тагачасным светаўспрыманнем. Адказы былі і ў пафасе слоў, і ў эмоцыях, якія перажываў чалавек, калі заўважаў, як мяняецца жыццё вакол яго. І сам таксама мяняўся.

Ці не сацыяльныя змены зрабілі яго паэтам? Дакладна, яны далі яму магчымасці. Таму што якія магчымасці маглі быць у хлопчыка з беднай шматдзетнай сялянскай сям'і, які з дзяцінства быў вымушаны дапамагаць бацькам па гаспадарцы? Праўда, усё ж гэтыя сяляне разумелі, што дзіця павінна вучыцца: царкоўна-прыходская школа дапамагла. Дзякуючы ёй пасля 1918 года падлетак запатрабаваны як пісар ці рахункавод пры важных установах новай улады. А потым яшчэ пачынае пасылаць допісы ў газеты (у тым ліку друкаваўся і ў «Звяздзе»). Вядома, новае жыццё яго натхняла: на пачатку 20-х гадоў мінулага стагоддзя Пятрусь Броўка — актыўны камсамолец. Далей шлях прыводзіць яго ў газету «Чырвоная Полаччына», дзе пачалі друкаваць яго вершы. Вось як ён узгадвае гэты момант: «Не пытайся пра гэта, // Бо адказу не дам. // Як зрабіўся паэтам, // Я не ведаю сам. // Свой радок на паперы // Не чакаў я спаткаць, // Проста сэрца без меры // Захацела спяваць».

Такіх, як ён, каму хацелася спяваць, альбо наогул выказвацца ў паэзіі па-беларуску, было нямала, іх аб'яднаў «Маладняк». Яго сэрца тады, відаць, выпрацоўвала свой рытм, які б пасаваў і новаму жыццю, і перадаваў бы пульсацыю ўласных пачуццяў. Было і тое, і тое. Паэзія, створаная згодна з першым пунктам, адна. Паэзія, адпаведная другому, адчуваецца і адгукаецца зусім інакш. Дзіўна: гэта створана адным чалавекам. Ён мог быць палымяным праваднiком ідэй, які фіксаваў і апяваў змены ў жыцці народа, што адбываліся навокал пад кіраўніцтвам партыі. Моц і сіла, прамата і рашучасць у творах. Відаць, шчыра: змены ж былі. Яго Беларусь мянялася? Так. Па вялікім рахунку, былі надзеі на лепшае (яны дэкларавaліся). Ён мог праверыць дэкларацыі і на сабе — напрыклад, меў магчымасць працягваць адукацыю ў БДУ. Як жа не верыць у магчымасці? А чалавеку заўсёды хочацца верыць у лепшае. Ключавое слова — «верыць» (нават калі нешта можа быць і не так, як здаецца), яно не вымагае сумнення.

І лірыка яго (у тым ліку інтымная) — з думкамі пра шчасце, якое ці ёсць, ці магло б быць, ці чалавека пазбавілі шчасця жыцця. Але тут, дзе чалавек сам-насам з сабой, Броўка больш тонкі, тут калі баліць, то баліць, і ён не баіцца быць у гэтым слабым ці занадта расчуленым. Як у той жа паэме «Голас сэрца», напісанай ужо пасля вайны, якую ён прайшоў як ваенны карэспандэнт, але яшчэ пісаў у гэты час і вершы ваеннай тэматыкі, нават патрыятычную паэму «Беларусь», дзе ўзгадваецца славутая гісторыя Айчыны нават ад Грунвальда і іншых войнаў, калі беларусы даказвалі, што ўмеюць сябе бараніць. Але паэма-плач, паэма — памятнік маці, якая загінула ў канцлагеры, была створана ў 1960-м, калі Броўка паехаў у Асвенцым. Ён жыў некалькі гадоў з адчуваннем незваротнай страты, але сказаць пра яе змог толькі тады, калі ўявіў, што давялося перажыць дарагому чалавеку. У ёй шмат асабістага, сардэчнага. Гэтае асабістае перарастае ў антыфашысцкі пафас: Броўка па натуры, відаць, быў чалавек-грамадзянін. Гэта ад слова «грамадства». У яго разгледзе грамадства — з'ява не толькі сацыяльная, але і палітычная, палітычна выверaная (варта ўзгадаць хаця б паэму «Заўсёды з Леніным»). Ён нібыта сябе ўсяго прапускаў праз сіта грамадскай значнасці, а грамадскую праўду ставіў вышэй за персанальную чалавечую. Можа, таму няпростыя ўмовы існавання айчыннай літаратуры ў 30-я — 40-я гады яго не закранулі. І адразу пасля вайны ён адчуў сваю яшчэ большую запатрабаванасць і як літаратар: вярнуўся кіраваць часопісам «Полымя», потым быў выбраны старшынёй праўлення Саюза пісьменнікаў БССР. Імя Петруся Броўкі сёння носіць дзяржаўнае энцыклапедычнае выдавецтва, якое было створана дзякуючы яго клопату (выданне самой энцыклапедыі было адзначана Дзяржаўнай прэміяй БССР) і развівалася пад кіраўніцтвам народнага паэта Беларусі. Пасля вайны ў яго выходзяць кнігі (не толькі вершы і паэмы, але аповесці і раман «Калі зліваюцца рэкі»). Яго творы адзначаюцца самымі прэстыжнымі прэміямі. І калі пісаць паспяваў гэта чалавек, вельмі заняты адначасова грамадскай дзейнасцю? Таму што Пятрусь Броўка быў больш за 20 гадоў дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР, пазней СССР. Да таго ж ён дзеяч айчыннай навукі — быў акадэмікам Акадэміі навук БССР. Адзін чалавек — а столькі спраў. Безумоўна, герой, Герой сацыялістычнай працы (у 1972 годзе). А яшчэ колькі іншых узнагарод — з іх 3 ордэны Леніна (найвышэйшая ўзнагарода ў СССР)...

Наогул, калі цяпер думаць пра гэтую асобу, то ў ёй шмат здзіўляе. Маладосць — у творчым пошуку. Бойкі стыль, нешта ад зямлі і прыроды, тое, што не можа быць штучным. Сталасць — з трывалай упэўненасцю савецкага чалавека ў адночы выбраным шляху, якому ён ніколі не зменіць і ў якім не будзе нагоды нават сумнявацца: памёр Пятрусь Броўка ў 1980-м годзе. Яго кнігі выходзілі нават пасля смерці, у тым ліку збор твораў у 9-ці тамах.

Але калі ў дзяцінстве творы Петруся Броўкі дазвалялі адчуць пах і смак беларускай мовы (найперш гэта), то цяпер, праз гады (нават з іншай эпохі) больш хочацца разважаць пра тэмы, якія яго натхнялі. Хочацца разважаць з пункту гледжання айчыннай літаратуры і следу творцы ў ёй, а таксама пра ролю творцы ў грамадстве. Вядома, што літаратура — адбітак часу, у якім адлюстравана грамадства з яго галоўнымі ідэямі і ладам жыцця. Калі зыходзіць з гэтых пазіцый, то творчасць паэта Броўкі вельмі паказальная. Яна дае магчымасць адчуць і вывучаць эпоху, цяпер ужо далёкую, а для некаторых нашых суграмадзян амаль нерэальную; зразумець, што гэта было і чаму некаторыя людзі дагэтуль так шчыра трымаюцца за ўспаміны аб тым часе. У рытме той эпохі стукала сэрца Петруся Броўкі, які быў паэтам савецкай Беларусі.

Тым не менш ёсць у творчасці нашых савецкіх літаратараў адна бясспрэчная каштоўнасць: яны пісалі з пазіцый існавання беларускай культуры, успрымалі Беларусь як рэспубліку, утворanую асобным народам, са сваім мінулым, традыцыямі, мовай і светаадчуваннем. Вось гэта самае каштоўнае ў іх атрымалася перадаць творцам наступнага пакалення як галоўную нашу літаратурную традыцыю.

Ларыса ЦІМОШЫК.
tsimoshyk@zviazda.by

Пятрусь БРОЎКА

ЗАПАВЕТНАЕ

Да роднай зямлі
Я навечна прырос
Карэннямі сосен усіх
І бяроз.
Як вецер у буру
Б'е ў вокны і дах,
Так сэрца маё
Неспакойна ў грудзях.
Як ранняй вясною
Іскрыцца расой,
Так нівы я ў горы
Абсыпаў слязой.
Як шчасце між бору
Пабачыць мой зрок, —
Здаецца, ўздымаюся
Я да аблок.
Тады заспяваю,
Забыўшы бяду,
І, як па вясёлцы,
Да сонца іду.

* * *

У любімай мове, роднай, наскай,
Ах, якія словы: «Калі ласка!..»
Як звіняць яны сардэчнаю струною,
Праз усё жыццё ідуць са мною.
Трапіць госць у будзень, а ці ў свята:
— Калі ласка, калі ласка, ў хату!
Не паспелі сесці пры сустрэчы,
Як патэльня засквірчэла ў печы,
Ды і чарка бліснула дарэчы.
Бульба, смажаніна і каўбаска,
Пакаштуйце, людцы, калі ласка!
Хлопец кажа дарагой дзяўчыне:
— Калі ласка! Будзеш гаспадыняй!..
Эх, выццё збудуем мы прыгожа,
Ўсе з табой нягоды пераможам.
Гром грыміць. З нябёсамі размова:
— Калі ласка, цёплы дождж вясновы!
І не вельмі буйны і не рэдкі —
На сады, на пушчы, на палеткі,
На грыбы, на ягады, на кветкі...
— Калі ласка! — наш зварот бясконцы.
Мы гаворым ранішняму сонцу:
— Калі ласка, сонца, выйдзі з хмары,
Радасцю аблашчы нашы твары,
Ты ўзнімі з сабою нашы мары!
— Калі ласка!.. — нашай роднай мовы
Шчырыя і ветлівыя словы.

■ Па слядах песняра

«ЕДЗЬЦЕ ПРАМА І ЎГОРУ!»

Працяг вандроўкі «Славацкімі шляхамі Янкі Купалы»

Герб мястэчка Святы Юр — вершнік на кані, які дзідай працінае сімпатычнага тоўсценькага цмока. Цмока нават шкада...

Вобраз святога апекуна прысутны ў мястэчку паўсюдна. (Пісьменніца Людміла Рублеўская нават вырашыла перанесці сюды дзеянне адной са сваіх гістарычных кніг.) Асабліва ж ураўвае фарны касцёл Святога Юра XIII стагоддзя. Алтар, выраблены з пясчаніку невядомым майстрам, паказвае сцэны з жыцця святога — дасканала выпісаны нават валасы і элементы адзення. Пад алтаром — старажытная дольная капліца, у дварэ касцёла — званіца, дзе дрэва захавалася з XV стагоддзя. Дождж прымусіў затрымацца ў ёй, і беларусы ўзняліся на самы верх, да звона, адтуль і палілася над мястэчкам беларуская песня... Дарэчы, спяваць нашай дэлегацыі давялося і ўвечары, падчас сяброўскай сустрэчы з творчай інтэлігенцыяй Модры. Купалле ж як-ніяк!

Але пакуль тое, айчынных творцаў павезлі далей па слядах Янкі Купалы — дэгуставаць святаюрскае віно ў мясцовай піўніцы. У дубовых бочках, выпаленых знутры, віно набывае асаблівы смак. У 1935 годзе савецкім журналістам і пісьменнікам у Святым Юры вельмі спадабалася. Праз 80 гадоў — нічога не змянілася! Гэтаксама не хацелі з'язджаць адсюль госці...

Аднак час быў рушыць у Модру (зрэшты, і Купала з дэлегацыяй туды выправіліся адразу пасля абеду), дзе наведалі кермічную майстэрню, галерэю Ігнацыя Бізмаера, усклалі кветкі да магілы паэта Людавіта Штура... Менавіта тут (вось містычнае супадзенне!) я атрымала электронны ліст ад Сяргея Панізніка, дзе паэт згадвае ўласнае наведванне Модры ў 1998 годзе і цытуе свае радкі: «Штур і Купала — след у след: // на пераловы // паэта выгукнуў паэт... // Мы ловім Словы».

У Модры мы таксама сустрэліся з мясцовымі творцамі. Падчас сяброўскай вячэры шчырая зацікаўленасць адчувалася з абодвух бакоў, таму і тэмы закраналіся вельмі вострыя: гісторыя Беларусі і Славакіі, пошук чытача, праца бібліятэк. Асноўная выснова, да якой прыйшлі літаратары і журналісты, — наша блізкасць, якую трэба

Удзельнікі беларускай дэлегацыі Алена ЛЯШКОВІЧ, Анатоль БУТЭВІЧ, Таццяна СІВЕЦ.

ўмацоўваць узаемнымі перакладамі і сустрэчамі. Дарэчы, разумелі творцы адно аднаго без перакладу!

Ранкам чакалі Пешцяны. Тут, як аказалася, лечаць не толькі цела... Бібліятэка ў Пешцянах уразіла і сваімі багатымі фондамі, і прасторнымі заламі, і 90-гадовым узростам, і тым, што дзеці пачуваюцца цудоўным чынам, бо з кніжкай можна схавацца ў адпаведнай «мудрай норцы», паспаць на падушцы з партрэтам пісьменніка, а, зірнуўшы на ілюстрацыі, намаляваныя проста на сценах, хочацца ўзяць у рукі кнігу, афармленую таленавітай мастачкай.

Дарэчы, да чытання тут стаўленне асабліве — кнігі можна выпадкова пабачыць і на падаконніку гасцініцы, дзе нас пасялілі, і напаткаць кніжную шафу ў гатэлі, дзе нумар каштуе паўтысячы еўра за ноч; вялікі кніжны збор ёсць і ў доме-музеі Івана Краска. Да візіту беларускай дэлегацыі кніг на беларускай мове тут не было, але гэтую гістарычную памылку айчынныя творцы выправілі.

Нашы папярэднікі, паводле сведчання газеты Slovenske narodne noviny, якое прыводзіць у сваёй кнізе «Янка Купала ў Славакіі» Мікола Трус, адчувалі сябе тут як дома, «і ўсё дзякуючы сардэчнаму прыёму, што быў такі, як толькі можна пажадаць: без вялікіх пышнасцяў і фармальнасцяў, гасціннасць была шчырай — сапраўды славянскай». Сучасныя творцы знайшлі ў Памятнай кнізе гатэля Thermia Palace подпіс Янкі Купалы і пакінулі свае словы захаплення. Падчас вячэры з кіраўніцтвам гатэля абмяркоўвалася пытанне пра ўстаноўку бюста Янкі Купалы на тэрыторыі курорта. Застаецца толькі знайсці скульптара... А пакуль — на ўсход, да Марціна і Высокіх Татраў.

У мястэчку Марцін Купала не быў, але, мяркую, ад знаёмства з адным з важных культурных цэнтраў Славакіі не адмовіўся б. Беларускую дэлегацыю прывіталі ў Турчанскай галерэі, дзе адбылася сустрэча з прадстаўнікамі мясцовай адміністрацыі і пісьменнікамі. Гасцей пазнаёмілі з сучасным славацкім мастацтвам, распавялі пра цікавага аўтара Мікулаша Галанда, у работах якога можна прасачыць падабенства з творамі мастакоў Парыжскай школы з Беларусі.

Хутка апошні прыпынак — Высокія Татры. А горы, між іншым, усё вышэйшыя. Як сказаў нам той, хто тлумачыў дарогу: «Едзьце прама і ўгору!» І мы паехалі...

Але проста так завітаць у этнаграфічны музей «Ждзярскі дом» нецікава. Беларуская дэлегацыя апранула нацыянальныя строі! А зайшоўшы ў будынак, не змаглі стрымаць узрушаных воклічаў: «Дык мы ж у Вязынку трапілі!» Славацкая хата надта ж нагадвала нашу, беларускую, Купалаву... Гаспадары прапанавалі гасцям і расповед пра народныя традыцыі, і ўдзел у абрадзе, і адметную мясцовую кухню. У саміх жа Высокіх Татрах пасля сустрэчы са славацкімі калегамі і чытачамі чакаў сюрпрыз — пад'ём канатнай дарогай у горы. І там, на вяршыні, прыгадаліся радкі Янкі Купалы:

А на небе след цярэбе
Сабе сонца залаты,
Свеціць, грэе долы, горы,
Ў сэрцы шле агонь святы.

Таццяна СІВЕЦ. *lim@zviazda.by*
Браціслава — Мінск

■ Нотны радок

ЧАЙКОЎСКІ НАЗАЎСЁДЫ

Ва ўсе «поры года» ідзе падрыхтоўка да конкурсу імя славутага кампазітара

Пад эгідай святкавання 175-годдзя з дня нараджэння класіка ў Новасібірску пройдзе IX міжнародны юнацкі конкурс імя Пятра Чайкоўскага (не блытаць з Міжнародным конкурсам імя Чайкоўскага, які зараз ідзе ў Маскве і Санкт-Пецярбургу і вядзе сваю гісторыю з 1958-га). У ім прымуць удзел прадстаўнікі дваццаці краін свету, але беларускае прадстаўніцтва будзе самым шматлікім, і з гэтым звязана некалькі навін.

Па-першае, Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр Рэспублікі Беларусь запрошаны акампанаваць удзельнікам трэцяга тура міжнароднага конкурсу, а таксама іграць на гала-канцэрце.

«Новасібірск, у якім пройдзе юнацкі конкурс імя Чайкоўскага, і Мінск з'яўляюцца гарадамі-пабрацімамі, — гаворыць **намеснік генеральнага дырэктара Міждзяржаўнай карпарацыі развіцця Сяргей ДЗЯМЕНСКІ**. — Нам асабліва прыемна, што дзяржаўны аркестр Беларусі прыняў наша запрашэнне выступаць на пляцоўках конкурсу. У маэстра Аляксандра Анісімава лёгкая рука, і я спадзяюся, што за выступленні ўдзельнікаў, у тым ліку з Беларусі, дзякуючы падтрымцы аркестра ў хуткім часе будуць змагацца сцэны найлепшых канцэртных залаў свету».

Мастацкі кіраўнік Беларускай дзяржаўнай філармоніі Юрый ГІЛЬДЗЮК нагадаў, што галоўны горад Сібіры Новасібірск з'яўляецца велізарным культурным цэнтрам з цудоўнай кансерваторыяй, дзе працуюць выдатныя педагогі: «Акрамя іншага, у Новасібірску ёсць вялікая беларуская дыяспара і культурны цэнтр імя Еўфрасінні Полацкай, які ўзначальваюць нашы сябры. Ды і шмат сувязяў паміж добрымі музыкантамі і людзьмі ўвогуле».

Апроч удзела аркестра, беларусы будуць працаваць у складзе журы конкурсаў піяністаў і віяланчэлістаў. І не менш важна, што юныя музыканты з Беларусі будуць удзельнічаць у самім конкурсе. З гэтым звязана яшчэ адна навіна.

Асацыяцыя лаўрэатаў Міжнароднага конкурсу імя Чайкоўскага падпісала пагадненне аб супрацоўніцтве з уласна сімфанічным аркестрам, а таксама з Рэспубліканскай гімназій-каледжам пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі.

Заслужаны дзеяч культуры Расіі, генеральны дырэктар асацыяцыі Андрэй ШЧАРБАК кажа, што дагавор аб супрацоўніцтве будзе доўжыцца дастаткова доўга: «Тысячу гадоў, хутчэй за ўсё».

Асобна пагадненне тычыцца будучага конкурсу, дагавор прадугледжвае льготы для навучэнцаў каледжа ў адборачным туры. Сам адбор будучых удзельнікаў у асноўным праходзіць у завочнай форме, толькі ў некалькіх гарадах арганізуюцца вочныя адборы — у Сеуле, Ерэване, Парыжы і Мінску. «Гэта заслуга ў тым ліку высокай рэпутацыі адукацыйнай музычнай школы Беларусі і ў прыватнасці музычнага каледжа, з якім мы сёння падпісваем пагадненне, — сказаў Сяргей Дзяменскі. Мяркуецца, што адбор пройдзе ў Мінску ў канцы верасня — пачатку кастрычніка. Дакладна вядомая дата дэдлайну для заявак — 15 кастрычніка.

«Наша пагадненне аб супрацоўніцтве прадугледжвае, акрамя таго, што тычыцца юнацкага конкурсу імя Чайкоўскага, правядзенне ў доўгатэрміновай перспектыве іншых мерапрыемстваў. Гэта таксама ўзаемная падтрымка пры рэалізацыі адукацыйных праграм, у прыватнасці праграм дыстанцыйнай адукацыі, і абмен інфармацыяй. Мы спадзяёмся, што напрацоўкі расійскіх калег і нашы будуць узаемна карысныя — гэта рух да ўзбагачэння», — пракаментаваў **дырэктар гімназіі-каледжа пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Сямён КЛІМАНАЎ**.

Андрэй Шчарбак дадаў, што для ўмоўнага музычнага конкурсу, які будзе праходзіць у Беларусі і супрацоўнічаць з асацыяцыяй, будзе магчыма ўстанаўліваць спецыяльныя прэміі, прызы ці падарункі, бо «любы знак увагі — вялікі стымул».

І апошняя навіна: выказана вераголднасць таго, што конкурс, адзін з самых прэстыжных, які пазіцыянуецца як адукацыйны праект для адораных маладых музыкантаў, наступны раз зможа прайсці ў Мінску. Для гэтага ў нас, маўляў, ёсць і патрэбная атмасфера, і музыканты, і пляцоўкі.

Сваю гісторыю юнацкі конкурс імя Чайкоўскага пачаў у Маскве ў 1992 годзе, і сёння з'яўляецца найбуйнейшым прафесійным спаборніцтвам паміж музыкантамі да сямнаццаці гадоў. Праводзіцца ў трох напрамках — гэта фартэпіяна, скрыпка і віяланчэль. IX конкурс пройдзе 5-15 снежня, яго арганізатарамі выступаюць міністэрства культуры Новасібірскай вобласці, Асацыяцыя лаўрэатаў міжнароднага конкурсу імя Чайкоўскага і Міждзяржаўная карпарацыя развіцця.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.
katsyalovich@zviazda.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ПОМЕЩЕНИЙ РУП «Брестское отделение Белорусской железной дороги»

№ лота	1
Наименование, местонахождение и характеристика объекта	Право заключения договора аренды помещений общей площадью 80,8 кв.м и летней площадки площадью 62,7 кв.м (характеристика: имеются – естественное освещение, водопровод, канализация, телефонизация) в здании столовой (инв. №100/С-40000) по адресу: Брестский район, база отдыха «Белое озеро»
Балансодержатель	Транспортное республиканское унитарное предприятие «Брестское отделение Белорусской железной дороги»
Начальная цена продажи (руб.)	**2 424 000**
Сумма задатка (руб.)	242 000
Срок аренды	по 19.09.2015 г.
Сумма арендной платы в месяц	Помещение – 2 226 373 рубля; летняя площадка – 10 базовых арендных величин на момент заключения договора аренды
Условия оплаты	разовый платеж
Размер штрафа, руб.	18 000 000
Условия продажи	- для размещения бара (общественное питание и розничная торговля продовольственными товарами); - наличие минимального ассортиментного перечня продуктов питания и товаров первой необходимости; - аренда оборудования 11 ед. (основных средств) и 60 ед. инвентаря (оборотных активов); - режим работы: ежедневно не позднее 22.00.
Организатор аукционных торгов	**КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью»**

ПРИМЕЧАНИЕ:

Для участия в аукционе юридических или физических лиц, в том числе индивидуальных предпринимателей, прилагаются к заявлению, подаваемому:

1. юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь:

копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

копия платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

2. юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь:

легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;

копия платежного поручения либо иного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

3. индивидуальным предпринимателем:

копия документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя;

копия платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

4. физическим лицом – копия платежного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона.

При заключении соглашения о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона организатору аукциона предъявляются:

представителем физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность.

Сумма задатка перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на счет № 3012780360011 в филиале № 100 Брестское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Брест, ул. Московская, 202, код банка 246, УНП 290433924.

Порядок оформления участия в аукционе и проведения торгов определяется Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. №1049.

Право заключения договора аренды возникает у победителя аукциона с момента внесения им определенной в ходе аукционных торгов цены за право аренды нежилого помещения. Данная сумма должна быть внесена победителем в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов. Договор аренды должен быть подписан в течение 10 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Победитель аукциона обязан оплатить организатору аукциона в течение 3 рабочих дней с даты проведения торгов сумму, в счет возмещения фактических затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников.

Аукцион состоится 9 июля 2015 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 607.

Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 29.06.2015 г. до 17.30 02.07.2015 г. (перерыв с 13.00 до 14.00; вых.: суб., вс.) по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50.

Контактные телефоны: 53 81 92, 53 45 65.

Сайты: www.bgcn.by, www.brest-region.gov.by, www.gki.gov.by

Правила Рекламной игры «Привет, Мечта!»

1. Сведения об организаторе.

1.1. Организатором рекламной игры «Привет, Мечта!» является Общество с ограниченной ответственностью «Яскрава», УНП 191548102, зарегистрировано 16 ноября 2011 г. решением Минского городского исполнительного комитета в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за №191548102 (далее – Организатор). Юридический адрес и местонахождение Организатора: 220073, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Ольшевского, 22, пом. 13, к. 2.

2. Наименование рекламной игры.

2.1. Настоящая рекламная игра называется «Привет, Мечта!» (далее - Игра), проводится в соответствии с условиями настоящих правил (далее - Правила) согласно требованиям законодательства Республики Беларусь без взимания с участников Игры платы.

3. Территория проведения Игры – Республика Беларусь.

4. Период проведения Игры.

4.1. Игра проводится в период с 01 июля 2015 г. по 30 сентября 2015 г., включая период розыгрыша и вручения призов.

5. Состав комиссии по проведению Игры.

Таблица 1

1	Председатель комиссии	Крашенин Александр Валерьевич, управляющий ООО «Яскрава»
2	Члены комиссии	Ерохин Вадим Витальевич, специалист по работе с клиентами ООО «Яскрава»
3		Стельмах Александр Петрович, заместитель директора ООО «Медиа Крама» по правовым вопросам
4		Черненков Павел Леонидович, управляющий ЗАО «Сэлмон-Графикс»
5		Богдусевич Ирина Сергеевна, ведущий специалист отдела рекламных проектов ЗАО «Сэлмон-Графикс»

6. Наименование товаров (работ, услуг) или их групп, в целях стимулирования реализации которых проводится Игра.

6.1. Игра проводится в целях стимулирования проведения безналичных платежей (далее – транзакций) с использованием премиальных банковских платежных карт Visa Gold, Visa Platinum и Visa Infinite.

7. Участники Игры.

7.1. Участниками Игры могут быть физические лица, граждане Республики Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство в Республике Беларусь и постоянно проживающие на территории Республики Беларусь, достигшие 18 лет.

7.2. Участниками Игры не могут быть лица, состоящие в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) таких лиц, их близкие родственники, лица, находящиеся с такими лицами в отношениях свойства, а также члены комиссии по проведению Игры.

8. Условия участия в Игре.

8.1. Для участия в Игре необходимо в период с 00:00 01 июля 2015 г. по 23:59 10 сентября 2015 г. включительно:

8.1.1. совершить:

8.1.1.1. на территории Республики Беларусь безналичную операцию (транзакцию) с использованием банковских платежных карт Visa Gold, Visa Platinum и Visa Infinite, по оплате товаров (работ/услуг) в белорусских рублях на сумму 300 000 (Триста тысяч) белорусских рублей и более

или

8.1.1.2. за пределами территории Республики Беларусь безналичную операцию (транзакцию) с использованием банковских платежных карт Visa Gold, Visa Platinum и Visa Infinite, по оплате товаров (работ/услуг) в любой валюте на сумму, эквивалентную 300 000 (Тремстам тысячам) белорусских рублей и более по курсу НБ РБ на момент осуществления платежа;

8.1.2. сохранять карт-чек безналичной операции (транзакции) в течение всего периода проведения Игры (п.4);

8.1.3. заполнить регистрационную форму на Интернет-сайте www.visa.com.by (далее – Сайт) и зарегистрировать ее. Регистрационная форма содержит поля, обязательные для заполнения: ФИО (полностью), контактный телефон, почтовый адрес (будет использован Организатором при уведомлении участника о выигрыше), тип карты (Visa Gold, Visa Platinum и Visa Infinite), RNN-номер карт-чека, дата совершения безналичной операции (согласно соответствующего карт-чека), сумма карт-чека (в белорусских рублях), банк-эмитент соответствующей карты, место совершения транзакции (в пределах Республики Беларусь, за ее пределами).

8.2. Каждая безналичная операция (транзакция), соответствующая условиям Игры, участвует в розыгрыше.

8.3. Регистрация каждой новой уникальной безналичной операции (транзакции) осуществляется через заполнение новой регистрационной формы на Сайте.

8.4. Одна уникальная безналичная операция (транзакция) может принимать участие в Игре только один раз. В случае, если уникальная безналичная операция (транзакция) будет внесена в регистрационную форму на Сайте более одного раза, она будет регистрироваться только один раз по факту первого ввода данных уникальной безналичной операции (транзакции) и участвовать в розыгрыше на основании такой регистрации.

8.5. Определение участников Игры производится по каждой произведенной держателем карты безналичной операции (транзакции) отдельно. Порядковые номера транзакциям присваиваются Организатором по дате и времени регистрации данных в регистрационной форме на Сайте.

8.6. Не является основанием для участия в Игре:

8.6.1. проведение операций по снятию наличных денежных средств;

8.6.2. проведение операций по переводу денежных средств с карточки на карточку;

8.6.3. проведение операций по погашению кредитов;

8.6.4. проведение операций по размещению депозитов и оплате банковских комиссий;

8.6.5. проведение операций, осуществленных в кассах отделений банков.

9. Состав и размер призового фонда.

Таблица 2

№ п/п	Наименование призов, участвующих в розыгрыше	Кол-во (шт.)	Сумма за 1 ед. (бел. руб.)	Сумма всего
1	Главный приз – автомобиль Тойота RAV4 (год выпуска 2015, (2.0 л. бензин), максимальная мощность 146 л.с., тип кузова – легковой джип, уровень комплектации - U5 (Стандарт) / передний привод, КПП (трансмиссия) – вариатор) + денежная сумма в размере 50 674 598 бел. руб.	1	390 674 598	390 674 598
2	Второстепенный приз – сертификат на оказание услуг по организации отдыха на территории загородного комплекса «Шишки» (д. Загорщина, Лошанского с/с, Узденского р-на) в период с 01.09.2015 г. по 15.12.2015 г. на сумму 10 000 000 бел. руб. + денежная сумма в размере 1 364 253 бел. руб.	5	11 364 253	56 821 265

9.1. Призовой фонд Игры составляет сумму в размере 447 495 863 (Четыреста сорок семь миллионов четыреста девяносто пять тысяч восемьсот шестьдесят три) белорусских рубля и формируется за счет денежных средств и имущества Организатора.

10. Порядок проведения розыгрыша призового фонда.

10.1. Всего, за время проведения Игры, Организатором проводится 1 (Один) розыгрыш призового фонда.

10.2. Место проведения розыгрыша призов: 220073, г. Минск, ул. Ольшевского, д. 22, пом. 13, к. 2.

10.3. Дата и время проведения розыгрыша: 11 сентября 2015 г. в 15.00.

11. Розыгрыш призов.

11.1. Для осуществления розыгрыша Организатор формирует список из уникальных порядковых номеров, присвоенных всем безналичным операциям (транзакциям) участников Игры, соответствующим Правилам Игры, полученным из данных регистрационных форм, заполненных и зарегистрированных участниками согласно Правил Игры на Сайте (далее – Массив).

11.2. Для проведения розыгрыша призов Организатор использует лототрон и набор шаров в количестве 10-ти штук с номерами от 0 по 9.

11.3. За ходом розыгрыша призов наблюдает Комиссия по проведению Игры. Итоги розыгрыша призов Игры фиксируются в протоколе, который составляется и подписывается присутствующими членами Комиссии.

11.4. Определение выигрышных номеров безналичных операций (транзакций) происходит путем их формирования слева направо из номеров шаров, поочередно извлекаемых из барабана.

11.5. Для определения цифры первого слева разряда выигрышного порядкового номера секретарь помещает в барабан шары с номерами от 0 по первую слева цифру последнего порядкового номера транзакций в Массиве. Секретарь извлекает из барабана один шар. Номер извлеченного шара вносится в протокол и записывается в первый слева разряд формируемого выигрышного номера.

11.6. После этого в барабан загружаются все десять шаров, шары перемешиваются, и из барабана извлекается шар, номер которого определяет цифру следующего разряда выигрышного номера. Номер шара вносится в протокол, производится проверка на наличие полученной комбинации цифр разрядов в соответствующих разрядах порядковых номеров в Массиве и при наличии совпадения выпавший номер шара записывается в соответствующий разряд выигрышного номера. В противном случае извлеченный шар не возвращается в барабан, и секретарь извлекает следующий шар. Шары извлекаются до тех пор, пока полученная комбинация цифр разрядов не попадает в диапазон соответствующих разрядов порядковых номеров в Массиве.

11.7. В розыгрыше будут разыграны призы в последовательности, указанной в Таблице 2 п. 9 Правил.

11.8. Для обеспечения проведения розыгрыша Организатор производит определение резервных выигрышных безналичных операций (транзакций) указанным выше способом в количестве 12 (Двенадцати) штук и фиксирует их номера в хронологическом порядке их определения:

11.8.1. Два первых номера выигрышных резервных безналичных операций (транзакций) для определения резервных победителей главного приза (п.9., №1 Таблицы 2);

11.8.2. Десять последующих выигрышных резервных безналичных операций (транзакций) для определения резервных победителей второстепенных призов (п.9. №2 Таблицы 2).

11.9. Призы вручаются резервным победителям в случае, если:

11.9.1. победитель отказывается от получения приза, о чем письменно извещает Организатора;

11.9.2. победитель указал недостоверную информацию при регистрации безналичной операции (транзакции) на Сайте;

11.9.3. победитель нарушает (не выполняет) требования Правил (в том числе не предоставляет необходимые подтверждающие документы, указанные в Правилах, в сроки и в порядке, установленные Правилами);

11.9.4. победитель нарушает сроки получения приза, установленные Правилами.

12. Срок и способ информирования участников, выигравших призы (Победителей), место, порядок и сроки вручения призов.

12.1. Организатор уведомляет Победителей розыгрыша о выигрыше почтовым уведомлением по адресу из соответствующей регистрационной формы, не позднее 14 сентября 2015 г., а также, дополнительно, по телефону, указанному в соответствующей регистрационной форме.

12.2. Победители могут получить выигранные ими призы по адресу – г. Минск, ул. Ольшевского, д. 22, помещение № 13, к. 2, с 10.00 до 17.00 в рабочие дни, в срок до 18.09.2015 года включительно, предоставив Организатору лично:

12.2.1. свои паспортные данные (данные вида на жительство): ФИО, серия и номер паспорта (вида на жительство), дата выдачи, орган, выдавший паспорт (вид на жительство), идентификационный номер;

12.2.2. оригинал карт-чека выигрышной безналичной операции (транзакции);

12.2.3. карту, по которой была совершена соответствующая выигрышная безналичная операция (транзакция), а в случае закрытия карт-счета на момент проведения розыгрыша – прекративший действие оригинал договора на открытие карт-счета, к которому относилась карта, по которой была совершена соответствующая выигрышная безналичная операция (транзакция).

12.3. В случае, если Победитель не может получить приз лично, приз может получить его законный представитель (доверенное лицо), предоставив лично:

12.3.1. свои паспортные данные (данные вида на жительство): ФИО, серия и номер паспорта (вида на жительство), дата выдачи, орган, выдавший паспорт (вид на жительство), идентификационный номер;

12.3.2. доверенность от победителя, заверенную нотариально;

12.3.3. оригинал карт-чека выигрышной безналичной операции (транзакции);

12.3.4. карту, по которой была совершена соответствующая выигрышная безналичная операция (транзакция), а в случае закрытия карт-счета на момент проведения розыгрыша – прекративший действие оригинал договора на открытие карт-счета, к которому относилась карта, по которой была совершена соответствующая выигрышная безналичная операция (транзакция).

12.4. В случае возникновения необходимости вручения призов резервным победителям (п.11.9.):

12.4.1. Организатор уведомляет резервных победителей розыгрыша о выигрыше почтовым уведомлением по адресу из соответствующей регистрационной формы, не позднее 21 сентября 2015 г., а так же, дополнительно, по телефону, указанному в соответствующей регистрационной форме.

12.4.1.1. Резервные победители могут получить выигранные ими призы по адресу – г. Минск, ул. Ольшевского, д. 22, помещение № 13, к. 2, с 10.00 до 17.00 в рабочие дни, в срок до 25.09.2015 года включительно, предоставив Организатору лично данные, указанные в п.12.2.1.-12.2.3., а в случае невозможности получить приз лично – согласно п.12.3.

12.5. Призы не подлежат замене. Выплата денежного эквивалента Призов не осуществляется. Ответственность Организатора по выдаче Призов ограничена количеством и видами этих Призов, указанных в Правилах.

12.6. Организатор Игры не несет ответственности за любые риски, связанные с повреждением призов и их эксплуатацией, возникшие после передачи призов Победителям.

12.7. При получении призов Победители несут все права и обязанности по уплате подоходного налога в бюджет Республики Беларусь. Начисление, удержание и перечисление подоходного налога проводится в порядке, установленном Особенной частью Налогового кодекса Республики Беларусь и осуществляется Организатором Игры. Удержание с победителей Игры подоходного налога, исчисленного Организатором в соответствии с законодательством Республики Беларусь, производится Организатором (выступающим налоговым агентом) в момент выдачи приза из денежной части приза – денежная часть приза удерживается Организатором для уплаты подоходного налога в установленном размере.

12.8. Победители Игры, претендующие на получение призов, обязуются заполнить и подписать все необходимые для их получения документы, предоставляемые Организатором, выполнить все условия, предусмотренные Правилами, а также формальности, необходимые для получения призов.

13. Права и обязанности участников Игры.

13.1. Участники соглашаются давать рекламные интервью об участии в Игре, в том числе по радио, телевидению, в Интернете и в иных средствах массовой информации, а также сниматься для изготовления графических рекламных материалов без уплаты за это какого-либо вознаграждения. Факт участия в Игре подразумевает, что ее участники соглашаются с тем, что в рамках Игры их имена, фамилии, отчества, фотографии, аудио и видео интервью и иные материалы о них могут быть использованы Организатором в целях проведения Игры. Все права, в том числе исключительные имущественные права на такие интервью и результаты съемки, будут принадлежать Организатору.

13.2. Участники, при заполнении регистрационной формы на Сайте обязаны вводить достоверную информацию. Организатор не несет ответственности за достоверность данных, внесенных участниками в регистрационную форму.

14. Наименование печатного средства массовой информации, в котором будут опубликованы результаты розыгрыша призового фонда, а также сроки их опубликования.

14.1. Правила подлежат опубликованию в газете «Звязда» до начала Игры. Результаты Игры подлежат опубликованию в газете «Звязда» не позднее 30 сентября 2015 г.

15. Общие условия Игры.

15.1. Принимая участие в Игре, участники подтверждают свое ознакомление и согласие со всеми условиями Правил, а также обязуется выполнять все требования законодательства, вытекающие из участия в Игре и/или связанные с получением призов.

15.2. Решения Организатора по всем вопросам, связанным с проведением Игры, а также результаты проведения Игры будут считаться окончательными и будут распространяться на всех участников.

15.3. Во избежание сомнений, компания Visa International Service Association и любые ее аффилированные лица не являются Организатором, не принимают участия в розыгрыше и/или вручении призов, а также определении победителей, и не несут ответственности за соблюдение Организатором Правил, законодательства Республики Беларусь, а также не отвечают по претензиям участников Игры.

15.4. Информацию об условиях участия и проведения Игры можно получить по телефону «горячей линии» +375(29) 196-17-16 с 10.00 до 17.00 в рабочие дни, а также на Интернет-сайте www.visa.com.by.

Свидетельство № 2583 о государственной регистрации рекламной игры, зарегистрированной 16 июня 2015 года Министерством торговли Республики Беларусь.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Наименование	Характеристика
ЛОТ 1	
Наименование объекта, краткая характеристика	- капитальное строение, инв. № 400/С-43773 (назначение – здание административно-хозяйственное), площадью 409,8 кв.м, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Победы, 3. Составные части и принадлежности: терраса, ограждение, покрытие территории, покрытие территории, ворота, ограждение. - конструкция фундамента от ликвидируемого сооружения – теплицы, инв. № 19636, - подпорная стенка, инв. № 19637, - конструкция фундамента от ликвидируемого сооружения – теплицы, инв. № 20815, - зеленые насаждения (1 ель, 1 алыча, 1 вишня, 4 яблони, 2 груши).
Земельный участок, на котором расположен объект	Кадастровый номер 440100000001008217 (назначение – земельный участок для обслуживания административно-хозяйственного здания), площадью 0,8544 га, расположенном по адресу: г. Гродно, ул. Победы, 3
Начальная цена продажи	7 969 791 000 (семь миллиардов девятьсот шестьдесят девять миллионов семьсот девяносто одна тысяча) белорусских рублей без учета НДС
Сумма задатка	796 979 100 (семьсот девяносто шесть миллионов девятьсот семьдесят девять тысяч сто) белорусских рублей
Продавец	ОАО «Белкард» г. Гродно, 230026, г. Гродно, ул. Счастного, 38, тел. 52-41-01
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34
Условия аукциона	Без условий
Условия оплаты	По договоренности сторон
Срок заключения договора купли-продажи	Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/с для перечисления задатка	Р/с 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области БИК 153001739, УНП 500833225
Аукцион состоится 23 июля 2015 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209.	
К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица; *индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются: представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя; физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица; представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. **Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 25.04.2015 г.**	
Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница).	
Последний день приема заявлений – 17 июля 2015 г. до 15.00.	

Телефон для справок: 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

Наименование (описание) имущества и его стоимость	**Лот №1**. Кран РДК-250-2, желтого цвета, регистрационный номер 937, 1985 года выпуска, кран гусеничный, грузоподъемностью 18 тонн, дизельный двигатель с дизельным генератором для электрической крановой установки находится по адресу: Витебская область, г. Полоцк, ул. Шенягина, д. 52, начальная стоимость лота 183.920.000 белорусских рублей. **Лот № 2** Автомобильный кран КС-4571-1, КРАЗ 250 государственный регистрационный знак АА 2004-2, оранжевого цвета, 1988 года выпуска, грузовой специальный автокран, телескопический, на базе автомобиля КРАЗ, грузоподъемностью 16 тонн, находится по адресу: Витебская область, г. Полоцк, ул. Шенягина, д. 52, начальная стоимость лота 186.880.000 белорусских рублей. **Лот № 3** Автомобильный кран КС-4562, КРАЗ 250 государственный регистрационный знак ВА 3919, бежевого цвета, 1990 года выпуска, автокран с решетчатой стрелой, на базе автомобиля КРАЗ, дизельный двигатель, грузоподъемностью 16 тонн, крановая установка электрическая находится по адресу: Витебская область, г. Полоцк, ул. Шенягина, д. 52, начальная стоимость лота 69.520.000 белорусских рублей.
Собственник (владелец) имущества	Витебская область. Право хозяйственного ведения, правообладатель: Дочернее коммунальное строительное унитарное предприятие «Полоцкая СПМК-36», УНП 300075137, юридический адрес: Витебская область, г. Полоцк, ул. Шенягина, д.52
Местонахождение имущества	г. Полоцк По всем вопросам, касающимся осмотра имущества, обращаться к директору ДКСУП «Полоцкая СПМК-36» Кандыбо Владимиру Степановичу (раб. тел. 80214-42-22-66, т.м. 8029-713-66-35).
Наличие обременений	Нет
Место (адрес), дата и время проведения торгов	Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома г. Витебск, ул. «Правды», 32 16 июля 2015 года в 10.00
Справочная информация об организаторе торгов	Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома 210029, г. Витебск, ул. «Правды», д. 32, каб. 316. Судебный исполнитель Колядко Александр Михайлович, тел. (0212) 60 00 92, т.м. 375-33-687-91-20. Начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович, тел. (0212) 60 09 75
Условия и порядок проведения торгов	1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001066 филиала № 200 – Витебского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505 не позднее 12.00 15 июля 2015 года. Минимальная величина первого шага торгов – 5% стоимости лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Наименование	Характеристика
ЛОТ 1	
Наименование и краткая характеристика объекта, адрес расположения	Капитальное строение, инв. № 400/С-46318 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад), площадью 273,0 кв.м, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Озерское шоссе, 12. Составные части и принадлежности: три кирпичные пристройки – склад, асфальтобетонное покрытие, ограждение бетонное, ограждение деревянное, ворота металлические
Земельный участок, на котором расположен объект	Кадастровый номер 440100000002000592, площадью 0,0632 га (назначение – строительство и обслуживание здания) по адресу: г. Гродно, ул. Озерское шоссе, 12
Начальная цена продажи	825 000 000 (восемьсот двадцать пять миллионов) белорусских рублей с учетом НДС
Сумма задатка	41 250 000 (сорок один миллион двести пятьдесят тысяч) белорусских рублей
ЛОТ 2	
Наименование и краткая характеристика объекта, адрес расположения	Капитальное строение, инв. № 400/С-48538 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад), площадью 598,5 кв.м, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Озерское шоссе, 20. Составные части и принадлежности: подвал, пристройка, рампа
Земельный участок, на котором расположен объект	Кадастровый номер 440100000002006545, площадью 0,0515 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания книготорга) по адресу: г. Гродно, ул. Озерское шоссе, 20
Начальная цена продажи	1 324 737 600 (один миллиард триста двадцать четыре миллиона семьсот тридцать семь тысяч шестьсот) белорусских рублей с учетом НДС
Сумма задатка	66 236 880 (шестьдесят шесть миллионов двести тридцать шесть тысяч восемьсот восемьдесят) белорусских рублей
ЛОТ 3	
Наименование и краткая характеристика объекта, адрес расположения	Капитальное строение, инв. № 401/С-16330 (назначение – здание неустановленного магазина, наименование – цех торгового оборудования), площадью 1379,0 кв.м, расположенное по адресу: г. Скидель, ул. Интернациональная, 58
Земельный участок, на котором расположен объект	Кадастровый номер 422050400002002300, площадью 0,2800 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания цеха торгового оборудования) по адресу: г. Скидель, ул. Интернациональная, 58. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли, находящиеся в водоохранных зонах водных объектов вне прибрежных полос, код – 2, площадью 0,2800 га
Начальная цена продажи	892 000 000 (восемьсот девяноста два миллиона) белорусских рублей с учетом НДС
Сумма задатка	44 600 000 (сорок четыре миллиона шестьсот тысяч) белорусских рублей
ЛОТ 4	
Наименование и краткая характеристика объекта, адрес расположения	Изолированное помещение, инв. № 400/D-97171 (назначение – магазин, наименование – магазин), площадью 391,4 кв.м, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Красноармейская, 69-17
Земельный участок, на котором расположен объект	Кадастровый номер 440100000002000780, площадью 0,0639 га (назначение – обслуживание жилого дома со встроенным магазином) по адресу: г. Гродно, ул. Красноармейская, 69
Начальная цена продажи	4 362 627 600 (четыре миллиарда триста шестьдесят два миллиона шестьсот двадцать семь тысяч шестьсот) белорусских рублей с учетом НДС
Сумма задатка	218 131 380 (двести восемнадцать миллионов сто тридцать одна тысяча триста восемьдесят) белорусских рублей
ЛОТ 5	
Наименование и краткая характеристика объекта, адрес расположения	Изолированное помещение, инв. № 400/D-5569 (назначение – административное помещение, наименование – административное помещение), площадью 165,1 кв.м, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Лермонтова, 8
Начальная цена продажи	2 305 000 000 (два миллиарда триста пять миллионов) белорусских рублей с учетом НДС
Сумма задатка	115 250 000 (сто пятнадцать миллионов двести пятьдесят тысяч) белорусских рублей
Продавец	Гродненский городской филиал облпотребобщества, 230001, г. Гродно, ул. Суворова, 298
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 41-98-32
Условия аукциона	Аукцион без условий
Условия оплаты	По договоренности сторон
Срок заключения договора купли-продажи	Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/с для перечисления задатка	Р/с 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225
Аукцион состоится 28 июля 2015 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209.	
К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: - заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; - *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь*: заверенная копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица и заверенные копии учредительных документов; - *индивидуальным предпринимателем*: документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются: - представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя; - физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица; - представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, до продажи объекта в процессе аукционных торгов, без объяснения причины. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов по названной аукционистом цене. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.	

■ Незвычайнае побач

«Зорная скарбонка» Неўскага

У «зорнай скарбонцы» Віталя Неўскага — заснавальніка першай у Беларусі прыватнай абсерваторыі — шэраг адкрыццяў. У прыгожую дату, 7. 07. 2007, яго «дзецішча» пад Віцебскам было афіцыйна зарэгістравана ў Міжнародным цэнтры малых планет (Гарвард, ЗША). Код абсерваторыі B42. Што цікава: астраном (аўтарытэт у прафесійным свеце, праз адкрыцці якога нават падручнікі перапісвалі) фактычна — самавук. Не мае спецыяльнай адукацыі. Больш за тое, прызнаўся, што так і не скончыў Віцебскі тэхналагічны ўніверсітэт. Менавіта Віталь удакладніў дыяметр спадарожніка Сатурна Тэфіі, адкрыў дзясяткі новых астэроідаў... Сенсацыяй стала ў 2012 годзе адкрыццё «каметы стагоддзя». На сёння гэты «паставы зорак» працуе прафесіянальным астраномам у абсерваторыі на Паўночным Каўказе.
Ці цяжка зрабіць «зорныя сенсацыі», ці ўяўляюць небяспеку метэарыты? Мо бачыў у тэлескоп лятаючыя талеркі, верыць у гараскопы? Гэтым і не толькі пацікавіўся ў астранома карэспандэнт «Звязды».

Тэлескоп, на якім было здзейснена адкрыццё «каметы стагоддзя», злева — Арцём НАВІЧОНАК, справа — Віталь НЕЎСКІ.

АСТЭРОІД — У ГОНАР НАСТАЎНІКА

Было складана размаўляць з чалавекам, які захоплены сваёй справай. Шкадую, што да сустрэчы не пачытаў падручнікі па астраноміі. Бо многія пачутыя тэрміны, якія вывучаюць у школе, забыўся... Дарэчы, раю паглядзець сайт астранома: http://www.nevski.belastro.net/. Там Віталь падрабязна напісаў пра адкрыцці новых астэроідаў, звышновай зоркі... Аўтарскія фота зорных сваціла ў на сайце цудоўныя!

Дарэчы, тыя, хто захапляецца астраноміяй, маюць шанц стаць напарнікам Віталя. Астраномаў сёння катастрафічна не хапае. А заробак, як адзначыў Віталь, дастойны. Ды і ў моладзі добрыя перспектывы зрабіць кар'еру, «зорныя» адкрыцці... Дый хто сказаў, што астраномія — нецікавы прадмет?

У расійскай абсерваторыі ён адсочвае рух спадарожнікаў і ўдакладняе іх арбіту. Як «бонус» — дазваляецца ажыццяўляць уласныя астранамічныя назіранні. Віталь жыве ў Віцебску з прыгожай і разумнай жонкай і дачкой. А вось на працу даводзіцца ездзіць... на самалёце. Месяц у камандзіроўцы, столькі ж — адпачывае. Графік працы таксама незвычайны: уначы не спіш, днём спіш да абеду, потым — вольны час.

— Сярод іншага адкрыў камету, якая атрымала назву Неўскі. Астэроід (малую планету. — **Аўт.**) назваў у гонар настаўніка Уладзіміра Аляксандравіча Голубева. Адкрыў і астэроід, які назваў Віцебск (№ 264061 Vitebsk)...

А захапіўся гэтай навукай яшчэ ў школе. Пасля таго, як у 8 класе прачытаў кнігу пра астраномію з прыгожымі малюнкамі. Потым пачаў хадзіць у гурток на станцыю юных тэхнікаў, якім кіраваў згаданы вышэй Уладзімір Голубеў. Тэлескоп у савецкі час купіць — гэта была вялікая праблема. І таму захопленыя астраноміяй усё рабілі сваімі рукамі. У мяне ў 11 класе з'явілася думка аб пабудове ўласнай абсерваторыі. Але адразу праблема: дзе менавіта? Участка не было ў нашай сям'і. Тата ўгаворваў знаёмых дапамагаць, хто чым можа. У прынцыпе, пабудова абсерваторыі — яго вялікая заслуга. Дарэчы, проста недзе яе пабудаваць — гэта няправільна. Неабходны адкрыты гарызонт, поўная адсутнасць ліхтароў. У горадзе ж назіраць за зорным небам вельмі праблематычна, бо перашкаджае падсветка. Увосень 1990 года знайшлі варыянт: у 20 кіламетрах на поўдзень ад Віцебска, — распавядае Віталь Неўскі.

Савецкі нонсэнс: кіраўніцтва саўгаса выдзеліла зямлю менавіта пад будаўніцтва абсерваторыі.

— Удалося дастаць усе неабходныя матэрыялы і зварыць каркас купала. Уласна з апошнім і было больш за ўсё праблем. Для таго, каб прывезці такую махіну дыяметрам 5 метраў на месца, патрэбен быў эскорт ДАІ, — працягвае суразмоўца.

Дадаў, што спатрэбіўся і кран з тэлескапічнай стралой даўжынёй 20 метраў, каб купал пры ўздыме не чапляўся за стралу.

У маі 1991 года ў падмурак быў закладзены першы камень. Будаўніцтва двухпавярховага будынка вышынёй 6,5 метра і дыяметрам 5 метраў было поўнасцю завершана на працягу года.

— Прычым толькі сваімі сіламі. І ў 1992 годзе, нягледзячы на тое, што стацыянарны інструмент яшчэ не быў гатовы, у абсерваторыі ўжо праводзіліся першыя назіранні, — падкрэслівае астраном.

Здымак «каметы стагоддзя».



ПРА «КАМЕТУ СТАГОДДЗЯ» І «ЛУНАЦІКАЎ»

Віталь Неўскі і расіянін Арцём Навічонак — першаадкрывальнікі кометы, якую ў СМІ назвалі «каметай стагоддзя». Пра гэта адкрыццё пісала і «Звязда».

— Маецца на ўвазе камета, якая была адкрыта 21 верасня 2012 года. Назіранні праводзіліся ў абсерваторыі «ISON-Кіславодск». Аблокі не дазвалялі займацца ўжо звыклай аглядной працай. У тую ноч мы вырашылі ў вокнах між аблокаў «прайсціся» па раней адкрытых намі астэроідах з найбольш цікавымі арбітамі. Літаральна за паўгадзіны да світання неба практычна цалкам ачысцілася. Запусцілі пошукавую бесперапынную пляцоўку на мяжы сузор'яў Блізнят і Рака, можна сказаць, «ткнуўшы пальцам у неба»... Калі б камета «пераможа» сустрэчу з Сонцам, яна магла б стаць самай яркай каметай першай паловы XXI стагоддзя. А наконт эпітэтаў кшталту «камета стагоддзя», бадай, гэта — журналісцкія дзівацтвы *(смяецца.* — **Аўт.**). Не сказаў бы, што так яно і ёсць... Але ажыятаж насамрэч быў вялікі. У прыватнасці сайт НАСА, на якім можна ўбачыць, як сочаць за Сонцам (а камета блізка падыходзіла да яго), літаральна «лёг». Гэта адбылося з прычыны вялікай колькасці наведвальнікаў. Вядома, неверагодная ўдача — адкрыць выпадкова такое аматару, — тлумачыць астраном.

У Беларусі, на жаль, не найлепшыя ўмовы для назірання за небам.

— Няма ў нашай краіне ні адной сур'ёзнай прафесійнай абсерваторыі. Віной таму — геаграфічнае становішча і дрэнны клімат. А вось, для параўнання, ва Узбекістане — найлепшае месца для назіранняў, — тлумачыць Віталь.

Пры гэтым беларускія юныя астраномы традыцыйна перамагаюць на міжнародных спаборніцтвах. У Віцебску, дарэчы, няма дзіцячага гуртка. А ў прыгарадзе — аграрным гарадку Ноўка — ёсць. Там стварылі цэлы астранамічны комплекс: з планетарыем, астранамічнай пляцоўкай і тэлескопам. А ўсё дзякуючы намаганням таго ж спадара Голубева, настаўніка вышэйшай катэгорыі, старшага выкладчыка кафедры інжынернай фізікі Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава. І цяжка паверыць, што гэтаму энергічнаму астраному ўжо 74 гады!

— Пасля таго, як у лютым 2013 года ў Чалябінскай вобласці ўпаў метэарыт, ці магчыма паўтарэнне аналагічнага?

— Верагоднасць сутыкнення, скажу так, не роўная нулю. Дарэчы, пасля чалябінскай падзеі, наколькі я ведаю, ва ўрадзе Расіі «спахапіліся». І вылучаюцца грошы на «астэроідныя задачы». З часам будзе развівацца гэты кірунак... Праблема касмічнага смецця ўжо даўно актуальная. Арбіта Зямлі вельмі маленькая. Калі назіраем за спадарожнікамі, часта заўважаем, што яны ўшчыльную ляцяць. Па сціплых падліках, каля 20 тысяч аб'ектаў на арбіце «адпрацаваных»: усякія люкі і іншае касмічнае смецце. І зусім не фантастыка тое, што ў найбліжэйшай перспектыве спецыяльныя апараты, можа з сеткамі, будуць «лавіць» усё непатрэбнае, — здзіўляе суразмоўца.

У адказ на пытанне, ці можна верыць гараскопам, астраном шчыра рассмяяўся.

— Астралогія заснавана толькі на псіхалогіі чалавека, на яго жаданні даведацца пра сваю будучыню. Нехта зарабляе на гэтым добра... Калі камусьці хочацца верыць, дык чаму б і не? — разважае астраном.

— А мо талеркі бачылі на зорным небе?

— Больш за 20 гадоў назіраю за нябёсамі і не бачыў. Успышкі спадарожнікаў можна ўспрымаць, як «святло талеркі». Аналагічна і міжнародныя станцыі лёгка зблытаць з нейкім «невядомым» апаратам. Ды нават кітайскія ліхтарыкі падобны на «нешта», калі ляцяць... Скажаце, што, маўляў, даваў падпіску, каб гаварыць, што няма НЛА? Не даваў! Слова гонару!

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
pukshanski@zviazda.by
Віцебск — Віцебскі раён.
Фота аўтара і з асабістага архіва Віталя Неўскага



Прыватная абсерваторыя ў Віцебскім раёне.

Ад шчырага сэрца віншуем галоўнага рэдактара іванаўскай раённай газеты «Чырвоная звязда», пісьменніка Анатоля Мікалаевіча КРЭЙДЗІЧА з паўвекавым юбілеем.
Жывіце і тварыце яшчэ столькі ж!
З павагай, Сяргей Мікалаевіч ВАРОНІН, дырэктар КУМПП ЖКГ «Іванаўская ЖКГ».
УНП 200023476

Першы рэйс спадабаўся, але заявак няма

У сувязі з адсутнасцю попыту і заявак ад турыстычных фірм на перавозку пасажыраў у зносінах Мінск — Варна (Балгарыя) прызначаны з 17 чэрвеня цягнік №374/373 будзе курсіраваць да 12 жніўня.

З Мінска ён будзе адпраўляцца па серадах, з Варны — па 14 жніўня па пятніцах. Пры павелічэнні пасажырапатоку і цягнік Мінск — Варна, пачынаючы з 19 жніўня, будзе прызначацца «па ўказанні», пра яго распавялі ў прэс-цэнтры Беларускай чыгункі.

Сяргей РАСОЛЬКА.
rs@zviazda.by

Даты | Падзеі | Людзі

27 ЧЭРВЕНЯ

1615 год — чай упершыню імпартаваны ў Еўропу. Спачатку ён стаў вядомы як лячэбны напой, але праз некалькі дзесяцігоддзяў чай сталі піць проста для задавальнення. Самым вялікім прыхільнікам чаю лічыўся нідэрландскі ўрач Карнэліус Дэкер (1647—1685), вядомы таксама як Бантэку, які сцвярджаў: «Чай можа дапамагчы чалавеку, які знясілены і адной нагой стаіць у магіле, ён надасць яму сілу і дасць новае жыццё». Галандзец лічыў, што 50 кубкаў дадзенага напою ў дзень цалкам дастаткова, можна піць яшчэ больш, але 200 кубкаў — гэта натуральная мяжа. Падазрэнні ў тым, што ён быў падкуплены Нідэрландскай Ост-Індскай кампаніяй, так і не былі абвергнуты.

1910 год — у вёсцы Прудзішча Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці нарадзіўся Алесь Кучар (Айзік Явялевіч), беларускі драматург, крытык. Працаваў у газетах «Літаратура і мастацтва», «Настаўніцкая газета», Дзяржаўным выдавецтве БССР, на кінастудыі «Беларусьфільм». Аўтар артыкулаў і нарысаў пра класікаў беларускай літаратуры, творчасць пісьменнікаў Беларусі, п'ес пра партызанскі рух, мінскіх падпольшчыкаў. Памёр у 1996 годзе.

1965 год — нарадзіўся Анатоль Крэйдзіч, галоўны рэдактар іванаўскай раённай газеты «Чырвоная звязда», старшыня Брэсцкага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, пісьменнік, публіцыст. Віншуем калегу з юбілеем і жадаем здароўя, натхнення і плёну!

Было сказана

Максім БАГДАНОВІЧ, паэт, перакладчык, крытык і гісторык літаратуры:

«Рупная пчала ўмее ў соты мёд сабраць і з горкіх кветак».

Азбука народнай культуры

ад Янкі Крука і Аксаны Катовіч

Час і іншыя ўмовы для сватаўства. Першым крокам да стварэння новай сям'і, пачатковай кропкай у развіцці шматдзённага і шматэтапнага вясельнага рытуалу, безумоўна, з'яўлялася сватаўство, да якога ставіліся з вялікай адказнасцю, старанна выбіралі час сяброўскага візіту і тых людзей, якія будуць браць у ім удзел.

◈ Па ўяўленнях нашых продкаў, самым спрыяльным днём для сватаўства лічылі чацвер. Справа ў тым, што кожны дзень тыдня мае сваю «характарыстыку», у чымсьці станоўчую, у чымсьці адмоўную. Нездарма казалі, што ў кожнага дня свая справа, свая турбота.

◈ Чацвер — гэта «мужчынскі» і «цотны» дзень тыдня, якому ў сучаснай сістэме адліку часу адпавядае цотны лік чатыры (два разы па два). Так чацвер стаў лічыцца найбольш спрыяльным днём для шматлікіх доўгатэрміновых перспектыўных пачынанняў, напрыклад, для пачатку будаўніцтва новай хаты, для ўдалага сватаўства або заручын, правядзення зажынак і іншых спраў на перспектыву.

◈ Нездарма ў народзе і сёння жыве старадаўні абрадавы дыялог:

— Калі жаніцца будзеш?

— Пасля дожджычка ў чацвер!

◈ Але было адно выключэнне. Калі жаніх нарадзіўся ў чацвер, то ў сваты ішлі ў аўторак.

◈ Акрамя гэтага, абавязкова суадносілі дзень сватаўства са станам месяца — перспектыўная справа павінна пачынацца тады, калі «месяц на небе расце», гэта значыць, у сваты ішлі на маладзіковую фазу.

◈ У сваты маглі ісці бацькі маладога, яго старэйшы родны брат, сябры, так званая дружына маладога, хросныя бацькі, якіх далей і будуць зваць сватамі. Гэта залежала ад традыцый мясцовасці.

◈ Аднак амаль што паўсюдна адной з галоўных фігур у падзеях і абрадах перадшлюбнага перыяду, а таксама ў рытуале самога вяселля заўсёды з'яўляўся сват. Звычайна гэта быў хросны бацька жаніха. Але, калі з некаторых прычын хросны бацька не мог выконваць функцыі свата (пахаваў жонку, развёўся, а можа, увогуле не стварыў сваю сям'ю), то сватам абіралі мужчыну, старэйшага за 40 гадоў, які павінен быў абавязкова мець жонку і дзяцей, валодаць пэўным грамадскім аўтарытэтам, мець здольнасць кіраваць ходам падзей і падтрымліваць неабходны рытм святочнага абраду.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ПАКАШТУЙЦЕ!

Мясныя аладкі на скорую руку

Спатрэбіцца: *фарш мясны — 400 г, кефір — 0,5 л, яйкі курыныя — 2 шт., сода — на кончыку нажа, мука — 1 шклянка, соль, цукар — на смак.*



У кефір дабавіць яйкі і соду на кончыку нажа. Змяшаць венцам. Усыпаць муку, каб цеста атрымалася як густая смятана. Дабавіць прыкладна адну сталовую лыжку цукру і ў тры пальцы солі. У гатовае цеста пакласці фарш. Усё зноў змяшаць і пячы на сярэднім агні ў выглядзе маленькіх аладак.

Запечаная скумбрыя

Спатрэбіцца: *скумбрыя — 2 шт., сыр цвёрды — 50 г, смятана — 1 ст. л., лімон — 0,5 шт., цыбуля рэпчатая — 1 шт., соль, прыправа для рыбы, зеляніна кропу і пятрушкі.*

Рыбу мыем, выдаляем галаву і вантробы. Тушкі націраем соллю і прыправай для рыбы ўнутры і звонку. Адпраўляем у халаднаватае месца марынавацца на 20-30 хвілін. Пакуль рыбка марынуецца, падрыхтуем начынку. Здрабняем зеляніну, сыр надзіраем на буйной тарцы. Дабаўляем лыжку смятаны і змешваем. Потым наразаем рыбку на парцыённыя кавалачкі, не праразаючы цалкам. У атрыманыя надрэзы ўкладваем тоненькія паўколы цыбулі і лімона. У брушка рыбы закладваем прыгатаваную начынку. Па жаданні зверху рыбку можна абмазаць смятанай і пасыпаць прыправай. Кладзём яе на бляху ці ў форму і запякаем у разагрэтай да 200 градусаў духоўцы прыкладна 25 хвілін да прыгожага залацістага колеру.

РАПТАМ СПАТРЭБІЦЦА

- Нявыкарыстаны чайны пакецік выдатна ліквідуе ўсе непрыемныя пахі. Пакладзіце яго ў халадзільнік, у скрынку, слоік, шафку...
- Вывесці плямы на вопратцы можна з дапамогай перакісу вадароду. Вядома, рэчы павінны быць светлымі, бо ён валодае ўласцівасцю абясколервання.
- Карыца — забойны сродак для мурашак. Пасыпце карыцай праблемныя зоны — шчыліны ў падлозе і іншыя месцы, якія больш за ўсё любяць гэтыя нежаданыя госці. Яны знікнуць!

ЗАКОНЫ СТЫЛЮ

40 +

Кожны ўзрост нясе з сабой нейкія змены. Яны маюць істотны ўплыў на знешні выгляд. Ніхто не зможа паспрачацца з тым, што ў любым узросце і з любой камплекцыяй жанчына хоча выглядаць стыльна, элегантна і ідэальна.

Галоўнае ў выбары адзення для жанчын за 40 гадоў — гэта поўная адмова ад моладзевага стылю: стразы на джынсах, маечкі з адкрытым жыватом і г.д. У гэтых рэчах вы будзеце выглядаць проста недарэчна і смешна. Вядома ж, не варта ўпадаць у іншую крайнасць — бясформенныя балахоны. Такая вопратка нікога і ніколі не ўпрыгожвала.

Адзенне павінна быць прыемных цёплых тонаў, без багацця рушаў і валанаў, якое выгадна падкрэсліць прыгажосць грудзей, стройнасць ног і асіную талію. Не варта апранаць сукенкі і спадніцы даўжынёю значна вышэй калена — такі элемент вобразу можа паказаць вас не ў выгадным святле. Памятайце пра аксесуары: шалік, брошкі, нітка жэмчугу — яны вельмі асвяжаюць вобраз.

Законы моды змяніліся і ў падборы сумачкі. Зараз для выбару асноўнага жаночага аксесуара не так важна абапірацца на колер абутку. Але дамам бальзакаўскага ўзросту ўжо неабходна адмовіцца ад лакіраваных сумак.

Пры выбары абутку не абмінайце ўвагай туфлі на абцасе. Можаце смела выбіраць як на шпільцы, так і на ўстойлівым абцасе. Калі ў вас вялікі памер, звярніце ўвагу на мадэлі з акругленым носікам. А жанчынам невысокага росту варта асцярожна падбіраць абутак з высокім абцасам, бо вышыня 8 см і больш можа выклікаць сутуласць.

Упрыгажэнне таксама вельмі важны элемент вобразу. Сучасная мода раіць дамам 40- гадовага ўзросту звярнуць увагу на эксклюзіўныя ювелірныя ўпрыгажэнні. Але ва ўсім павінна захоўвацца мера, перабор ва ўпрыгажэнні можа стварыць эфект навагодняй ёлкі.

Таксама неабходна перагледзець сваю касметычку. У макіяжы цяпер неабходна праяўляць стрыманасць, а яна ў сваю чаргу будзе праяўляць элегантнасць. Можаце адразу выкласці з касметычкі памады і бляскі яркіх адценняў і замяніць іх на пастэльныя. Гэтае ж зрабіць і з румянымі, іх місія заключаецца ў тым, каб асвяжаць твар. Варта адмовіцца ад сіняга і зялёнага колераў ценяў, каляровых тушаў.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	4.39	21.46	17.07
Віцебск	4.20	21.44	17.24
Магілёў	4.29	21.36	17.07
Гомель	4.35	21.23	16.48
Гродна	4.56	21.59	17.03
Брэст	5.06	21.50	16.44

Месяц

Першая квадра 24 чэрвеня. Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Імяніны

Пр. *Аляксандра, Георгія, Мікалая, Мсціслава.*
К. *Марыі, Тэрэзы, Кірылы, Уладзіміра, Уладзіслава.*

Фота Алены ДАРАШКЕВІЧ.

ЗАЎТРА



...у суседзяў

ВАРШАВА	+19..+21°С	КІЕЎ	+18..+20°С	РЫГА	+18..+20°С
ВІЛЬНЮС	+19..+21°С	МАСКВА	+15..+17°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	+17..+19°С

УСМІХНЕМСЯ

1. Вырашаеш заняцца спортам, каб пахудзець.
2. Заводзіш будзільнік на 6 раніцы.
3. Звіняць будзільнік.
4. Не такі ты ўжо і тоўсты.

— Ганна, мы жанаты з табой першы дзень, а ты ўжо сварышся!
— Але я ж чакала гэтага дня два гады!

Мая любімая страва — макароны з сырам, таму што яе назва ўключае ў сябе і рэцэпт, і спіс інгрэдыентаў.

— Тата, мама сказала, каб ты хадзіў сёння па доме ў шкарпэтках.
— Чаму?
— Яна згубіла чатыры іголкі і хоча, каб ты іх знайшоў!

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.092. Індэкс 63850. Зак. № 2486.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 26 чэрвеня 2015 года.